Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 лістапада 2010 г.
СУБОТА
№ 233 (26841)
Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АД ЗАХАВАННЯ — ДА ПРЫМНАЖЭННЯ!

ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА
кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі

Дарагія суайчыннікі!

19 снежня нам трэба будзе прыняць адказнае рашэнне. Неабходна не проста вызначыцца з імем Прэзідэнта. Мы будзем выбіраць далейшы шлях развіцця краіны, будучыню сваю, сваёй сям'і, родных і блізкіх, нашай Беларусі!

Я іду на гэтыя выбары з цвёрдай верай у паспяховую будучыню роднай Айчыны. Нам шмат чаго ўдалося стварыць за апошнія гады. Мы пераадолелі нямала праблем і набылі бясцэнны вопыт.

Цяпер той час, калі трэба імкліва рухацца наперад і дасягнуць большага. Перакананы: гэта нам пад сілу.

На выбраным шляху мы былі рэалістамі: не будавалі «паветраных замкаў», не здраджвалі сваім прынцыпам! Мы рабілі цяжкую, але патрэбную для дзяржавы работу РАЗАМ!

ШТО МЫ ЗРАБІЛІ

ПАБУДАВАЛІ СВАЮ ДЗЯРЖАВУ — незалежную краіну, у якой жывуць годныя і разумныя людзі. Па ўзроўні развіцця чалавечага патэнцыялу Беларусь заняла 61-е месца сярод амаль дзвюх соцень краін свету.

Для маладой суверэннай дзяржавы, якой не споўнілася і дваццаці гадоў, — гэта пачэснае месца!

АБАРАНІЛІ КРАІНУ АД РАБАВАННЯ. Тое, што было створана ўсім народам, застаецца ў яго руках. Усё, што зарабляецца, — укладваецца ва ўласную эканоміку, а не вывозіцца за мяжу.

ВЫСТАЯЛІ Ў СУСВЕТНЫМ КРЫЗІСЕ. Нават у найбагацейшых краінах свету глабальны крызіс выклікаў рэзкі абвал эканомік. У Беларусі ж эканоміка працягвае расці, што прызнаюць і міжнародныя фінансавыя арганізацыі. За апошнія пяць гадоў у краіне пабудавана і мадэрнізавана больш за 500 прадпрыемстваў.

Галоўнае — мы зрабілі ўсё, каб нашы людзі як мага менш адчулі на сабе крызісны цяжар і нягоды.

ВЫРАТАВАЛІ ВЁСКУ І ЗАБЯСПЕЧЫЛІ ХАРЧОВУЮ БЯСПЕКУ КРАІНЫ. Беларусь не толькі есць свой хлеб, але яшчэ і пачала атрымліваць мільярды долараў ад экспарту прадуктаў харчавання.

РАЗНЯВОЛІЛІ ДЗЕЛАВУЮ ІНІЦЫЯТЫВУ. Па спрашчэнні вядзення бізнэсу Беларусь увайшла ў чацвёрку лепшых рэфарматараў у свеце.

ЗАБЯСПЕЧЫЛІ ПОЎНУЮ ЗАНЯТАСЦЬ. Узровень беспрацоўя ў Беларусі адзін з самых нізкіх у свеце — менш як адзін працэнт. Нават у цяжкі крызісны час у нас людзі не былі выкінуты на вуліцу.

ПАБУДАВАЛІ ДЗЯСЯТКІ МІЛЬЁНАЎ КВАДРАТНЫХ МЕТРАЎ ЖЫЛЛЯ. Сотні тысяч беларускіх сем'яў усяліліся ў добраўпарадкаваныя дамы і кватэры.

ЗРАБІЛІ РАШУЧЫ КРОК НАПЕРАД У МЕДЫЦЫНЕ І АДУКАЦЫІ. У нас самыя нізкія сярод краін СНД паказчыкі дзіцячай і мацярынскай смяротнасці. Нашы ўрачы авалодалі найбольш сучаснымі метадамі прафілактыкі і лячэння захворванняў. Паводле ацэнкі экспертаў, Беларусь у сферы адукацыі займае прэстыжнае 23-е месца ў свеце.

СТАЛІ ЖЫЦЬ ЛЕПШ. Доля малазабяспечаных грамадзян у параўнанні з 1995 годам зменшылася ў сем разоў. Кожны, хто хоча працаваць, — мае работу. А тым, хто мае патрэбу, дапамагае дзяржава. Сацыяльная справядлівасць існуе не на словах, а на справе. У Беларусі няма ні жабракоў, ні алігархаў.

Словам, мы не толькі зберагліі завешчаную нам продкамі зямлю, але і стварылі магутны задзел для выхаду на якасна новую ступень развіцця.

Упэўнены — **РАЗАМ МЫ ЗДОЛЬНЫЯ НА БОЛЬШАЕ!**

ШТО МЫ ЗРОБІМ

Працягнем будаўніцтва незалежнай, самабытнай Беларусі. Мы не выбіраем паміж Усходам і Захадам і не маем намеру быць чыім-небудзь прыдаткам. У Беларусі сваё годнае месца ў Еўропе і свеце.

Да 2015 года ўзровень жыцця ў Беларусі наблізіцца да еўрапейскага.

Галоўнай каштоўнасцю ў маёй палітыцы заўсёды быў і застаецца чалавек. «Дзяржава для народа» — гэта не прыдуманы лозунг, а фундаментальны прынцып, ад якога мы ніколі не адступім.

Беларусь павінна ўвайсці ў лік першых 50 краін свету з найвышэйшым індэксам развіцця чалавечага патэнцыялу.

НАШЫ ГАЛОЎНЫЯ МЭТЫ

УМАЦАВАЦЬ НАЦЫЮ — дзяцей павінна быць больш. Кожная сям'я, дзе ёсць чацвёра і больш дзяцей, за кошт дзяржавы атрымае кватэру. Сем'ям з трыма дзецьмі будзе кампенсавана 75 працэнтаў кошту жылля. Мець шмат дзяцей стане прэстыжна.

СТАЦЬ БАГАЦЕЙ. Чым багацейшы чалавек — тым багацейшая краіна. За кошт росту эканомікі будуць забяспечаны пастаянны рост заработнай платы, пенсій, стыпендый, іх поўная і своечасовая выплата.

Атрымае развіццё прыватная ўласнасць.

Праз дабрабыт кожнага мы прыйдзем да дабрабыту ўсіх.

УЗМАЦНІЦЬ САЦЫЯЛЬНУЮ АБАРОНУ. Кожнаму будзе гарантавана рабочае месца. Дзяржава дапаможа ўсім, хто мае патрэбу ў дапамозе. Абсалютную большасць дзіцячых дамоў заменяць апякунскія сем'і і дамы сямейнага тыпу. Будзе створана цывілізаваная сістэма сацыяльнага абслугоўвання пажылых людзей, асабліва адзінокіх.

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СУСВЕТНЫ ЎЗРОВЕНЬ МЕДЫЦЫНСКАГА АБСЛУГОЎВАННЯ. За два бліжэйшыя гады мы завершым аснашчэнне самым сучасным абсталяваннем усіх лячэбных устаноў. Зможам адмовіцца ад імпарту медыцынскіх паслуг. Усе паліклінікі і бальніцы ў краіне будуць поўнасцю ўкамплектаваны спецыялістамі, чэргі адыдуць у мінулае.

БУДАВАЦЬ 10 МІЛЬЁНАЎ КВАДРАТНЫХ МЕТРАЎ ЖЫЛЛЯ ЗА ГОД. Да канца пяцігодкі на кожнага жыхара Беларусі будзе прыпадаць не менш за 28 квадратных метраў жылля.

Узровень даходаў павінен даваць магчымасць сем'ям набыць уласнае жыллё ў сярэднім на працягу пяці гадоў.

УМАЦАВАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ВАЛЮТУ. Будуць забяспечаны стабільнасць курсу беларускага рубля, абсалютная захаванасць прыватных укладаў, даступнасць банкаўскага крэдыту.

СТВАРЫЦЬ НОВАЕ АБЛІЧЧА БЕЛАРУСКАЙ ЭКАНОМІКІ. На працягу бліжэйшых пяці гадоў у краіне будзе рэалізавана не менш як 100 магутных інвестыцыйных праектаў. З'явяцца новыя галіны: касмічная, нана- і біятэхналогіі, альтэрнатыўная энергетыка і іншыя. Гэта новыя вытворчасці, новыя тэхналогіі, новыя рабочыя месцы, запатрабаваныя на рынку працы, рост экспарту.

Сельская гаспадарка стане прыбытковым аграбізнэсам. Экспарт прадуктаў харчавання будзе павялічаны больш як у два разы — да 7 мільярдаў долараў у год.

ДАЦЬ ПОЎНУЮ СВАБОДУ ІНІЦЫЯТЫВЕ. Мы пяройдзем ад эканомікі дырэктыў да эканомікі ініцыятыў. Будзе абаронена права кіраўніка на дзелавую рызыку. Павысіцца роля прадпрымальніцтва.

Знізім падаткі. Радыкальна спросцім справаздачнасць і адміністрацыйныя працэдуры.

Беларусь павінна быць у трыццатцы краін з найбольш спрыяльным бізнэс-кліматам.

У краіне будзе ўкаранёны прынцып — **дазволена ўсё, што прама не забаронена**.

ЗРАБІЦЬ ПРАРЫЎ У ІНФАРМАТЫЗАЦЫІ. Інфармацыйныя тэхналогіі ахопяць усе сферы дзейнасці. У нас з'явіцца паўнацэнны электронны ўрад. Усе базавыя паслугі (ад рэгістрацыі аўтамабіля да аплаты рахункаў) можна будзе ажыццяўляць праз інтэрнэт. Мы пазбавім чалавека ад хаджэння па кабінетах, бюракратызму і валакіты.

Інтэрнэт па якасці і цане будзе ўраўнаваны з развітымі краінамі.

УЗМАЦНІЦЬ РОЛЮ МОЛАДЗІ. Пашырым магчымасці для раскрыцця патэнцыялу маладога пакалення, якое будзе прыцягнута да вырашэння ўсіх важных дзяржаўных і грамадскіх спраў. Створым новыя стымулы для рэалізацыі яго ініцыятыў і кар'ернага росту. Умацуем моладдзю кіруючы кадравы корпус дзяржапарату і прадпрыемстваў.

УДАСКАНАЛЬВАЦЬ ДЗЕЙНАСЦЬ УЛАДЫ. Гарантавана адкрытасць дзяржаўных органаў для людзей і грамадзянскіх ініцыятыў. Узмоцніцца роля грамадскіх аб'яднанняў і мясцовага самакіравання ў жыццядзейнасці дзяржавы. Будзе забяспечаны паўнацэнны спаборніцкі судовы працэс, сфарміраваны суд прысяжных і завершана работа па гуманізацыі заканадаўства. Мы працягнем бязлітасную барацьбу з карупцыяй і прычынамі, якія спараджаюць яе.

ЗБЕРАГЧЫ МІР І ЗГОДУ Ў ГРАМАДСТВЕ. Беларусь была і будзе дзяржавай, дзе камфортна і бяспечна жыць усім людзям, незалежна ад нацыянальнасці, поглядаў і рэлігіі. Мы не дапусцім разгулу крыміналу, сацыяльнага разладу і канфліктаў.

Дарагія выбаршчыкі!

Мы абавязкова ўсё гэта зробім! Але помніце: зробім толькі дзякуючы нашай працы і ўпартасці, паколькі ніхто, нічога і ніколі нам не дасць.

У нас з вамі ёсць вопыт. Краіне не патрэбны эксперыменты. Нам нельга спыняцца, не завяршыўшы работу. Трэба ісці далей.

Напярэдадні выбараў прашу вас толькі аб адным: не мяркуйце па словах — мяркуйце па справах!

Мы павінны захаваць родную Беларусь духоўна здаровай, эканамічна магутнай, экалагічна чыстай, стабільнай і мірнай. Каб усе маглі сказаць: «Беларусь — краіна, у якой хочацца жыць».

Сёння ад пазіцыі кожнага з нас залежыць лёс Айчыны. Яна ў нашых руках.

РАЗАМ МЫ ДАСЯГНЁМ СВАІХ МЭТ!

РАЗАМ МЫ — БЕЛАРУСЬ!

З павагай, Ваш Аляксандр Лукашэнка

Аляксандр ЛУКАШЭНКА

Беларускія СМІ будуць ісці па шляху ўзбуйнення

Аб гэтым паведаміў учора ў Салігорску на сустрэчы з прадстаўнікамі мясцовых СМІ міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Паводле слоў міністра, у гэтым годзе многія рэгіянальныя СМІ выйшлі на новы ўзровень. «Гэта вельмі важна, паколькі мінулы год быў дастаткова няпросты, асабліва для друкаваных СМІ, але ў Беларусі не ўпалі тыражы газет, у той час як у іншых краінах яны знізіліся. Можна з упэўненасцю сказаць, што мы чытаючая нацыя», — падкрэсліў Алег Праляскоўскі.

Дзве трэці раённых газет перайшлі на самафінансаванне. Разам з тым гэта не з'яўляецца мэтай, дзяржава павінна гарантаваць даступнасць інфармацыі, адзначыў міністр. «Самафінансаванне — гэта не значыць, што газета, якая складаецца з чатырох старонак, на дзвюх друкуе праграму і рэкламу. Гэтага не павінна быць. Галоўнае — гэта чытач, які выпісвае газету для таго, каб атрымліваць інфармацыю», — упэўнены Алег Праляскоўскі.

Закранаючы пытанне аб тым, ці заменіць інтэрнэт друкаваныя СМІ, Алег Праляскоўскі сказаў, што ў бліжэйшым будучым такога не адбудзецца, аднак газета і яе сайт павінны быць адзіным цэлым і жыць адным жыццём.

«Інтэрнэт дыктуе сваю тэндэнцыю, і інтэрнэт-версія арыентавана больш на моладзь, у той час як друкаваная версія газеты — на больш сталых людзей», — адзначыў міністр, дадаўшы, што на сайтах павінна быць больш аператыўнай інфармацыі, а на паперы — «больш буйныя журналісцкія форумы».

На прэзідэнцкіх выбарах ФПБ падтрымае Аляксандра Лукашэнку

На выбарах Прэзідэнта Беларусі 19 снежня 2010 года Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі падтрымае дзеючага кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнку. Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-цэнтры федэрацыі, такое рашэнне аднагалосна было прынята на пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета ФПБ.

Старшыня Прэзідыума ФПБ Леанід Козік, выступаючы на пасяджэнні, адзначыў, што членаў прафсаюзаў, якія ўваходзяць у ФПБ, — больш як 4 млн чалавек, гэта 95 працэнтаў эканамічна актыўнага насельніцтва краіны. «Федэрацыя прафсаюзаў прадстаўляе тых, хто працуе, хто сваімі рукамі будуе будучыню Беларусі. За нашымі спінамі працоўныя калектывы, і мы нясём адказнасць за іх дабрабыт, стабільнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Менавіта таму наш выбар відавочны — гэта дзеючы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка», — сказаў Леанід Козік.

Юбілей Уладзіміра Караткевіча з'яўляецца важнай падзеяй для ўсяго беларускага народа

Пра гэта заявіў учора міністр культуры Беларусі Павел Латушка ў Оршы на цырымоніі спецыяльнага гашэння паштовага канверта і арыгінальнай маркі штэмпелем першага дня, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Уладзімір Караткевіч унёс неацэнны ўклад у развіццё беларускай літаратуры і культуры. «Менавіта ён у другой палове XX стагоддзя ярка падкрэсліў, што Беларусь мае свае глыбокія карані, багатую гісторыю, права на ўласную дзяржаву. І сёння мы бачым незалежную краіну, пра якую марыў пісьменнік», — падкрэсліў Павел Латушка. Права зрабіць першы адбітак штэмпелем першага дня ўдастоілася пляменніца Уладзіміра Караткевіча Алена Сінькевіч.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«У Беларусі будуць стварацца зручныя ўмовы работы рэзідэнтаў СЭЗ»

Аб гэтым заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ўчора па выніках наведвання СЭЗ «Мінск», перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, яркім прыкладам эфектыўнага імпартазамяшчэння з'яўляецца дзейнасць беларуска-шведскага сумеснага прадпрыемства «Бако Бісаў», якое з'яўляецца рэзідэнтам СЭЗ «Мінск». Яно зарэгістравана ў снежні 2006 года, заснавальнікамі з'яўляюцца шведская кампанія «Бако Бісаў Свенска Эй Бі» (98 працэнтаў) і беларускае ЗП «Бако інструменты» (2 працэнты).

Сумеснае прадпрыемства рэалізуе на тэрыторыі свабоднай эканамічнай зоны «Мінск» інвестыцыйны праект «Будаўніцтва завода па вытворчасці біметалічных стужачных піл».

СП «Бако Бісаў» мае ўнікальную тэхналогію і абсталяванне для вытворчасці біметалічных стужачных піл, аналагаў якім няма ў краінах СНД. Дзякуючы высокай якасці, вырабляемая прадукцыя мае пастаянны попыт, яе выкарыстоўваюць у 130 краінах свету. Гэта экспартаарыентаванае СП з'яўляецца высокатэхналагічным і інавацыйным.

Аляксандр Лукашэнка высока ацаніў дзейнасць СП «Бако Бісаў» свабоднай эканамічнай зоны «Мінск».

«З улікам таго, што ў Беларусі праводзяцца вялікія аб'ёмы лесанарыхтовак, неабходна падумаць аб вытворчасці бензапіл у краіне», — сказаў Прэзідэнт. Цяпер на беларускім рынку прысутнічаюць толькі імпартныя бензапілы, у прыватнасці, японскай, шведскай, германскай вытворчасці.

«І такіх тавараў, якія мы ў вялікіх аб'ёмах купляем за мяжой, нямала», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, у Беларусі неабходна ствараць больш імпартазамяшчальных вытворчасцяў.

Беларусь, Венесуэла і Азербайджан у бліжэйшы час створаць лагістычную кампанію па перавалцы грузаў, заявіў Прэзідэнт Беларусі. «У бліжэйшы час мы створым такую кампанію па перавалцы нафты і іншых грузаў».

Аляксандр Лукашэнка наведаў прадпрыемства «АлюмінТэхна», якое працуе ў свабоднай эканамічнай зоне «Мінск». Прадпрыемства актыўна супрацоўнічае з Венесуэлай і мае планы па развіцці там вытворчасці. Заснавальнікам прадпрыемства з'яўляецца кіпрская кампанія. СТАА «АлюмінТэхна» рэалізуе на тэрыторыі СЭЗ «Мінск» інвестыцыйны праект па вытворчасці прасаваных алюмініевых профіляў. У Беларусі няма прадпрыемстваў, якія вырабляюць такую прадукцыю.

Аляксандр Лукашэнка пабываў і на прадпрыемстве «Алютэх Інкарпарэйтэд», заснавальнікам якога таксама з'яўляецца кіпрская кампанія.

Кіраўніку дзяржавы была прадстаўлена выстаўка прадукцыі, якую вырабляюць і на іншых прадпрыемствах-рэзідэнтах СЭЗ «Мінск». У прыватнасці, кампаніі «Асамедыка», якая з'яўляецца першым вытворцам ультрагукавых апаратаў у Беларусі, а таксама выпускае іншае медыцынскае абсталяванне.

У Беларусі будуць стварацца зручныя ўмовы работы рэзідэнтаў свабодных эканамічных зон. «Мы не павінны стрымліваць рэгістрацыю суб'ектаў гаспадарання свабодных эканамічных зон. СЭЗ не толькі быць, але і развівацца», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Як далажыў Прэзідэнту віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў, свабодныя эканамічныя зоны пачалі стварацца ў Беларусі з 1996 года, у 2002-м яны ўжо існавалі ў кожнай вобласці краіны. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што пры стварэнні СЭЗ у Беларусі арыентаваліся на вопыт у гэтай сферы Кітая.

Андрэй Кабякоў расказаў, што ў сувязі са стварэннем Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана існавала нявызначанасць па далейшай рабоце суб'ектаў гаспадарання СЭЗ. Аднак у выніку перагавораў з партнёрамі была дасягнута дамоўленасць да 1 студзеня 2017 года захаваць дзейнасць свабодных эканамічных зон, гарантаваўшы ім у гэты перыяд ранейшыя ўмовы работы.

Прэзідэнт асабліва акцэнтаваў увагу на тым, што і пасля 2017 года неабходна знайсці магчымасць стварэння выгадных умоў работы ў Беларусі. «2017 год яшчэ далёка, можа, мы зможам замясціць іншымі падатковымі льготамі тыя мытныя прэферэнцыі, якія адыдуць у 2017 годзе, гэта значыць аб'ём страт мы можам кампенсаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Можа скласціся сітуацыя, што ўся Беларусь стане свабоднай эканамічнай зонай па ўмовах вядзення бізнэсу», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт цікавіўся, ці правільна ў свой час было прынята рашэнне аб стварэнні ў кожнай вобласці і Мінску свабодных эканамічных зон. Андрэй Кабякоў пацвердзіў, што гэта было правільнае рашэнне. Колькасць кампаній — рэзідэнтаў СЭЗ кожны год расце. Цяпер існуе праблема недахопу свабодных тэрыторый для новых кампаній-рэзідэнтаў. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пытанняў з тэрыторыяй у будучым быць не павінна. У той жа час ён папярэдзіў, што падыходзіць да гэтага пытання неабходна па-гаспадарску, не закранаючы землі, прыдатныя для сельскай гаспадаркі.

«Я доўга вагаўся: патрэбны, не патрэбны нам свабодныя эканамічныя зоны. Але гэта як узор, і да гэтага прыкладу мы павінны прывесці ўсе прадпрыемствы ў краіне», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Беларусь мае вялікі патэнцыял развіцця лагістычнай сферы. Такую думку выказаў прадстаўнік іранскай кампаніі «Кейсан» Сіямак Махінрад, расказваючы Прэзідэнту Беларусі аб будаўніцтве лагістычнага цэнтра «Прылессе» ў СЭЗ «Мінск».

Лагістычны цэнтр «Прылессе» праектаваны на ўчастку плошчай каля 100 га на перасячэнні аўтамабільных дарог Берлін—Масква і Мінск—Магілёў. Комплекс будуецца паблізу Мінскай кальцавой дарогі і Нацыянальнага аэрапорта Мінск-2.

Канцэпцыя стварэння гэтага цэнтра распрацоўвалася сумесна з вядучымі германскімі спецыялістамі для аказання поўнага спектра лагістычных паслуг.

Аляксандр Лукашэнка пазітыўна ацаніў стварэнне гэтага важнага для краіны цэнтра і прапанаваў іранскай кампаніі будаваць у Беларусі і іншыя лагістычныя цэнтры.

Кватэрнае пытанне

ДЗЕ ДВОЕ, ТАМ І ТРОЕ?

Мы, бацькі (я пенсіянерка па ўзросце, муж — інвалід II групы па агульным захворванні) жывём з сынам, яго жонкай і двума ўнукамі ў двухпакаёвай кватэры, у цеснаце, што вельмі цяжка... Сын стаіць на кватэрным уліку, плануе палепшыць жыллёвыя ўмовы сваёй сям'і з выкарыстаннем ільготнага крэдыту. Ці можна паскорыць яго атрыманне?

Валянціна С. *г. Мінск.*

Грамадзянам, якія стаяць на ўліку з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы жыхарства, ільготныя крэдыты выдаюцца пасля ўключэння іх у спісы (у парадку чарговасці, зыходзячы з часу пастаноўку на ўлік), якія зацвярджаюцца раённымі, гарадскімі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Па-за чаргой, у адпаведнасці з падпунктам 1.10 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 г. № 185, у названыя спісы могуць быць уключаны асобныя льготныя катэгорыі грамадзян (інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, інваліды з дзяцінства I і II групы, дзеці-сіроты, хворыя на актыўную форму туберкулёзу, шматдзетныя сем'і, у якіх гадуецца трое і болей дзяцей...).

Таму пры нараджэнні яшчэ аднаго малога сям'я сына будзе мець права пазачарговага ільготнага крэдытавання і вырашэння жыллёвай праблемы на працягу года пасля прадстаўлення адпаведных дакументаў.

Што датычыцца пенсіянераў (асоб, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту (жанчыны — 55 гадоў, мужчыны — 60 гадоў) і інвалідаў I і II групы з прычыны агульнага захворвання, то яны, згодна з падпунктам 62.9.1 і 62.9.3 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзялення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565), у вызначаным парадку маюць права на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання. Праўда, з улікам чарговасці.

Віктар САВІЦКІ.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.11.2010 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ
▲1 долар ЗША.....3 032,00	1 чэшская крона.....161,79	USD.....31,3539
▼1 еўра.....4 028,62	1 польскі злоты.....995,57	10 UAH.....39,3868
1 латвійскі лат.....5 655,66	▼1 расійскі рубель.....96,70	1000 BYR....10,3410
1 літоўскі літ.....1 161,57	1 украінская грыўня.....380,71	EUR.....41,6192

Агенцтва Уладзіміра Гаўцова

Парламенцкі дзённік

ДОМ ПАБУДУЕМ — ШТО НАМ КАШТУЕ?

Аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва і магчымасці яго крэдытавання абмеркавалі заканадаўцы з кіраўніцтвам Урада

Жыллё трывала трымаецца на першым месцы ў іерархіі патрэбаў ці не кожнага беларуса. Аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва абмяркоўвалі днямі ў парламенце падчас чарговай сустрэчы з урадавым кіраўніцтвам.

Па забяспечанасці насельніцтва жыллём Беларусь — сярод лідараў на прасторы СНД, адзначае **віцэ-прэм'ер Віктар БУРА**. Паводле яго звестак, на аднаго жыхара ў нас прыпадае 23,6 кв. м агульнай плошчы. Мне, насельніцы дзевяціметровай каморкі, як пагляджу, да серадняка далёка: нават з усімі падсобнымі памяшканнямі ў маім распараджэнні 15,1 метра квадратнага, што аднак не дазваляе мне займець патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Але ж, па ўсім відаць, тэндэнцыяй такое становішча спраў не назавеш.

Са студзеня па кастрычнік сёлета справілі навасэлле жыхары 65,3 тысячы кватэр. У эксплуатацыю ўведзена звыш 5 млн кв. м жылля. І большая частка (прыблізна 65 адсоткаў) — для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. А план на наступную пяцігодку дык і ўвогуле прадугледжвае да 2015 года павялічыць аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва да 9,5-10 млн кв. м за год.

Ключавое пытанне, як заўжды, — адкуль грошы браць будзем? З такім сярэднім заробкам, як у нас цяпер, — пазычаць, натуральна. Вось толькі на якіх умовах? Крэдытная палітыка пераглядаецца. Так, напрыклад, стаўкі па льготных пазыках для жыхароў малых гарадоў мяркуецца зменшыць у пяць разоў — да аднаго адсотка гадавых. Прычым тэрмін пагашэння расцягнуць удвая — да 40 гадоў — у населеных пунктах, дзе пражывае да 50 тыс. чалавек. Прыемнае выключэнне зробяць таксама жыхарам Кобрына, Рэчыцы, Светлагорска і Слуцка.

Істотна змяніла б сітуацыю на рынку іпатэка — пры ўмове яе рэальнага функцыянавання, зразумела. А поруч з ёю яшчэ і сістэма жыллёвых будаўнічых зберажэнняў (калі грошы на кватэру можна збіраць не ў скарбонку, а на спецыяльным банкаўскім рахунку ды яшчэ і атрымліваць нейкія бонусы — жыллёвыя прэміі). Адпаведны законапраект павінен паступіць у парламент да канца года. У час яго падрыхтоўкі парламентарыі выказвалі заклапочанасць тым, што праект дакумента не забяспечвае належнага рэгулявання адносін па назапашванні грашовых сродкаў грамадзянамі і не прадугледжвае жыллёвых прэмій для ўдзельнікаў сістэмы зберажэнняў. Профільная камісія палаты прадстаўнікоў — па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі — на чале з Галінай Палянскай выступала за распрацоўку фінансавага закона, які рэгламентаваў бы працэс назапашвання грашовых сродкаў на спецыялізаваных рахунках грамадзян. Так, каб выбар, як менавіта паляпшаць свае жыллёвыя ўмовы па кірунках, вызначаных законапраектам, заставаўся за самімі грамадзянамі. Дэпутаты стаялі на тым, каб закон прадугледжваў жыллёвыя прэміі ў сістэме жыллябудзберажэнняў. Паглядзім, што атрымалася ў распрацоўшчыкаў на выхадзе. Аднак тое, як у Авальнай зале намеснік прэм'ер-міністра Віктар Бура дзякаваў за плённую работу над законапраектам парламентарыям і асабіста спадарыні Палянскай, дае спадзеў, што прапановы народных выбраннікаў усё ж улічаныя. І законапраект аб жыллёвых будаўнічых зберажэннях уключыць рэальныя фінансавыя механізмы.

Немалаважнае жыллёвае пытанне — камунальныя плацяжы. Мы, як вядома, аплачваем іх сумесна з бюджэтам, які бярэ на сябе большую частку. Не варта, праўда, забывацца, што бюджэт зноў жа фарміруем мы — толькі ўжо сумеснымі намаганнямі. Так ці інакш, паводле разлікаў урада, сёлета лепта насельніцтва ў аплаце паслуг ЖКГ складзе чвэрць. Віцэ-прэм'ер акцэнтуе, што доля гэтых выдаткаў у сукупным прыбытку насельніцтва невялікая — 8,1 адсотка. А што будзе далей? Як падкрэслівае намеснік прэм'ер-міністра, палітыка тарыфнага рэгулявання будзе ўзважанай, з улікам росту прыбыткаў насельніцтва. Пакрыццё выдаткаў на паслугі ЖКГ з боку насельніцтва аб'ектыўна павялічыцца, нагрузка ж на бюджэт будзе скарочаная.

Калі жыллё набытае і камунальныя паслугі аплачаныя, паўстае іншае пытанне — як да яго дабрацца? Многія беларусы вырашаюць для сябе гэтую праблему асабістым транспартам. Што ў сваю чаргу спараджае іншыя цяжкасці. Заторы на дарогах, напрыклад. Як з імі змагацца, пацікавіўся ў віцэ-прэм'ера дэпутат Уладзімір ВАСІЛЕНКА. Ён заўважыў такія цяжкасці не толькі ў сталіцы, але ўжо і ў абласных гарадах. Намеснік прэм'ер-міністра запэўніў яго, што сітуацыя не застаецца без увагі. Прадугледжана стварэнне новых пуцеправодаў, пашырэнне вуліц, павелічэнне колькасці парковак і развіццё сістэмы грамадскага транспарту, асабліва ў цэнтральных частках гарадоў. Расказаў ён і пра перспектывы так званых гарадскіх электрычак. Прынцыпова новы для нашай краіны фармат транспартнай паслугі, які адпавядае сусветным стандартам. Першы хуткасны электрацягнік павышанай камфортнасці пусціць па маршруце «Мінск—Ждановічы».

А пасля ўдзельнікі дыскусіі ўзялі яшчэ вышэй — перайшлі да авіязносін. Нацыянальны аэрапорт Мінск (які больш звыкла называць аэрапортам Мінск-2) да 2014 года чакае рэканструкцыя. Там зробяць міжнародны пасажырскі тэрмінал і другую ўзлётна-пасадачную паласу, якая дазволіць прымаць самыя буйныя самалёты. Ды і прыём пасажыраў ёсць замах павялічыць — да 5 млн за год. Пра маштабы рэнавацыі можна меркаваць па суме выдаткаў — 600 млн долараў.

Ашчадны народны выбраннік Генадзь ДАВЫДЗЬКА запытаўся ў віцэ-прэм'ера, нашто нам такая дарагая рэканструкцыя. Рэч у тым, што ўзлётна-пасадачная паласа там, як патлумачыў В. Бура, выйшла за межы эксплуатацыйнага тэрміну. Апошнія гады без закрыцця аэрапорта вяліся работы па рэканструкцыі. Дзякуючы ім тэрмін эксплуатацыі можна падоўжыць на 7-8 гадоў, але пасля ўсё роўна давядзецца рабіць капітальны рамонт паласы. Таму вырашана загадзя пабудаваць другую паласу. У планах таксама транзітны тэрмінал. Новаўвядзенні абумоўленыя тым, што першапачаткова аэрапорт будаваўся для карыстання ўнутры краіны і многія тонкасці міжнародных перавозак там не былі ўлічаныя. Так што рэчаіснасць, як заўжды, вяртае нас з нябёсаў на зямлю і змушае будаваць... не толькі новыя канструкцыі — сваё жыццё ўвогуле.

Ала МАЧАЛАВА.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ і І ПАЎГОДДЗЕ 2011 г.
Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	І квартал	паўгоддзе
63850 (індывідуальны)	12400	37200	74400
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800	69600
63858 (ведамасны)	19900	59700	119400
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000	108000

Заставайцеся з намі!

«Звязда»: За і Супраць

«...Мая — гэта ўжо назаўсёды!»

Як вельмі даўні падпісчык «Звязды» і пастаянны яе чытач (калі-нікалі для параўнання купляю і іншыя газеты) хачу выказаць сваё меркаванне адносна зместу.

Мне, як і многім, вельмі імпануе галоўнае — што «Звязда», можна сказаць, з веку ў век размаўляе са мной, з усімі сваімі чытачамі на іх роднай мове; тое, што яна, як мне здаецца, досыць незалежная — ні за белых, ні за чырвоных; тое, што ў ёй шмат вельмі разнапланавых і досыць цікавых матэрыялаў; тое, што ў рэдакцыі дружны і стабільны калектыў. Я, напрыклад, ужо па прозвішчах ведаю, хто пра што піша, чаго ад каго чакаць. Прыемна, што на старонках з'яўляюцца новыя імёны, што прыходзяць новыя маладыя журналісты. З цікавасцю назіраю, як яны набіраюцца вопыту, адточваюць сваё майстэрства.

Добра і тое, што сваё слова тут могуць сказаць чытачы.

Што не зусім падабаецца? Бываюць нумары, калі на некалькіх старонках распавядаецца пра поспехі асобных прадпрыемстваў. Я разумею, што гэта патрэбна, але чаму б у сённяшнім нумары не расказаць пра адных, праз нумар — пра другіх. Такія матэрыялы патрэбныя і часам цікавыя, але ж, баюся, не шырокаму колу чытачоў.

Альбо вось яшчэ: у асобных артыкулах, у пісьмах падымаюцца вельмі сур'ёзныя пытанні, людзі выказваюцца, гавораць пра набалелае. І што ж далей?

Прыклад? На старонкі газеты вынеслі свае праблемы (і не надуманыя, бо яны сапраўды ёсць!) людзі адной з самых высакародных прафесій — настаўнікі. Думаю, усе чытачы сачылі за гэтымі звяздоўскімі публікацыямі, чакалі, як пракаментуюць іх, бо павінен жа нехта сказаць, як будзе папраўляцца гэтае становішча? І... не дачакаліся. Прынамсі, пакуль. А ведаць жа трэба, бо вельмі ў многім менавіта ад настаўнікаў залежыць тое, якімі вырастуць нашы дзеці.

Моцныя артыкулы былі пра стан роднай мовы, пра п'янства. Бяда ў нас — і з тым, і з гэтым. Нельга яе замоўчваць!

Варта, на маю думку, больш пісаць і пра тое, як жывуць людзі ў іншых краінах...

А вось інфармацыі на тэму, хто што ўкраў, хто каго забіў, хто трапіў у аварыі — можа, і залішне.

Зрэшты, гэта мой, суб'ектыўны погляд. А наогул «Звязда» — газета добрая, мая. І гэта ўжо назаўсёды.

В.І. ПАБЯГАЙЛА, *г. Ляхавічы.*

Дэлегаты Усебеларускага сходу

«У ЖАБІНЦЫ СЁННЯ НЯМА ЧАРГІ НА ТРОХПАКАЁВЫЯ КВАТЭРЫ. А ВОСЬ ПОПЫТ НА АДНА- І ДВУХПАКАЁВЫЯ ПАКУЛЬ ЗАДАВОЛІЦЬ НЕ МОЖАМ»

З дэлегатам чацвёртага Усебеларускага сходу начальнікам Жабінкаўскай ПМК-10 «Брэстаблсельгасбуда» Мікалаем ШПАКОЎСКІМ мы сустрэліся ў перапынку сходу дэлегатаў ад Брэсцкай вобласці, дзе абмяркоўвалі праекты дакументаў і праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на наступныя пяць гадоў.

Калектыў будаўнікоў, які ўзначальвае Мікалай Шпакоўскі, налічвае 320 чалавек. Для самага маленькага раёна краіны гэта даволі вялікая арганізацыя. І аб'ёмы будаўніцтва ў іх даволі значныя.

— Калі краіна шмат будуе, значыць, яна жыве і развіваецца, — гаворыць Мікалай Антонавіч. — Дынаміку развіцця можна прасачыць нават па нашай адносна невялікай арганізацыі. Зараз мы заканчваем будаўніцтва двух 60-кватэрных і двух 50-кватэрных дамоў, будуем пяць дамкоў у вёсцы, таксама ўзводзім фермы для сельгаспрадпрыемстваў, вядзём рэканструкцыю вытворчых памяшканняў цукровага завода. У Жабінцы сёння няма чаргі на трохпакаёвыя кватэры. А вось попыт на адна- і двухпакаёвыя пакуль задаволіць не можам. І гэта задача найперш для праекціроўшчыкаў. З улікам рэалій невялікіх райцэнтраў, малых гарадоў трэба мець тыповыя праекты жылля, так званага «эканомкласа».

Яшчэ кіраўнік будаўнічай арганізацыі заклапочаны праблемай узаемадзеяння будаўнікоў з заказчыкамі, інвестарамі — словам, уласнікамі аб'ектаў, якія ўзводзяцца. Формы і метады такога ўзаемадзеяння даўно вызначаны нарматыўнымі актамі. А вось на справе дакументы далёка не заўсёды дакладна выконваюць сваю ролю. Таму ў працэсе работы не раз бывае, што праекты, дапаможныя камунікацыі трапляюць на будаўнічую пляцоўку несвоечасова. Таму, здараецца, сеткі вядуцца разам з будаўніцтвам, а то і аддзелкай памяшкання. А так быць не павінна. Ад гэтага горшая перш за ўсё якасць жылля, вытворчых памяшканняў.

Год падыходзіць да канца, у ПМК-10 няма адпаведных дакументаў на жылыя дамы, якія будаўнікі маюць намер пачынаць будаваць у наступным годзе. Вось такія хібы ў арганізацыі будаўнічага працэсу трэба выпраўляць у наступнай пяцігодцы, лічыць Мікалай Шпакоўскі.

Хвалюе начальніка ПМК і праблема падрыхтоўкі будаўнічых кадраў, замацавання людзей у малых гарадах. Усё гэта ён мае намер абмеркаваць з калегамі на Усебеларускім форуме.

А на пытанне, што дэлегат Усебеларускага сходу пажадаў бы ўсім беларусам і свайму калектыву, ён адказаў так: «Усім жадаю, каб новабудоўлі — і жыллё, і спартыўныя аб'екты, і вытворчыя памяшканні — прыносілі задавальненне і радасць, а нам — пабудаваць нешта значнае, што зробіць наш горад яшчэ прыгажэйшым. Зараз здалёк бачныя не зусім звычайныя, падобныя на вежы, склады цукровага завода, якія ўзводзілі нашы будаўнікі. Думаю, што нам пад сілу і іншыя цікавыя аб'екты».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Ведай нашых!

ВОЛЬГА СТАЛА ТРЭЦЯЙ

Майстар-кандытар Баранавіцкага хлебазавода Вольга Рамашка вярнулася з міжнароднага конкурсу па кулінарным мастацтве, які праходзіў у Люксембургу, з бронзавым медалём.

Больш за 8000 кухараў і кандытараў з 34 краін свету дэманстравалі сваё майстэрства і ўменне. Нашу краіну прадстаўляла Вольга. Яе торт «Вясельны», чатыры віды пірожных і дэсерты журы ўключыла ў тройку лепшых. Як паведамілі на прадпрыемстве «Брэстхлебпрам», чыім філіялам з'яўляецца Баранавіцкі завод, Вольга Рамашка ўжо не раз забірала Гран-пры на рэспубліканскіх і абласных конкурсах. А цяпер, як бачым, пацвердзіла сваё высокае майстэрства на сусветным узроўні.

Яна СВЕТАВА.

Глыбінка

Васільеўна — краса, доўгая каса

Сучасныя жанчыны вядуць бесперапыннае змаганне са стрэсамі і дрэннай экалогіяй, каб захаваць добрыя валасы. Шампуні для бляску каштуюць значных грошай, вітаміны для ўмацавання валасоў — яшчэ болей. Аднак, як сцвярджае ўладальніца касы ў тры локці з вёскі Рысін Клімавіцкага раёна, добрую касу нельга адваяваць у прыроды — яе можна атрымаць толькі ў спадчыну.

Пяцьдзясят гадоў таму ўвесь калгас ведаў Ліду — маладую працавітую даярку, прыгажуню з блакітнымі вачыма, вяснушкамі і доўгай бялявай касой. Гэтай касе зайздросцілі сяброўкі, на яе заглядаліся кавалеры. Сёння Лідзія Васільеўна Сяргеенка размяняла восьмы дзясятак. Але касу, сваю радавую гордасць, яна захавала.

— Мая бабуля з бацькавага боку мела тоўстую і доўгую касу, — расказвае Лідзія Васільеўна. — У бабулі было 9 сясцёр, але з усіх дзяўчынак у сям'і такія валасы перадаліся ў спадчыну толькі мне. Мая дачка таксама мела бялявую касу, але абрэзала яе на вяселле, каб добра ўкласці вэлюм. Цяпер касу носіць мая ўнучка.

Суседка Валянціна Рыгораўна Шупранава дапамагае сяброўцы расплесці косы, якія Лідзія Васільеўна звычайна закручвае на галаве з дапамогай мноства шпілек. Цяпер, вядома, каса не бялявая, як у юнацтве, але пафарбаваная ў прыемны колер «залацістага арэху». У лепшыя часіны каса дасягала каленяў жанчыны: сёння яе, як у старадаўнія часіны, замяраюць локцямі — іх болей за тры.

— Каса — вялікая каштоўнасць для жанчыны, а ў наш час яшчэ і вялікая рэдкасць, — кажа Шупранава.

Валянціна Рыгораўна расказвае, што яна пасябравала з Лідзіяй Васільеўнай гадоў сорак таму, калі працавала ў краме. Усе, зразумела, адразу звярталі ўвагу на доўгую касу бландзінкі. Гандлярка тады і сама мела доўгія валасы, але з цягам часу пазбавілася касы на карысць модных стрыжкі і завіўкі. А вось у Лідзіі Васільеўны кароткая стрыжка была толькі аднойчы ў школе, калі яна папрасіла суседку пастрыгчы яе нажніцамі. «У выніку я была падобная на стрыжаную авечку, і стала зноў расціць косы, ужо на ўсё жыццё», — узгадвае жанчына.

А зараз — увага! Жанчына, якая мае ў 71 год касу да пояса, расказала пра догляд валасоў.

— З юнацтва я мыла галаву простым мылам, але ў мяккай крынічнай альбо рачной вадзе. Але вада можа быць і жорсткай: у калодзежы яна нейкая мутная, у калонцы — з іржой. Валасы тады зляпляліся, хоць ты рві іх. Тады дачка прывезла мне беларускі шампунь — травяны з крапівой, а таксама і бальзам. Пасля гэтага бальзаму валасы рассыпаюцца па адным. І не трэба мыць валасы часта: я гэта раблю, толькі калі іду ў лазню. А вось расчэсвацца трэба штодня абавязкова.

Вядома таксама, што стан валасоў вызначае ежа чалавека. У Сяргеенкі ўсё проста: што Бог пашле — тое і ем. Бог дасылае вясковай пенсіянерцы бульбу, капусту, мяса, рыбу.

— Ой, калі шчыра, я ніколі ў маладосці і не глядзела на гэтую касу. Часу не было, асабліва калі дзеці малыя. Калі дачка пайшла ў школу, я заплятала ўжо яе касу! Я думаю так: добрыя валасы можна мець дзякуючы прыродзе, бацькам. А не нейкаму асабліва дарагому догляду.

Лідзія Васільеўна сядзіць у пакоі. Тыповы сялянскі інтэр'ер: на ложку «піраміда» вялізных падушак з накідкай з цюлю, на сцяне плюшавы дыванок з аленямі, старадаўнія вясельныя партрэты маладой Лідзіі і яе мужа, бела-чорны кот Васіль прыйшоў паглядзець на гасцей, у трумо адлюстроўваецца гаспадыня ў нацыянальным беларускім строі. Валасы ў жанчыны ляжаць хвалямі, яна чэша іх грэбнем.

— Узгадваю мінулае жыццё, — расказвае Лідзія Васільеўна. — Мы ў калгасе працавалі і ўсё на свеце паспявалі: рабіць, спяваць песні, танцаваць і жыць! Майго гаспадара ўжо няма: Мікалай быў прыгожым хлопцам, хоць якраз яму, дарэчы, мая каса была не вельмі цікавая. Але ж былі ўва мне і іншыя рысы! Каса — гэта добра, але розум яшчэ больш каштоўны.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.

Клімавіцкі раён.

Прамая сувязь

НАД ЧЫМ ПАВІННА ПРАЦАВАЦЬ УЛАДА?

На гэтым тыдні старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра пабываў у трох ВНУ абласнога цэнтра — ГрДУ імя Янкі Купалы, аграрным і медыцынскім універсітэтах, дзе адказаў на пытанні моладзі аб праблемах, якія яе хвалююць, і пацікавіўся меркаваннем студэнцтва: над чым павінна папрацаваць улада. Такія сустрэчы, сказаў кіраўнік вобласці, стануць традыцыйнымі і будуць праходзіць раз у паўгода ў кожным універсітэце.

Першае пытанне ў медуніверсітэце датычылася перспектыў развіцця Гродна ў бліжэйшыя пяць гадоў. Пазіцыя Сямёна Шапіры наступная: горад павінен забудоўвацца так, каб не страціць свой каларыт, самабытнасць, быць утульным для жыцця людзей, нават калі гэта запатрабуе большых капукладанняў па інжынернай інфраструктуры. Трэба клапаціцца пра зоны адпачынку, паркі — не толькі ўладзе, а ўсім жыхарам, так бы мовіць, талакой. Нядаўна, напрыклад, дэпутаты абласнога і гарадскога Саветаў праявілі ініцыятыву навесці ў выхадны дзень парадак у парку «Румлёва» — самі папрацавалі, іх падтрымалі вайскоўцы, эколагі і толькі... два жыхары гэтага мікрараёна.

Згодна з даручэннем кіраўніка дзяржавы, выдаткавана 125 мільярдаў рублёў, каб завяршыць будаўніцтва ў Гродне шэрагу найважнейшых медыцынскіх аб'ектаў — кардыялагічнага цэнтра, дзіцячай абласной бальніцы і станцыі пераліванне крыві. Акрамя таго, будзе завершана рэканструкцыя заапарка, пабудуюць самы буйны ў горадзе гіпермаркет, новы выгляд набудзе прывакзальная плошча (з музеем Гродзенскай чыгункі), прапрацоўваецца ідэя будаўніцтва Палаца гульнявых відаў спорту. Яшчэ адна задача — штогод адчыняць у абласным цэнтры па дзесяць аб'ектаў грамадскага харчавання — кавярняў і рэстаранаў.

Што датычыцца жылля, то сёлета ў цэлым па вобласці яго будзе пабудавана 860 тысяч квадратных метраў, а «планка» наступнага года — 1 мільён 200 тысяч квадратных метраў. Пры гэтым адзін з прыярытэтаў — перасяленне людзей з трухлявага жылля ў добраўпарадкаваныя кватэры.

«А як будзе вырашацца праблема студэнцкіх інтэрнатаў?» — пацікавіліся будучыя медыкі ў старшыні аблвыканкама. Ён не стаў адразу ж раздаваць абяцанкі, але сказаў, што «трэба ініцыяваць будаўніцтва яшчэ аднаго інтэрната». Сямён Шапіра таксама падтрымлівае ідэю стварэння ў абласным цэнтры Дома творчасці моладзі і менавіта маладых спецыялістаў хацеў бы бачыць у складзе інвестыцыйнага агенцтва, якое цяпер ствараецца.

Адказваючы на пытанне аб пазіцыі мясцовай улады ў дачыненні да захавання і аднаўлення гісторыка-культурных каштоўнасцяў, у прыватнасці, Каложскай царквы, Сямён Шапіра паведаміў аб ініцыятыве ААТ «Белаграпрамбанк» прафінансаваць працу па рэстаўрацыі Каложы. Пакуль на парадку дня — будаўніцтва царкоўна-прыходскага комплексу. «А за гэты час мы павінны параіцца са спецыялістамі і прыняць правільнае рашэнне непасрэдна па Каложскай царкве. Меркаванне спецыялістаў павінна быць першарадным», — лічыць старшыня аблвыканкама.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ — 20-ГРАДУСНЫЯ МАРАЗЫ!

У Беларусі ў першыя дні снежня тэмпература паветра чакаецца на 8—13 градусаў ніжэй за кліматычную норму. Пра гэта паведаміла карэспандэнту БЕЛТА начальнік аддзела гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла ПАРАШЧУК.

У суботу месцамі пройдзе кароткачасовы снег, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу складзе 2—8 градусаў марозу. У нядзелю халоднае паўночнае паветра яшчэ больш зацвердзіцца на тэрыторыі рэспублікі. У асобных раёнах пройдзе невялікі снег. Ноччу падмарозіць да 3—10 градусаў. У паўночных раёнах слупок тэрмометра будзе паказваць да мінус 13.

У панядзелак чакаецца снег, мяцеліца, моцны парывісты вецер. У аўторак на большай частцы тэрыторыі пройдзе снег, месцамі мяцеліца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе мінус 7—13 градусаў. У паўночных раёнах пахаладае да мінус 15 градусаў.

Па-зімоваму холадна будзе і ў сераду. Снег у асноўным спыніцца, але ўзмоцняцца маразы. Тэмпература паветра складзе мінус 13—18 градусаў, на паўночным усходзе пры праясненнях да мінус 20—22. Удзень чакаецца 8—15 градусаў ніжэй за нуль.

Алена ДЗЕМЯШКЕВІЧ, БЕЛТА.

Старэйшы брат

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

г. Лельчыцы.

ЗА ВЫПУСКНІКОЎ БУДУЦЬ ЗМАГАЦЦА І НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ, І ПРАЦАДАЎЦЫ...

...але рабіць заказ на падрыхтоўку кадраў мала хто спяшаецца

У бліжэйшыя пяць гадоў колькасць выпускнікоў агульнаадукацыйных школ скароціцца на 40 працэнтаў. Сёлета школу закончыла 88,2 тысячы чалавек (мінус 10,8 тысячы чалавек у параўнанні з папярэднім годам), а ў 2015 годзе выпускнікоў будзе і ўвогуле толькі каля 55 тысяч. «У гэтых умовах аб'ектыўнасць і даклад-насць заказу на падрыхтоўку кадраў набывае асаблівае значэнне», — заявіў на калегіі, прысвечанай падвядзенню вынікаў мінулай прыёмнай кампаніі, першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр ЖУК. На думку Аляксандра ЖУКА, з улікам патрэбы краіны ў развіцці высокатэхналагічных і навукаёмістых галін установам адукацыі трэба і далей нарошчваць прыём на тэхнічныя і прыродазнаўчыя спецыяльнасці.

Міністэрства адукацыі ў ініцыятыўным парадку ўзяло на сябе работу па аўтаматызацыі працэсу прагназавання і планавання падрыхтоўкі кадраў. Сёлета органамі дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамамі, заказчыкамі кадраў такая схема рэалізуецца ўпершыню. На жаль, давялося сутыкнуцца з адсутнасцю належнай увагі і разумення гэтай работы.

— Безумоўна, фарміруемыя лічбы прагнозу і заказу нясуць у сябе пэўную пагрэшнасць — як аб'ектыўную, так і суб'ектыўную. Аднак нам усім неабходна працаваць на апярэджанне і разумець, што запланаваныя спецыялісты з'явяцца на рынку працы толькі праз 4-5 гадоў. — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Таму Міністэрства адукацыі раней, чым звычайна, запрасіла ў ВНУ і ССНУ лічбы прыёму, каб разам з зацікаўленымі бакамі ўнесці ў іх абгрунтаваныя карэктывы. Па стане на 23 лістапада інфармацыю ў аўтаматызаваную сістэму «Заказ на падрыхтоўку кадраў» падалі 17 з 24 міністэрстваў, 3 дзяржкамітэты з 8 і ўсе пяць канцэрнаў.

Вось што здзіўляе: нягледзячы на шматлікія вусныя заявы, у тым ліку і ў СМІ, на незадаволеныя патрэбы арганізацый-рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій у інжынерных кадрах, адміністрацыяй Парка высокіх тэхналогій па сённяшні дзень не пададзены заказ на іх падрыхтоўку. Увогуле, па пададзенай інфармацыі заказ на падрыхтоўку інжынерных кадраў па профілі «Тэхніка і тэхналогіі» складае штогод толькі ад 1640 да 1820 чалавек, што ставіць пад пагрозу кадравае забеспячэнне інавацыйнага шляху развіцця краіны. Ці вось яшчэ адзін прыклад. У апошнія гады па ініцыятыве Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры ў ВНУ былі значна павялічаны лічбы набору па будаўнічых спецыяльнасцях (за пяць гадоў на 1,1 тысячы чалавек, або на 34 працэнты). Разам з тым, згодна з прадстаўленай інфармацыяй, штогадовы заказ на падрыхтоўку спецыялістаў у будаўніцтве склаў усяго 400 чалавек.

У Беларусі пакуль няма каардынуючага органа, які б забяспечваў работу па прагназаванні падрыхтоўкі кадраў. Сёння не ўлічваюцца патрэбы сярэдняга і малога бізнэсу. У Мінску толькі палова прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці ўваходзіць у склад канцэрна «Беллегпрам», і невядома, колькі кадраў трэба падрыхтаваць і выпусціць на рынак...

— Неабходна тэрмінова прымаць стратэгічныя рашэнні: вызначыцца, якія напрамкі падрыхтоўкі істотна скарачаць, адкарэктаваць структуру падрыхтоўкі па ўзроўнях адукацыі, для некаторых сектараў эканомікі рыхтаваць кадры за кошт перападрыхтоўкі і перанавучання даруслага насельніцтва, а арганізацыям і прадпрыемствам — прымаць меры па замацаванні кадраў: ствараць адпаведныя ўмовы для сваіх работнікаў, прапаноўваць ім са-

Даведка «Звязды»:

Па стане на 1 чэрвеня 2010 года ў гарадской мясцовасці асноўны попыт захоўваўся на ўрачоў (1099 вакансій), інжынераў-канструктараў (625 вакансій) і інжынераў-праграмістаў (76 вакансій), а ў сельскай мясцовасці — на інжынераў (284 вакансіі), заатэхнікаў (214), ветэрынарных урачоў (253 вакансіі). Разам з тым незапатрабаванымі ў гарадской мясцовасці былі юрысты (на 51 вакансію прыпадала 200 беспрацоўных), бухгалтары (на 199 вакансій 603 беспрацоўныя), эканамісты (на 124 вакансіі 360 беспрацоўных), а ў сельскай мясцовасці — эканамісты (на 27 вакансій 68 беспрацоўных) і бухгалтары (на 58 вакансій 108 беспрацоўных).

цыяльныя пакеты і гэтак далей, — дадаў Аляксандр Жук.

Між іншым, попыт у краіне на атрыманне другой вышэйшай адукацыі пастаянна расце. **Цяпер другую вышэйшую адукацыю атрымлівае ўжо 3,1 тысячы чалавек, што ў 1,5 раза больш, чым два гады назад.** А паколькі колькасць абітурыентаў будзе скарачацца далей з кожным годам, ахвотныя атрымліваць другую вышэйшую адукацыю становяцца для ВНУ сапраўднай выратавальнай саломінкай.

А вось стаўка ВНУ на пашырэнне набору на завочную форму навучання Міністэрствам адукацыі зусім не вітаецца. У 2010 годзе доля завочнікаў склала 46 працэнтаў ад усяго набору. Аднак, калі ў дзяржаўных ВНУ набор на завочную форму навучання склаў 44 працэнты ад агульнай колькасці залічаных, то ў прыватных ВНУ гэты паказчык дасягнуў 73 працэнты.

— Такая прапорцыя патрабуе сур'ёзнай карэкціроўкі, — заявіў Аляксандр Жук. — Абітурыенты-завочнікі маюць слабейшую падрыхтоўку, а гэта пазней, падчас навучання, уплывае і на якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. Да таго ж большая частка абітурыентаў паступае на завочную форму навучання, не маючы працоўнага стажу.

Сапраўдныя казусы назіраліся сёлета з той прычыны, што ў ВНУ адсутнічалі адзіныя зацверджаныя пералікі профільных і роднасных спецыяльнасцяў, якія даюць абітурыентам права на ўдзел у конкурсе пры паступленні на завочную форму навучання за кошт сродкаў бюджэту. Так, у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў на спецыяльнасць «рэжысура тэатра» на бюджэтную завочную форму навучання была залічана як працуючая па профілі вядучы бібліятэкар Нацыянальнай бібліятэкі. А ў залічэнні на спецыяльнасць «акцёрскае майстэрства драмтэатра і кіно» было адмоўлена, як непрацуючай па профілю, артыстцы хору Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. Пры гэтым артыст балета таго ж тэатра быў залічаны «на бюджэт»: яго работа, на думку членаў прыёмнай камісіі, адпавядала профілю абраной спецыяльнасці....

Не без гонару Аляксандр Жук адзначыў тэндэнцыю па выраўноўванні падрыхтоўкі абітурыентаў-гараджан і выхаванцаў установ адукацыі, размешчаных у сельскай мясцовасці. Розніца ў сярэдніх балах гараджан і вяскоўцаў на ЦТ вагалася ў залежнасці ад прадмета ад 0,3 да 5 балаў (летась яна была ад 0,9 да 6 балаў). А па геаграфіі, між іншым, як і летась, выпускнікі сельскіх школ мелі нават перавагу перад гараджанамі ў 2,6 бала. І гэта пры адсутнасці ў сельскай мясцовасці інстытута рэпетытарства...

Такім чынам, рэзюмаваў Аляксандр Жук, паступова знікае патрэба ў правядзенні асобнага конкурснага адбору для гараджан і прадстаўнікоў сельскай мясцовасці. Так, у БДУ пры паступленні на 28 з 55 спецыяльнасцяў выпускнікі сельскіх школ залічваліся на агульным конкурсе з гараджанамі, паколькі мелі больш высокі бал, чым выпускнікі гарадскіх устаноў адукацыі. Усяго ў бягучым годзе ў беларускія ВНУ было залічана 7,3 тысячы сельскіх абітурыентаў, што складае 34 працэнты ад усіх выпускнікоў сельскіх школ сёлетняга выпуску. У 2009 годзе студэнтамі сталі 6,5 тысячы выпускнікоў сельскіх школ (або 33 працэнты ад агульнага выпуску), а ў 2008 годзе — 6,1 тысячы чалавек (31 працэнт).

З кожным годам павялічваецца ў беларускіх ВНУ і колькасць замежных грамадзян, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю на платнай аснове. За апошнія чатыры гады прыём замежных грамадзян вырас амаль утрая: у 2010 годзе на першы курс былі залічаны 2 681 замежны грамадзянін, у 2009 годзе — 2 234, у 2008 годзе — 1766, а ў 2007 годзе — толькі 938. На падрыхтоўчых аддзяленнях ВНУ зараз навучаецца больш за 1,5 тысячы замежнікаў.

Па даручэнні Міністэрства адукацыі дырэктары сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў таксама правялі работу па прыцягненні на навучанне замежных грамадзян, у выніку чаго ў ССНУ былі залічаны сёлета 674 абітурыенты з кола замежных грамадзян. Для параўнання: у 2009 годзе такіх было ўсяго 218.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Абзац

57-гадовы мінчанін загінуў пад коламі «Пежо-405» на вуліцы Казінца. 28-гадовы кіроўца, у крыві якога было выяўлена 2,95 праміле алкаголю, збіў пешахода на нерэгуляваным пераходзе насупраць прыпынку грамадскага транспарту «Ручай». Па словах кіроўцы, ён ехаў па крайняй правай паласе, не паспеў затармазіць і здзейсніў наезд. Мужчына прызнаў, што выпіў за гадзіну да аварыі пляшку віна. Ехаў дадому ў Калядзічы, а паехаў праз горад, бо «на кальцавой заторы». Супрацоўнікі ДАІ расказалі, што падчас тлумачэнняў кіроўца расплакаўся і заявіў: «Лепш бы мяне пасадзілі». Вядзецца расследаванне.

Наведнік рэстарана «Сёмае неба» ў гатэлі «Мінск» разбіўся, упаўшы з 6-га паверха. Пракуратура праводзіць праверку па факце гібелі 34-гадовага жыхара Мінскага раёна. Няшчасны выпадак здарыўся прыблізна ў 23.00 25 лістапада. Мужчына адпачываў у кампаніі ў рэстаране, выпіў. З-за неасцярожнасці ён пераваліўся цераз парэнчы на ўнутранай лесвіцы гатэля і, упаўшы з шостага паверха, памёр на месцы.

У Мінску затрыманы буйны нелегальны пастаўшчык насення маку. 32-гадовы жыхар Мінска быў затрыманы падчас ажыццяўлення здзелкі з адным з наркаманаў. У аўтамашыне прадаўца аператыўнікі знайшлі 57 кг насення маку ў расфасаваных пакетах, а таксама 25 літраў бутыляванага растваральніка, неабходнага для прыгатавання наркотыка. Кілаграм макавага насення наркадылер прадаваў па 100 тысяч рублёў.

Двое нецвярозых жыхароў Пінскага раёна спрабавалі сагнаць фургон з марозівам. Кіроўца тэрмафургона Mersedes на некалькі хвілін пакінуў аўтамабіль з ключамі, устаўленымі ў замок запальвання. Гэтым і скарысталіся зламыснікі. Яны ўскочылі ў машыну і спрабавалі з'ехаць. Аднак не здолелі справіцца з грузавіком, праехалі некалькі метраў і спыніліся, пры гэтым умудрыліся пашкодзіць тры легкавікі. Няўдалая «аперацыя» па крадзяжы грузавіка з марозівам доўжылася 10 хвілін. Небаракаў затрымалі мінакі і перадалі патрулю міліцыі.

Поўны абзац

Нямецкі пенсіянер выпадкова замураваў сябе ў падвале ўласнага дома. Сталы жыхар горада Ена самастойна праводзіў работы ў падвале: збіраўся наглуха перакрыць уваход у гаспадарчае памяшканне, праз якое толькі і можна было прабрацца ў падвал. Сваю памылку ён асэнсаваў толькі тады, калі работы былі завершаныя і ён быў заблакаваны ў памяшканні. Немец правёў у падвале некалькі дзён, а потым усё ж пачаў выбірацца. Ён вырашыў разбурыць адну са сцен, але ў цемры пераблытаў і пачаў дрыліць сцяну, што вяла да суседзяў. Тыя зразумелі, што свідруюць з іх боку, і выклікалі паліцыю. Вартавыя парадку не сталі ламаць сцяну і дачакаліся, пакуль пенсіянер выберацца сам. Калі той нарэшце вызваліўся, з ім правялі гутарку. Ці давядзецца чалавеку плаціць за пашкоджаную сцяну, не паведамляецца.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

НАСТАЎНІК — ГУЧЫЦЬ...

У жыхара в. Бродніца (Лунінецкі раён) нехта з прысядзібнага ўчастка ўкраў 700 кг бульбы. Пра гэта можна было б не пісаць — банальная з'ява. Здзівіла тое, што тую бульбу выкралі настаўнік сярэдняй школы, які жыве ў в. Кажан-Гарадок, беспрацоўны з в. Любачын і жыхар в. Радванічы Брэсцкага раёна. Апошняга шукаюць, а дваіх затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ВЫПІЛІ І... БІЦЦА

У палове выпадкаў сямейна-бытавых злачынстваў правапарушальнікамі з'яўляюцца мужчыны ва ўзросце 30-45 гадоў, пацярпелымі — жанчыны пасля 45 гадоў.

Паводле звестак Міністэрства ўнутраных спраў, прыкладна палова згаданых злачынстваў скіраваная на партнёраў па шлюбе ці сужыцеляў, другая палова — на іншых членаў сям'і. Усё часцей ахвярамі сваякоў становяцца пенсіянеры. Абсалютная большасць гвалтоўных дзеянняў мае месца пасля сумеснага распівання спіртных напояў.

Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын» правяла шэраг інтэрв'ю як з жанчынамі, якія здолелі выйсці з гвалтоўных адносін, так і з тымі, што працягваюць жыць з крыўдзіцелем. Даследчыкі прыйшлі да высновы, што ахвяры трэба мяняць сябе, шукаць сілы для актыўных дзеянняў. Нельга баяцца, трываць — варта станавіцца эканамічна самастойнай. І адразу рваць адносіны з агрэсіўным партнёрам, паколькі агрэсары ніколі не перастаюць быць такімі. Варта ўсвядоміць: дрэнная сям'я з бацькам заўсёды горш, чым сям'я няпоўная, але са спакойнымі і добразычлівымі адносінамі.

У інтэрнэце адкрыўся першы рускамоўны блог супраць гвалту: www.ostanovinasilie.org.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА

Адрес объектов и их наименование	- главный корпус здания для мастерской , инв. № 1002, площадь 2121,3 кв.м. год постройки – 1980; - здание мехмастерских, инв. № 1006, площадь 689,3 кв.м, год постройки – 1986; - профилакторий для ремонта автокранов, инв. № 1005, площадью 98,6 кв.м; - производственный пункт заправочной станции, инв. № 2059, площадь 5 кв.м, год постройки – 1981; - здание материального склада, инв. № 1001, площадь 152,2 кв.м, год постройки – 1972. Объекты расположены по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Рабочая, 1. **Имущество продается одним лотом.** **Начальная цена: 1 200 039 300 белорусских рублей.**
Продавец	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме
Организатор аукциона	СИКУП «УКС-СЕРВИС»
Сумма задатка	**10 %** от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»
Порядок оплаты	Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-СЕРВИС»
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица; физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, справку ГНИ об отсутствии задолженности по подоходному налогу
Конечный срок и адрес приема заявок	15.12.2010 г. до 16.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-СЕРВИС», тел.: (8 0176) 73 00 13, 75 16 09, (факс) 75 19 20, моб. 8 044 710 74 60
Дата, время и место аукциона	16.12.2010 г. в 15.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15.

Рынак жылля

АКТЫЎНАСЦЬ ПАКУПНІКОЎ ПРАЦЯГНЕЦЦА ДА НОВАГА ГОДА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

(Заканчэнне. Пачатак у нумары 26 лістапада.)

Як паведаміў рэдакцыі кіраўнік агенцтва «БелЦТН», старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ, цяпер на другасным рынку сталічнага жылля знаходзіцца каля 8,5 тысячы кватэр, з якіх каля 5 тысяч аб'ектаў прапануецца на продаж па завышаным кошце без вялікага шанцу на рэальную рэалізацыю. Праўда, сёлета ўжо большая частка прадаўцоў згаджаецца перапісваць свае цэннікі, каб гадамі не пакідаць свае кватэры ў каталогах мёртвым грузам. З жыллём па яўна завышаным кошце агенцтвы нерухомасці сёння ўжо амаль не працуюць. Наш эксперт упэўнены, што кватэры ў Мінску будуць актыўна набывацца максімум да 25 снежня. А вось потым на працягу студзеня і лютага на рынку чакаецца мёртвы сезон.

ПАВЕЛІЧЭННЕ ПОПЫТУ СПРАВАКАВАЛІ ЧУТКІ АБ МАГЧЫМЫМ ПАВЕЛІЧЭННІ САБЕКОШТУ БУДАЎНІЦТВА?

Асобныя спецыялісты рынку нерухомасці звязваюць павелічэнне актыўнасці патэнцыйных пакупнікоў жылля з тым, што такім чынам людзі з грашыма спрабуюць фінансава засцерагчы сябе ад «магчымай дэвальвацыі». Праўда, апошнімі днямі галоўны банкір краіны запэўніў насельніцтва, што беларускі рубель няма неабходнасці абясцэньваць. Старшыня Нацыянальнага банка краіны паведаміў, што калідор ваганняў курса рубля да валютнага кошыка запланаваны на 2011 год у межах плюс-мінус 8 працэнтаў.

Усё гэта так, але цяпер кліенты з грашыма спрабуюць прагназаваць сітуацыю самастойна. Тым больш што ў інтэрнэце і некаторых СМІ пачынаюць гуляць чуткі аб тым, што пасля Новага года з улікам новых цэн на энерганосьбіты можа істотна павялічыцца і кошт будаўніцтва жылля. Аднак гэта не зусім адпавядае галоўным прыярытэтам будаўнічай галіны, якія прадугледжваюць будаўніцтва ў бліжэйшыя гады каля аднаго квадратнага метра жылля ў год на кожнага жыхара краіны з захаваннем якасці гэтага будаўніцтва і стрымліванне ў эканамічна абгрунтаваных межах рост цэн на жыллё. Маецца на ўвазе такі параметр, каб кошт квадратнага метра кватэры адпавядаў узроўню сярэдняга заробку чалавека за месяц. Нагадаю, што сёлета сярэдні кошт квадратнага метра для чаргавікоў складаў 500—650 долараў. Прыкладна на такім узроўні павінен застацца кошт жыллёвага квадрата і ў наступным годзе, паведаміў рэдакцыі **начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ**.

Павялічыць даступнасць жылля паспрыяе і апошняе рашэнне кіраўніка дзяржавы, якое дазваляе асобам з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў атрымліваць ільготныя крэдыты ў памеры 100 працэнтаў ад кошту будаўніцтва. Адначасова прынята рашэнне аб абавязковай здачы жылля ў шматкватэрных дамах з поўным аздабленнем, з улікам інтарэсаў грамадзян, якія змогуць выбіраць варыянты ўласнага аздаблення кватэры.

Спецыялісты рынку жыллёвай нерухомасці не выключаюць варыянта, што чуткі аб магчымым падаражанні будаўніцтва былі наўмысна «ўкінуты» ў межах піяр-кампаніі прыватнымі камерцыйнымі забудоўшчыкамі. Не сакрэт, што сёння асобныя камерцыйныя арганізацыі маюць сур'ёзныя цяжкасці пры рэалізацыі ўжо пабудаванага жылля.

ВЯЛІКІ ВЫБАР ДОЛЕВАГА БУДАЎНІЦТВА

Сёлета на першасным рынку жылля існуе шмат варыянтаў па долевым і камерцыйным будаўніцтве. Самыя дарагія кватэры прапануюцца кліентам у новым маналітным доме ў цэнтры Мінска ў раёне вуліцы Арлоўская. Там квадратны метр каштуе ў межах 2 тысяч долараў. У жылым квартале «Маскоўскі», побач з вуліцай Голубева, квадратны метр кватэр у новым жылым доме прапануецца забудоўшчыкамі па кошце ў межах 1150—1350 долараў.

Ёсць магчымасць будаваць элітныя кватэры ў 19-павярховым доме ў квартале вуліц Сурганава—Акадэмічная. Квадратны метр у такіх кватэрах будзе каштаваць ад 1450 да 1700 долараў. Плануецца, што дом будзе здадзены ў IV квартале 2011 года. Па лініі долевага будаўніцтва жыхарам сталіцы прапануюцца значна таннейшыя варыянты. Напрыклад, група кампаній «Твая сталіца» пачынае заключаць дагаворы на долевае будаўніцтва ў мікрараёне «Каменная горка», дзе квадратны метр кватэр у шматпавярховым доме каштуе ад 950 долараў. У новым мікрараёне побач з метро Аўтазаводская, побач з вуліцай Адэскай долевае будаўніцтва квадратнага метра каштуе ад 900 долараў.

Старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» адзначае, што менавіта ў лістападзе актыўна заключаюцца дагаворы долевага будаўніцтва, калі кошт жыллёвага квадрата складае не больш як 1150 долараў. Галоўным чынам у кліентаў добрым попытам карыстаюцца адна- і двухпакаёвыя кватэры, а вось трохпакаёвыя кватэры з агульнай плошчай каля 100 квадратных метраў патэнцыйных гаспадароў пакуль не маюць. Тут трэба адзначыць, што агучаны кошт камерцыйнага жылля прадугледжвае кватэры без аздаблення. Зразумела, што больш-менш якаснае аздабленне будзе каштаваць гаспадару кватэры яшчэ каля 25—30 працэнтаў ад кошту жылля.

КРЭДЫТЫ НА АГУЛЬНЫХ ПАДСТАВАХ І СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ПРАПАНОВА

Максімальны ўзровень працэнтных ставак па камерцыйных жыллёвых крэдытах у пачатку года дасягаў 22—26 працэнтаў гадавых. Потым Нацыянальным банкам і ўрадам краіны прымаліся актыўныя меры па зніжэнні працэнтных ставак, якія сёння склаліся на ўзроўні 17—18,5 працэнта. Мікалай Прасталупаў паведамляе, што цяпер насельніцтва пачало больш актыўна карыстацца такімі крэдытамі для набыцця і будаўніцтва жылля. Для развіцця долевага і камерцыйнага будаўніцтва канкрэтных забудоўшчыкаў ці асобных аб'ектаў прыватныя банкі пачалі прапаноўваць спецыяльныя ўмовы крэдытнай падтрымкі. Напрыклад, у БПС-Банка існуе спецыяльная крэдытная прапанова, дзе стаўка для чаргавікоў складае 13,5 працэнта, а на агульных падставах — 16,5 працэнта гадавых. Для кліентаў, якія паспрабуюць будаваць дарагія кватэры па вуліцы Сурганава, забудоўшчык «Арэса-Сэрвіс» сумесна з БПС-Банкам прапануе танную праграму крэдытавання, дзе працэнтная стаўка на агульных падставах складае 12,5, а для чаргавікоў — 10 працэнтаў.

Сяргей КУРКАЧ.

На чутках і аўтарытэтна

ІНФАРМАЦЫЯ АБ КАТАСТРАФІЧНА СУРОВАЙ ЗІМЕ Ў ЕЎРОПЕ АКАЗАЛАСЯ ГАЗЕТНАЙ КАЧКАЙ

Яшчэ ў другой палове верасня вядомыя інфармагенцтвы распаўсюджвалі сенсацыйную навіну пра тое, што быццам бы польскія метэаролагі падрыхтавалі даволі смелы прагноз аб самай суровай за апошняе тысячагоддзе сёлетняй зіме ў Еўропе. Гэты прагноз тлумачыўся згасаннем Гальфстрыма — цёплага цячэння Атлантычнага акіяна. Нібыта гэта цячэнне ўжо не будзе паспяваць кампенсаваць холад арктычнага паходжання, што выклікае кліматычную катастрофу ў Еўропе, дзе пачнецца ледавіковы перыяд... З першымі маразамі асобныя інтэрнэт-сайты зноў пачалі пужаць нас анамальнымі тэмпературамі да мінус 40—50 градусаў.

Ці сапраўды пасля анамальна спякотнага лета нам прыйдзецца добра памерзнуць? **Начальнік службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ** паведаміў, што насамрэч такіх смелых прагнозаў на зіму метэаролагі не рабілі. Пасля з'яўлення ў СМІ гэтай сенсацыйнай навіны беларускія сіноптыкі вырашылі ўдакладніць інфармацыю ў польскіх калег. На што польскі бок адказаў афіцыйным абвяржэннем. Увогуле, польскія кліматолагі ніколі не рабілі такіх доўгатэрміновых прагнозаў. У сваю чаргу Сусветная метэаралагічная арганізацыя паведаміла, што падобныя прагнозы не маюць ніякіх навуковых абгрунтаванняў і не могуць успрымацца сур'ёзна.

Пра тое, якой будзе сапраўды зіма сёлета, спецыялісты паведамляюць вельмі асцярожна. Справа ў тым, што прагноз на месяц адпавядае рэальнаму надвор'ю толькі ў межах 70 працэнтаў, а апраўдвальнасць сезонных прагнозаў бывае і ўвогуле не больш за 60—65 працэнтаў.

Згодна з доўгатэрміновым прагнозам расійскіх кліматолагаў, гэтая зіма ў нашай краіне па тэмпературных паказчыках будзе блізкай да кліматычнай нормы. Сярэднямесячная тэмпература снежня і студзеня чакаецца ў межах каля нормы, а вось люты можа стаць на 0,5 градуса халаднейшым. Дзмітрый Рабаў адзначыў, што ў апошнія гады зіма ў Беларусі мае даволі няўстойлівы характар. Халодныя перыяды могуць перарывацца адлігамі. На працягу каля трох тыдняў чакаюцца гэтай зімой маразы да мінус 20 градусаў. Недзе на працягу тыдня маразы могуць трымацца і на ўзроўні мінус 30—35, а ў асобных месцах уначы нават халадней.

Што датычыцца цёплага Гальфстрыма, то амерыканскія навукоўцы падлічылі, што цячэнне гэтае, наадварот, стала ў апошнія гады недзе на 0,1—0,5 градуса цяплейшым. Калі такая тэндэнцыя працягнецца і надалей, суровыя зімы ў Еўропе могуць увогуле знікнуць...

Сяргей КУРКАЧ.

Вниманию акционеров ОАО «СПМК № 127»

Открытое акционерное общество «Специализированная передвижная механизированная колонна № 127», место нахождения: 220075, г. Минск, ул. Инженерная, 22, сообщает о покупке акций собственного выпуска на внебиржевом рынке на следующих условиях:

Цель приобретения: последующая продажа инвестору на условиях, предусмотренных бизнес-планом.

Цена — 51$ за 1 акцию (оплачивается в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты, при оплате нерезиденту — в долларах США).

Срок оплаты — в течение 60 календарных дней с даты зачисления акций на счет ОАО «СПМК № 127».

Количество — 3 953 акции.

Срок подачи предложений о продаже акций — 30 календарных дней с даты опубликования.

Срок заключения договоров купли-продажи акций — 30 дней с даты окончания срока на подачу предложений о продаже акций.

Адрес заключения договоров купли-продажи акций — г. Минск, ул. Инженерная, 22, тел. 8 017 344 53 22.

УНП 100048018

Страховой полис «Добровольное страхование от несчастных случаев» форма 2РН серия НССБ № 005136 ЗАСО «Белнефтестрах» **считать недействительным.**

УНП 101143603

г. ВИТЕБСК **16.12.2010**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА НА 50 %

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
3.	Неиспользуемое здание магазина с тремя пристройками, дорожкой, забором и сетями, расположенное по адресу: Витебская область, Миорский район, г. Миоры, ул. Садовая, 1, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: - капитальное строение с инв. № 211/С-8297 (здание магазина с тремя пристройками, дорожкой и забором) – кирпичное, фундамент – бутобетонный ленточный, перекрытия – дощатые, крыша – шиферная, общая площадь 136,6 кв.м; - капитальное строение с инв. № 254/С-9123 (сооружение специализированное коммунального хозяйства (хозбытовая канализационная сеть) – протяженностью 1,1 м; - капитальное строение с инв. № 254/С-9124 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения (водопроводная сеть) – протяженностью 12,0 м; - капитальное строение с инв. № 254/С-9125 (сооружение специализированное энергетики (электрическая сеть) – протяженностью 15,0 м. Земельный участок с кадастровым номером 223350100001000309, площадью 0,0216 га, под здание магазина с офисом, сроком аренды 50 лет. Использование – под объект розничной торговли.	46450305	4645030
4.	Неиспользуемые объекты производственной базы, расположенные по адресу: Витебская область, Докшицкий район, Крулевщинский с/с, д. Крулевщина, и право заключения договора аренды земельных участков	Характеристика объектов недвижимости: - капитальное строение с инв. № 232/С-16653 (здание конторы), кирпичное двухэтажное, 1978 г.п., общ. площадь 421,1 кв.м, объем 1548 куб.м, фундамент бутовый, перекрытия ж/бетонные, крыша совмещенная рулонная; асфальтовое покрытие, площадь 902,46 кв.м, асфальтовая дорожка, площадь 63,54 кв.м, бордюр (бетонный борт), ворота сварные металлические на металл. столбах; - капитальное строение с инв. № 232/С-16654 (здание гараж-мастерская), кирпичное одноэтажное, 1979 г.п., общ. площадь 599,8 кв.м, объем 4217 куб.м, фундамент ж/бетонный, перекрытие бетонное, крыша совмещенная; - капитальное строение с инв. № 232/С-16655 (здание гаража, проходная), кирпичное одноэтажное, 1979 г.п., общ. площадь 78,3 кв.м, объем 415 куб.м, фундамент бутовый, перекрытие ж/бетонное, крыша совмещенная, рулонная, забор металл. на металл. столбах, длина 11,5 м; - капитальное строение с инв. № 232/С-16656 (здание материального склада), одноэтажное, 1979 г.п., общ. площадь 296,0 кв.м, объем 873 куб.м, фундамент бутовый, наружные стены кирпичные, дощатые, шиферные, крыша шиферная; асфальтобетонная площадка, площадь 840 кв.м, забор ж/бетонный на ж/бетонных столбах, площадь 385 кв.м; - капитальное строение с инв. № 232/С-16673 (навес), шиферное одноэтажное, 1979 г.п., площадь 280,5 кв.м, объем 1562 куб.м, фундамент бутовый, крыша шиферная; - сооружение с инв. № 232/С-17532 (сооружение специализированное коммунального хозяйства – наружная канализация), протяженность 209,89 м; - сооружение с инв. № 232/С-17533 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – наружный водопровод), протяженность 197,68 м; - зеленые насаждения: каштан – 2 шт., клен – 1шт., сирень – 1 шт., туя – 3 шт. Земельные участки сроком аренды 99 лет, с кадастровым номером 222183005101000561 под здание конторы, площадью 0,2041 га, и с кадастровым номером 222183005101000562 под объекты производственной базы, площадью 0,6428 га. Использование – под объект общественного назначения.	165419355	16541930
5.	Неиспользуемое здание склада с рампой, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Боровая, д. 11, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение инв. № 250/С-27777 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), одноэтажное кирпичное, 1985 г.постройки, фундамент бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша рулонная, общая площадь 1030 кв.м, объем 5232 куб.м, бетонная рампа, площадь 95 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 243500000001001208 для содержания и обслуживания здания вещевого склада, площадь 0,4656 га, срок аренды 25 лет. Использование – под специализированное здание здравоохранения и предоставления социальных услуг.	212911300	21291130

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

1. Аукцион состоится **16 декабря 2010 г.** в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов **15.12.2010** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 16.12.2010 с 14.00 до 15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

4. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 3 миллионов рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

5. Подробная информация об условиях аукционов, порядке участия и проведения аукционов опубликована ранее в газете «Звязда»: по лоту № 3 в № 175 (26533) от 17.09.2009 , по лоту № 4 в № 144 (26502) от 05.08.2009, по лоту № 5 в № 164 (26522) от 02.09.2009.

БЫЦЬ КАРАТКЕВІЧАМ

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 26 лістапада.)

Перакладаюць Караткевіча на розныя мовы і цяпер. Напрыклад, па ініцыятыве Міністэрства культуры Беларусі і пры падтрымцы грамадскага аб'яднання «Беларусі фонд культуры» выдадзена аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» на чатырох мовах: беларускай, рускай, украінскай, англійскай. Яе напісаў 20-гадовы юнак, які аднойчы зразумеў, што як асобны чалавек павінен быць самім сабой, так і народ.

На прэзентацыі выдання **міністр культуры Павел Латушка** адзначыў:

— Што Уладзімір Караткевіч зрабіў для Беларусі? Ён зрабіў галоўнае: даў нам разуменне таго, што мы — народ, які мае глыбокія карані, багатую гісторыю, якая з'яўляецца часткай еўрапейскай. Праз сваю творчасць ён яскрава прамовіў, што мы — дзяржава, краіна, народ Еўропы. Уладзімір Караткевіч стварыў глебу для будучай незалежнай Беларусі. Не, ён не ствараў легенд і міфаў — ён гаварыў праўду пра нашу гісторыю, культуру.

Кніга «Дзікае паляванне караля Стаха» на чатырох мовах друкавалася ў Польшчы, і яна атрымалася як своеасаблівы мастацкі твор. Але гэты твор даступны па кошце: 56 тысяч беларускіх рублёў — дзеля таго, каб набыць яе маглі бібліятэкі і музеі, а таксама і асобныя чытачы. Ёсць і падарункавы варыянт выдання — кніга заключана ў своеасаблівай скарбонцы...

Аўтар прадмовы да гэтага выдання **Анатоль Бутэвіч**, намеснік старшыні Беларускага фонду культуры, сказаў пра «свайго Караткевіча»:

— Мне здаецца, што абсалютна справядліва, што мы, беларусы, нарэшце ўмеем якасна святкаваць юбілеі нашых выбітных асобаў. Мы нарэшце прыходзім да Караткевіча. Многія ўжо прыйшлі да яго, а некаторыя яшчэ прыходзяць. І прыйшоўшы, разумеем, сучаснікамі якой вялікай асобы былі мы. Нам пашчасціла жыць разам, чытаць ягоныя кнігі. Мне пашчасціла бачыць, як стаялі чэргі ў бібліятэках, каб атрымаць чарговы нумар часопіса з публікацыяй Караткевіча... Уладзімір Сямёнавіч здолеў нас далучыць да нашай гісторыі. Нам, беларусам, адкрыць нас, беларусаў. Але яшчэ мне здаецца, што ён здолеў адкрыць нас, беларусаў, усяму свету. Я перакананы, што ў кожнага з нас свой Караткевіч. Гэта добра, гэта значыць, што мы знаходзім і будзем знаходзіць у яго творах тое адметнае, што нам дапамагае ў жыцці.

Беларуская мова Караткевіча. Геніяльны пісьменнік той, які знаходзіць ключ ці шыфр, каб атрымаць доступ да асабістай душэўнай і разумовай скарбонкі кожнага чалавека. Ключ (ці шыфр) здаецца простым, як усё геніяльнае: ён складзены на мове людзей, да якіх ён ішоў. На той мове, якую абраў сам. Павучыўшыся ў Кіеве, у Маскве, ён прыняў рашэнне і пісьменніцкае, і чалавечае: беларуская мова назаўсёды. Дзіўна тое, што мог бы думаць (як некаторыя зараз), што гэта змяншае яго чытацкую аўдыторыю, аднак атрымалася наадварот. Ён і цяпер застаецца самым папулярным пісьменнікам Беларусі. Паводле сведчання галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура» **Віктара Шніпа**, за апошнія пяць гадоў выйшла 9 назваў кніг Караткевіча, якія хутка разыходзіліся, некаторыя перавыдаваліся і зноў разыходзіліся. Караткевіч карыстаецца попытам у сённяшняй Беларусі на беларускай мове — з гэтым не паспрачаешся. Яго можна чытаць у інтэрнэце — ёсць сайт, прысвечаны гэтаму беларускаму пісьменніку. Там яго галоўныя чытачы — у асноўным «прасунутая» моладзь. Якая ў XXI стагоддзі лічыць Караткевіча вельмі «прасунутым» і сучасным пісьменнікам. Моладзь, якая праз яго творы далучаецца да беларускай мовы. І магчыма, калісьці захоча пайсці ўслед за аўтарам: бо для яго быць беларусам азначала — гаварыць па-беларуску.

Аляксандр Лукашанец, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры НАН адзначыў на адкрыцці выставы ў Літаратурным музеі:

— Уладзімір Караткевіч быў выхаваны ў рэчышчы трох усходнеславянскіх моў, культур. Сваёй творчасцю ён праславіў менавіта беларускую мову, літаратуру, культуру, гісторыю. Праславіўся не толькі тым, што значна пашырыў дыяпазон беларускай літаратуры, не толькі тым, што пашырыў жанры мастацкай творчасці, не толькі тым, што фактычна з'яўляецца стваральнікам сучаснага беларускага гістарычнага рамана і гістарычнага дэтэктыва. Дзякуючы яго творам многія сучасныя беларусы дакрануліся да тых старонак айчыннай гісторыі, якую нельга спасцігнуць праз сухія радкі гістарычных хронік ці дапаможнікаў. Дзякуючы творам Караткевіча нашы сучаснікі дакрануліся да глыбіні душы беларускага народа, да яго высакародства. Але заслуга Караткевіча яшчэ і ў тым, што ён сваёй творчасцю значна пашырыў і магчымасці беларускага слова. Ён у сваіх творах вельмі трапна выкарыстоўваў багацце беларускай мовы, уводзіў у сваю творчасць, а гэта значыць, у шырокі ўжытак і гістарызмы, і запазычаную лексіку, ствараў новыя лексічныя адзінкі. Ён сапраўды стаў сімвалам нашай краіны, але і яго творы, яго трапныя выслоўі і выразы сталі яе сімваламі. Для гэтага варта ўзгадаць выраз «Зямля пад белымі крыламі»...

Захапляцца краінай. Імкнуцца ведаць яе лепш. Так, як імкнуўся Караткевіч... Захапленне, напэўна, узнікла раней за жаданне выказацца, напісаць. Ён любіў вандраваць па краіне, любіў яе прыроду, з задавальненнем вудзіў рыбу. Прыгожым голасам, з шырокай душой спяваў яе песні. І ў кожным моманце захаплення ўмеў убачыць цуд: гэта ёсць, гэта маё... Наша!

Алена Сінькевіч, пляменніца Уладзіміра Сямёнавіча, нагадала пра ягоную здольнасць бачыць цуды і раскрываць іх, працытаваўшы ўрыўкі з яго ліста да знаёмай з Расіі Галіны Канстанцінавай: «... Мая звычка — паказваць жыццё з незвычайнага боку. Адсюль атрымліваецца не толькі тое, што мая краіна — краіна цудаў. Па-мойму, без адчування цуду сваёй Радзімы пісьменніка няма і быць не можа. Гэтае пачуццё ім рухае...»

— Адчуванне цуду сваёй радзімы, сваёй Айчыны, сваёй зямлі ёсць, напэўна, у кожнага, хто чытае творы Уладзіміра Сямёнавіча, — падкрэсліла Алена Сінькевіч.

Маці падтрымаў сын Уладзімір. Ён не носіць прозвішча Караткевіч (гэта нашчадкі пісьменніка па лініі яго сястры Наталлі), аднак таксама творчы чалавек — музыкант. На святкаванне юбілею славутага пісьменніка прыехаў з Германіі.

Але наўрад ці хто з тых, хто чытаў Караткевіча, скажа, што не з'яўляецца яго нашчадкам. Сапраўды, імі сталі чытачы. Людзі, якія прынялі яго думкі. Якія падзялілі яго погляд. Якія захапіліся яго цудамі.

Адам Мальдзіс, якога з Уладзімірам Сямёнавічам звязвала сяброўства, прысвяціў яму кнігу і патлумачыў назву:

— «Жыцце і ўзнясенне...» Таму што ён узнёсся над паўсядзённасцю, над нашай гісторыяй. Я ўзгадаў адзін выпадак з жыцця, калі Уладзіміру Сямёнавічу стала дрэнна, ён трапіў у рэанімацыю. Калі трошкі адпусціла, мы наведалі яго. Аказалася, што ўсё здарылася з-за фільма «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», бо начальства вырашыла змяніць назву на іншую — «Жыцце і ўзнясенне Юрася Братчыка». Тады я і сказаў, што магу брацца за кнігу з такой назвай пра яго. Я наўмысна не пісаў асабістых рэчаў, акрамя тых, што ўжо вядомыя, пра яго жаніцьбу з Валянцінай Браніславаўнай, якая спачатку не ведала беларускай мовы, але за два гады жыцця з ім вывучыла выдатна. Калі сам Валодзя не раскрываў публічна дэталі асабістага жыцця, то і мне не варта гэтага рабіць. Але пра яго ёсць што расказаць сенсацыйнае...

Караткевіч адзіны. Яго талент непаўторны, бо у ім спалучыліся багацце энцыклапедычных ведаў, пісьменніцкае пачуццё, якое дазволіла зрабіць зразумелымі і даступнымі глыбінныя сэнсы праз ліха закручаны сюжэт, цікавую інтрыгу, зразумелую кожнаму. Гэта пісьменнік на ўвесь беларускі час, які можа быць бязмежным, а можа спыніцца, калі пабіць гадзіннік.

Каб гэтага не здарылася, трэба быць Караткевічам. Па жыцці: кожны можа адчуць свае здольнасці ў нейкай справе і служыць Радзіме. Можна працаваць на любым месцы, на любой пасадзе, але з думкай пра тое, што табе дорага і што ты будзеш абараняць па-рыцарску, памятаючы пра сваю годнасць і гонар. А каб зразумець, дзе тыя цуды, якія неабходна абараняць, трэба чытаць Караткевіча.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Увесь Караткевіч?

*Найбольш поўнае 25-томнае выданне твораў пісьменніка рыхтуе выдавецтва «Мастацкая літаратура» на працягу 2011-2020 гадоў. Навуковы кіраўнік выдання даследчык **Анатоль Верабей** патлумачыў сутнасць задумы:*

— Караткевіч — гэта наш геній. Гэта мы сёння ўсведамляем. Чалавек, які стварыў мастацкі летапіс жыцця нашага народа, асэнсаваў лёс нашага народа ў кантэксце часу і гісторыі. Глыбаканацыянальны пісьменнік і адначасова агульначалавечы. Думаецца, што такой творчасцю можа ганарыцца любая высокаразвітая літаратура свету. Таму ён варты поўнага збору твораў. Але новае выданне будзе больш поўнае, чым папярэдняе. Першыя два тамы прадставяць паэзію, трэці — казкі і апавяданні, 4-5 — аповесці і легенды. Далей раманы. Асобны том — драматургія, далей 2 тамы — публіцыстыка, эсэістыка. Потым пераклады, аўтапераклады. Тры тамы сцэнары і лібрэта. Асобны том малюнкаў пісьменніка. Дзённікі, запісныя кніжкі... Адметнасць гэтага выдання ў тым, што мы плануем да першых двух тамоў паэзіі прыкласці дыск «Вершы і песні» ў выкананні Уладзіміра Караткевіча. Да публіцыстыкі — аўдыёдыск з голасам і выявай Уладзіміра Караткевіча: здымкі на камеру, выступленні ў Саюзе пісьменнікаў, на беларускім тэлебачанні.

Казкі для дарослых

ВОСТРЫЯ АДЧУВАННІ

ТОЛЬКІ без панікі! Супакойся. Запаволь хаду, распрастай плечы, выпрамі спіну. Дзе твая ўсмешка, якая абяззбройвае любага? Не хавай яе! Вось так, цудоўна... Свет клінам на ім не сышоўся.

Я іду па вячэрнім горадзе — лёгкае дэмісезоннае паліто расшпіленае на ўсе гузікі, яркі шаўковы шалік развіваецца па ветры, як сцяг маленькай, але няскоранай дзяржавы... У сумачцы, закінутай за плячо, разрываецца мабільны... Але мне ўсё роўна. Я амаль лунаю над асфальтам, ледзь дакранаючыся да яго абцасамі сваіх мадэльных туфлікаў. Я ведаю, што мяне ўжо шукаюць, і здагадваюся хто. Нічога, няхай пабегае, няхай панервуецца, як гадзіну таму нервавалася я. Няхай пабудзе ў маёй скуры...

На гадзінніку — амаль дзесяць вечара. Цікава, што ён усё ж будзе рабіць? Выкліча таксі і паедзе шукаць мяне па горадзе? Ці пачне тэлефанаваць усім маім сяброўкам запар? Ды якая розніца... На гэтую ноч я — вольная птушка, якой хочацца вострых адчуванняў, нягледзячы на штампік у пашпарце (на якім, заўважу, я абсалютна не настойвала). Мне ўсяго трыццаць з невялікім «хвосцікам». Я — прыгожая, разумная і адукаваная. І калі ён думае, што можна вось так, беспакарана, пратанцаваць увесь вечар з нейкай пігаліцай, быццам жонкі побач і няма, дык вельмі памыляецца. Я, безумоўна, не помслівая, але памяць у мяне добрая.

...Калі падняцца па гэтай вуліцы ўверх, потым звярнуць налева і прайсці яшчэ метраў дзвесце, мінаючы будынак пасольства (здаецца, чэшскага), можна патрапіць у цудоўную маленькую кавярню, яшчэ не цалкам узурпаваную малалеткамі. Я не старая буркліўка, але ўсе гэтыя дзяўчынкі-хлопчыкі з аднолькавым пірсінгам на аголеных пупках і ў вушах мяне раздражняюць.

Вось і кавярня — над уваходнымі дзвярыма павольна раскачваецца матавы ліхтар, абвіты металічным ланцужком. Адна лесвіца вядзе ўверх, другая — уніз... Ну што ж, пачнём з верхняга ўзроўню...

Мілая дзяўчына-адміністратар выходзіць з-за стойкі і праводзіць да свабоднага століка. На хаду скідваю паліто, папраўляю шалік — ледзь заўважна, непрыкметным рухам, але так, каб крыху адкрылася дэкальтэ... Адначасова, гэткім жа непрыкметным рухам, абцягваю прыталеную (вельмі прыталеную) цёмна-сінюю сукенку, якая ледзь прыкрывае калені... Але зараз жа пачынаю злавацца сама на сябе: я што, выбралася на форум манашак?.. Сцягваю шалік і хаваю ў сумку. Прымаю нязмушаную позу...

УНЕВЯЛІЧКАЙ зале душнавата, кандыцыянераў не назіраецца. Бяру са стала папяровую сурвэтку, злёгку прамакваю ёю лоб і ямачку ў тым месцы, дзе пачынаецца шыя... А вось і першы «аб'ект»...

— Дазвольце?

Ён садзіцца за мой столік раней, чым я з гэтым пагаджаюся. За лічаныя секунды паспяваю ацаніць свайго візаві і прыйсці да несуцяшальнай высновы: не, не Ален Дэлон і нават не Фернанда Торэс. Акуратна адпрасаваная кашуля і галодная туга ў вачах выдаюць у ім чалавека, даўно і безнадзейна жанатага, але схільнага да авантур (недарэмна ж я скончыла факультэт псіхалогіі!). Магу паспрачацца на што заўгодна: праз дзесяць хвілін ён пачне жаліцца на сямейнае жыццё і поўнае неразуменне з боку жонкі . Ну давай, пачынай ужо — паслухаем, паспачуваем.

Ён робіць заказ — дзвесце грамаў гарэлкі і дзве шклянкі апельсінавага соку. (Адна, трэба думаць, для мяне?) Не рэагую ніяк. Мне ўсё роўна — хоць адбіўную з мяса кракадзіла. Мне — абы хутчэй прайшоў час, бо вяртацца дадому раней, чым надыдзе раніца, я не збіраюся. Няхай пабегае, памітусіцца, пахвалюецца (гэта я пра мужа), няхай успомніць, як тры гады таму, стоячы на каленях, кляўся ў вечных пачуццях і абяцаў паводзіць сябе так, каб ніколі ў жыцці ніводная слязінка не ўпала з маіх вачэй.

— Міхаіл, — прадстаўляецца тым часам мой візаві. — Георгіевіч, — дадае ён праз некалькі секунд. Напэўна, для саліднасці.

— А я — Маша, — ілгу не міргаючы, проста гэта імя мне заўсёды падабалася.

— У мяне, Маша, складаная жыццёвая сітуацыя, — пачынае ён «з месца ў кар'ер». У гэты момант прыносяць графінчык з гарэлкай, дзве пустыя чаркі і дзве шклянкі з сокам. Адну ён адразу выпівае і следам напалову спусташае графін. Я ўся — увага і з нецярпеннем чакаю працягу.

— Справа ў тым, што я вельмі няшчасны чалавек, — ён нахіляецца так блізка, што я магу разгледзець ярлычок з памерам на каўняры яго кашулі. — У мяне безвыходная сітуацыя.

Ён зноў цягнецца за графінам, але ў працэсе перадумвае, ставіць яго назад і залпам выпівае другую шклянку соку...

— Я, Маша, заблытаўся ў дзвюх соснах, ці як там кажуць... Карацей, кахаю адразу дзвюх жанчын — жонку і... не жонку. Ці не, з жонкай я проста жыву, а без Мар'яны жыць не магу. Што рабіць?

Падумаеш, праблема... Большасць мужчын так жывуць і не замарочваюцца. А ў гэтага сумленне прачнулася...

— Выйсце толькі адно, — кажу яму на поўным «сур'ёзе». — Знайсці каго-небудзь трэцяга...

— Вы сапраўды так лічыце? — ажыўляецца ён, кліча афіцыянтку і паўтарае заказ.

КРАЕМ вока бачу, як адчыняюцца ўваходныя дзверы і ў залу ўпырхвае эльф на танюткіх ножках і ў такой кароценькай спаднічцы, што, у прынцыпе, можна было б спакойна абысціся і без яе. Акінуўшы хуткім позіркам невялікую залу (усяго сем столікаў па перыметры), эльф упэўненым крокам рушыць у наш бок, падыходзіць, абвівае Міхаіла празрыстымі ручкамі, паказальна цмокае ў шчаку і ўпэўнена апускаецца ў крэсла.

— Гэта Мар'яначка! — спяшаецца прадставіць яе Міхаіл, быццам і так не зразумела. Ну і дзякуй Богу, думаю я, утраіх усё ж весялей час бавіць. Ёй прыносяць меню, яна заказвае самую дарагую піцу і кактэйль. Сядзім, размаўляем пра надвор'е. У Міхаіла перыядычна звоніць мабільны, ён выходзіць з ім за дзверы. За гэты час Мар'яна паспявае мне расказаць, што ў шлюбе ў яго двое дзяцей, што яна таксама цяжарная, і цяпер ён наўрад ці «адкруціцца». Пры гэтым яна з апетытам, кавалак за кавалкам, паглынае піцу, заядае яе дэсертам, запівае ўсё гэта кактэйлем, і на яе тварыку не адбіваецца ніякіх эмоцый... На гадзінніку — далёка за поўнач. На імгненне ўяўляю сабе, як носіцца па пакоях (іх у нас два) мой муж, як набірае знаёмыя тэлефоны маіх сябровак... Як, падумаўшы, што я магла схавацца ў шафе ці пад ложкам, заглядвае туды і, не знайшоўшы нікога, пачынае ў шаленстве выкідаць з шафы маё адзенне... Потым садзіцца на канапу і плача, бо ўпэўнены, што я не магла проста так знікнуць, што са мной нешта здарылася...

Так табе і трэба, нягоднік... Міша і Мар'яна ўжо высвятляюць адносіны. Яна наязджае — ён маўчыць, яна зноў наязджае — ён зноў маўчыць. Я, вядома ж, не ўмешваюся. Нарэшце ён не вытрымлівае, ускоквае з месца і, перакульваючы крэслы, выбягае за дзверы. Яна — за ім... Абодва знікаюць назаўсёды — з кавярні і з майго жыцця. Праз дзесяць хвілін афіцыянтка прыносіць рахунак. «Гэта з вас і з вашых сяброў», — тлумачыць, заўважыўшы маё аслупяненне. Спрачацца з ёю ў дзве гадзіны ночы ўжо няма ні сіл, ні жадання, ні сэнсу. Разлічыўшыся па поўнай праграме (два «графінчыкі», чатыры шклянкі апельсінавага соку, піца з морапрадуктамі, два дэсерты, два кактэйлі і мая салата), без усялякай надзеі пакідаю адміністратару нумар свайго тэлефона (а раптам людзі ўспомняць, што не разлічыліся, і вернуцца?) і выклікаю таксі.

БЛІЖЭЙ да трох гадзін ночы ціхенька адчыняю дзверы сваім ключом. У прыхожай цемра — хоць вока выкалі. Уключаю святло, абыходжу кватэру — нікога, заглядваю ў ванны пакой, у шафу для адзення, пад ложак — вынік той жа... Вяртаюся ў прыхожую, раздумваючы, што рабіць далей... І тут адчыняюцца ўваходныя дзверы, і на парозе вымалёўваецца мая «палова» — узрушаная, з вясёлым тварам. Заходзіць у кватэру і раптам бачыць, што я стаю ў паліто і туфлях.

— Куды гэта ты сабралася? — пытаецца здзіўлена. — Вяселле ўжо звярнулася, госці разышліся, я быў апошнім.

Здымае плашч і акуратна вешае яго ў шафу.

— А чаму ты збегла, галава забалела ці што? Я ўжо вырашыў не надакучваць табе званкамі, падумаў: даедзеш дадому — адразу спаць ляжаш... Але калі ты ўсё роўна не спіш... Ідзі, лапуля, на кухню, пастаў чайнік. Нешта мяне сушыць пасля гэтага вяселля. Напэўна, востранькага пераеў...

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

БУДУЦЬ І ПАРКОЎКІ, І РАЗВЯЗКІ

Падчас сустрэчы з жыхарамі мікрараёна Лошыца старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька паабяцаў вуліцу з васьміпалосным рухам, рэканструкцыю ДК і забаўляльны цэнтр.

— Мы сёння прапрацоўваем пытанні аб рэканструкцыі Чэрвеньскага рынку, — заявіў спадар Ладуцька. — Мы вядзём для гэтага перамовы з сур'ёзнай замежнай кампаніяй. І на гэтым месцы разам плануем пабудаваць буйны гандлёва-забаўляльны цэнтр. А гэта значыць, што можна будзе адпачыць у сучасных умовах.

Праз 2,5 года запрацуе новы ДК АТ «Камволь». Гэта дазволіць размясціць 50-60 творчых калектываў і дасць магчымасць маладым і людзям старэйшага пакалення задаволіць патрэбы ў самавыражэнні, — лічыць Мікалай Ладуцька. — Гэта сур'ёзны праект для сталіцы. Будынку ДК АТ «Камволь» ужо 50 гадоў. Да яго ўвесь гэты час ніхто не дакранаўся. Аднак мы падлічылі, што рэканструкцыя нам па сілах. І на працягу 2,5 года ў гарадскім бюджэце радок «ДК АО «Камволь» праходзіць будзе.

— Наша задача — пабудаваць 200 тысяч парковачных месцаў у сталіцы за бліжэйшыя пяць гадоў. А 400 тысяч — да 2020 года, — адказваючы на пытанне пра паркоўкі, заявіў спадар Ладуцька.

— У 2011 годзе адкрыецца транспартная развязка па вул. Дзянісаўскай і Маякоўскага. Кошт гэтай развязкі — 70 мільярдаў рублёў, — кажа Мікалай Ладуцька. — Налета пойдуць пад знос некаторыя дамы на ўчастку ад вуліцы Дзянісаўскай да Чэрвеньскага рынку. І ў сярэдзіне 2013 года мы атрымаем сучасную вуліцу з васьміпалосным рухам і падземнымі пераходамі. А да 1 красавіка 2014 года будзе пабудавана другая транспартная развязка ў раёне Аранскай і Чэрвеньскага рынку. Ужо дадзена заданне па праектаванні Інстытуту Мінскграмадзянпраект.

Па словах спадара Ладуцькі, для гарадскога бюджэту гэты праект будзе каштаваць у сукупнасці больш за 300 млрд рублёў.

— Мы доўга ўзважвалі, ці паспеюць праекціроўшчыкі і будаўнікі, ці вытрымае гарадскі бюджэт. І прыйшлі да высновы, што зможам, — заявіў мэр горада. — Мы створым структуру, якая будзе функцыянаваць і сёння, і заўтра, і ў бліжэйшыя 50-60 гадоў.

Настасся ЗАНЬКО.

Зваротная сувязь: выніковасць

У ЧАКАННІ АЎТОБУСА

Наракаць на работу грамадскага транспарту ў Брэсце гараджане пачалі адразу, як толькі аўтобусы і тралейбусы сталі хадзіць радзей. Але транспартныя прадпрыемствы і гарадскія ўлады не прынялі належных мер. І вось падчас прамой лініі з губернатарам у канцы кастрычніка брастаўчане часта звярталіся да Канстанціна Сумара са скаргамі на недахопы ў арганізацыі перавозак.

Літаральна праз некалькі дзён старшыня аблвыканкама сабраў нараду па працы грамадскага транспарту. Гарвыканкам і транспартныя арганізацыі былі падвергнутыя жорсткай крытыцы. На нарадзе прыводзіліся лічбы, з якіх вынікала, што кожны дзень на лініі ў абласным цэнтры не выходзіць каля 15 працэнтаў гарадскіх аўтобусаў. Высветлілася, што асноўнай прычынай збояў стаў не дэфіцыт тэхнікі, а недахоп кадраў. Вадзіцелі, незадаволеныя зарплатай, сыходзяць у іншыя арганізацыі, дзе плацяць больш. Аказалася, што брэсцкія аўтобусныя перавозкі намнога болей стратныя, чым перавозкі, напрыклад, у Баранавічах, Пінску, іншых абласных цэнтрах. Яшчэ ёсць праблемы з пераразмеркаваннем даходаў паміж аўтобусным і тралейбусным паркамі. Праблем шмат, а вось ахвотных іх вырашаць было не вельмі многа... пакуль губернатар рашуча не запатрабаваў навесці парадак з пасажырскімі перавозкамі і даў на гэта два месяцы.

Як чалавек, які штодня карыстаецца грамадскім транспартам, магу сведчыць, што некаторыя перамены да лепшага адчуліся літаральна праз тыдзень пасля нарады, у прыватнасці ў мікрараёне «Кавалёва». Па-першае, на прыпынках павесілі новыя таблічкі з раскладам руху. На старыя даўно ніхто не звяртаў увагі, бо там значыліся лічбы, якія не мелі нічога агульнага з рэчаіснасцю. Ранкам аўтобусы 23-га і 15-га маршрутаў у асноўным прытрымліваюцца новага раскладу. У асноўным, таму што без збояў усё ж не абыходзіцца. Але зрухі адчувальныя. Да вышэйназванай нарады аўтар гэтых радкоў аднойчы на прыпынку «вуліца Луцкая» ў раёне 9 гадзін чакала аўтобуса прыкладна 50 хвілін. Такое, было, вядома, не заўсёды, але здаралася. Цяпер стала лепш, але ў новым раскладзе, відавочна, інтэрвал руху стаў больш працяглым. Праўда, паралельна з названымі нумарамі вельмі спраўна ходзіць камерцыйны аўтобус пад № 50. Ды ён не падыходзіць для тых, хто прывык набываць праязны білет. Таму зразумелае жаданне пасажыраў, каб транспарт хадзіў хоць бы так, як год-паўтара таму.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков для их обслуживания, которые составляют единые предметы аукциона

Организатор аукциона: Фонд «Минскоблгосимущество», г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел. (8017) 224 39 76, (8017) 500 47 10.
Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Чкалова, 5.
Дата и время проведения повторного аукциона: 29 декабря 2010 года в 16.00.

Сведения о предметах аукциона	
Лот № 1	***Начальная цена продажи объекта понижена на 50 %***
	Капитальное строение (инв. № 640/С-1080) и право заключения договора аренды земельного участка. Административное здание с гаражом общ. пл. 377 кв.м, 1966 г/п, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытие чердачное ж/б, подведены инженерные коммуникации. Составные части и принадлежности: терраса, кирпичная бойлерная, дощатая уборная, металлические калитка и ворота. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Слуцк, ул. Вечеркевича, 28, на земельном участке площадью 0,1057 га. Срок аренды земельного участка – 35 лет. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с расположением объекта в водоохранной зоне р. Случь. **Условия использования земельного участка:** разрешено победителю аукциона в установленном порядке использовать земельный участок для размещения объектов соцкультбыта или жилья.
Начальная цена предмета аукциона:	**61 635 429** белорусских рублей (в т.ч. объекты: 45 576 699, право заключения договора аренды земельного участка: 16 058 730).
Размер задатка:	**6 000 000** белорусских рублей.
Продавец (Лот № 1)**:** Республиканское унитарное предприятие «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» (г. Минск, ул. Папанина, 7, тел. (8017) 226 28 54, (801795) 5 36 20, 2 25 18). **Арендодатель земельного участка:** Слуцкий районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Слуцк, ул. Ленина, 125).	
Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» за 30.10.2009 № 206.	
Лот № 2	***Начальная цена продажи объектов понижена на 20 %***
	Недвижимое имущество, многолетние насаждения и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 614/С-21255): одноэтажное здание парника, общ. пл. 69,7 кв.м, 2003 г/п, фундамент ленточный бетонный, стены остекленные с металлическим каркасом. **Капитальное строение** (инв. № 614/С-19146): одноэтажное здание свинарника общ. пл. 685,5 кв.м, 1983 г/п, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытие чердачное ж/б, деревянное. Объекты расположены по адресу: Минская обл., Смолевичский район, д. Пекалин, на земельном участке площадью 0,7309 га. Срок аренды земельного участка – 99 лет.
Начальная цена предмета аукциона:	**60 587 028** белорусских рублей (в т.ч. объекты: 53 898 824, право заключения договора аренды земельного участка: 6 688 204).
Размер задатка:	**6 000 000** белорусских рублей.
Продавец: Учреждение образования «Академия Министерства внутренних дел Республики Беларусь» (г. Минск, пр. Машерова, 6, тел. (017) 2892145. **Арендодатель земельного участка:** Смолевичский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, 125).	
Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» за 28.11.2009 № 226, 23.04.2010 № 78.	

Расчетный счет для внесения задатка для участия в аукционе: **№ 3642900000841** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество».

Задаток для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 27 декабря 2010 года включительно**. Участник аукциона, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 310, 312, тел. (8017) 224 39 76, (8017) 500 47 10. Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **27 декабря 2010 г. до 16.00.**

Фотографии продаваемых объектов, а также информация о предмете аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома**: www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество» в разделах «Власть», «Управления и комитеты облисполкома».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Фонд «Минскоблгосимущество» вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала проведения аукциона.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным районным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка победителю аукциона (претенденту на покупку) внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (в случае предоставления рассрочки ее внесения соответствующими исполнительными комитетами – часть платы), возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, и расходы, связанные с формированием земельного участка, изменением и прекращением существования земельных участков в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельных участков; после совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, заключить в установленном порядке с Продавцом имущества договор купли-продажи недвижимого имущества, а с Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка; после заключения с райисполкомом договора аренды земельного участка в 2-месячный срок со дня даты принятия решения о передаче победителю земельного участка осуществить государственную регистрацию права на земельный участок; в случае изменения назначения недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение местного районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в сроки, установленные решениями местных районных исполнительных комитетов, и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Наименование предмета аукциона	Капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка	Здание компрессорной ЭЦ с сооружениями и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская область, Брестский район, Мотыкальский с/с, д. Чилеево	г. Брест, ул. М.Л. Мошенского, 66
Продавец недвижимого имущества	Республиканское унитарное сельскохозяйственное предприятие «Селекционно-гибридный центр «Западный» тел. (0162) 91 81 66, 91 81 32	ТРУП «Брестское отделение Белорусской железной дороги», тел. (0162) 26 02 94, 26 00 70
Сведения о предмете аукциона	Здание конюшни, 1 эт, 1985 г.п., стены – блочные, кирпичные, общая площадь 591,9 кв.м. Земельный участок площадью 0,2335 га, на всей площади имеются ограничения в использовании земель в водоохранной зоне канала Мотыкальский вне прибрежной полосы, и на площади 0,0122 га в охранной зоне воздушной линии электропередачи напряжением до 1000 вольт; срок аренды – 50 лет	Здание кирпичное, 1973 г.п., площадь – 266,4 кв. м, заборы из металлической сетки на металлических столбах и из железобетонных плит; водопроводная сеть протяженностью 35,5 м; зеленые насаждения (65 ед.). Земельный участок площадью 0,4444 га использовать для размещения объекта промышленной зоны (кроме жилья); срок аренды – 10 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб	87 489 963	313 229 904
Сумма задатка, руб.	8 748 900	31 000 000
Организатор аукциона	***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11, тел. (0162) 23 44 06, 23 12 63, 21 19 82, 20 87 85, 23 44 78 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by***	

Аукцион состоится **28 декабря 2010 года** в 15.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524.

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538, срок внесения задатка – до подачи заявления на участие в аукционе.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в порядке, определенным Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413, фонд «Брестоблимущество» в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30; прием заявлений заканчивается 28 декабря 2010 г. в 10.00.

Львам Белы Трус прынясе ў капелюшы прыемныя неспадзеўкі, а Рыбам — удачу

КОТ, ТРУС або ЗАЯЦ — якому з сімвалаў надыходнага года вы сімпатызуеце больш? — уступіць у свае правы толькі 4 лютага, але астролагі раяць падрыхтавацца да сустрэчы загадзя. Напрыклад, стварыць ва ўласным доме асаблівы камфорт, знайсці кампраміс з тымі, з кім вы пасварыліся ў год непрымірымага Тыгра, а таксама часцей бываць у сяброў у гасцях ці запрашаць іх да сябе. Ды ўвогуле не пашкодзіць ведаць, каму чаго чакаць ад белага і пушыстага гаспадара 2011 года.

АВЕН

Асноўнай праблемай у гэтым годзе для вас стане выбар паміж духоўным і матэрыяльным — напрыклад, наладжваннем асабістага жыцця і прасоўваннем па службе. Уседзець адначасова на двух крэслах не ўдасца, аднак калі вы зробіце правільны выбар, то дасягнеце поспеху ва ўсіх справах — не паралельна, а паслядоўна. Прытым год выразна падзеліцца на дзве часткі: прыкладна да лета — рух наперад і ўверх, а з пачатку восені — нечаканае тармажэнне, непрадбачаныя цяжкасці і г.д. Пастаўцеся да іх спакойна і цярпліва, кіруйце сваімі эмоцыямі і ў выніку абавязкова выйдзеце пераможцам.

Сімвал 2011 года для вас — Трус у белых пальчатках, гэткі арыстакрат. Ідучы за ім, вы будзеце такім жа высакародным, белым і незаплямленым, шчырым найперш з самім сабой, а таксама з дарагімі для вас людзьмі. Менавіта яны будуць вашай асноўнай апорай і дапамогуць прайсці ўсе выпрабаванні. Дарэчы, у многіх з вас у 2011 годзе верагодна прыбаўленне ў сям'і. У першай палове года вы больш камфортна будзеце сябе адчуваць у родных сценах, а пазней магчымыя далёкія паездкі, камандзіроўкі, набыццё нерухомасці ў іншых рэгіёнах і нават краінах. Калі прайсці ўсе гэтыя дарогі вам хопіць сіл і натхнення, то напрыканцы года высілкі будуць узнагароджаныя — кар'ерным ростам або заўважным прыбыткам. Аднак не перашчыруйце, каб не захварэць, — лепш напярэдадні наступнага Новага года падарыце сабе вясёлыя агульнасямейныя канікулы.

ЦЯЛЕЦ

Для вас надыходзіць час прызнання за мінулыя поспехі, пабудовы новых планаў, пошуку сваёй нішы і кардынальных перамен — скажам, месца жыхарства. Пры рэалізацыі сваіх смелых задум смела разлічвайце на сяброўскую дапамогу. Выключэннем з гэтай прыемнай тэндэнцыі стане хіба што люты, калі ў вашым коле стасункаў могуць з'явіцца лжэпрыяцелі, якія паспрабуюць выкарыстаць вас, вашу маёмасць і грошы ва ўласных інтарэсах і нанесці немалую шкоду. Так што ў гэты час давярайце, але пераправярайце. Лепш нават некалькі разоў, каб не апынуцца ў стане падвопытнага труса. Цягам года верагодна ўзнікненне пэўных праблем са здароўем. Менавіта таму вам неабходна перагледзець сістэму каштоўнасцяў і пачаць цаніць сілу простых рэчаў, а таксама чалавечай міласэрнасці.

Другая палова года прынясе поспехі, і хоць справы будуць вымагаць стапрацэнтнай аддачы, але затое, дзякуючы ўласнаму працалюбству і мэтанакіраванасці, вы маеце выдатныя шанцы кар'ернага і асобаснага росту. Пры гэтым удача будзе ісці поруч са спакусай, і толькі цяпер вы здолееце нарэшце зразумець і вытлумачыць паводзіны людзей, якіх раней асуджалі.

БЛІЗНЯТЫ

Надыходзіць канец перыяду «я сам» — поспех для вас цяпер абумоўлены калектыўнай працай, датычыцца гэта спраў службовых або сямейных. Вы пазнаёміцеся — цалкам верагодна, праз перапіску ці сацыяльныя сеткі — з цікавымі і моцнымі асобамі, некаторыя з якіх пазней могуць стаць найлепшымі і вернымі сябрамі.

У планах на далёкую будучыню патрэбная карэкціроўка: бярыце прыклад з песеннага «баязліўца зайкі шэранькага», для вас у 2011 годзе лепш перастрахавацца, чым рызыкнуць і згадзіцца на сумніўную ідэю, прынамсі ў першай палове года. Каб абысці канкурэнтаў, трэба пазбягаць эксцэнтрычнасці і перанапружання, нетаропка запрагаць — а напачатку мая імкліва стартаваць і тут ужо бегчы ва ўвесь апор, пакуль вы ў выдатным творчым тонусе. Летам верагодна мноства новых знаёмстваў і паездак, прычым часта не вы будзеце выбіраць шлях, а ён — вас, і супраціўляцца гэтаму ціску абставін не варта, бо ўсё нарэшце павернецца да лепшага. Дарэчы, на тыя шляхі і дарожкі таксама можа занесці кагосьці з людзей вашага мінулага. Калі ў стасунках з імі вы праявіце мудрасць, то ўдасца нарэшце вырашыць пытанні, якія даўно стаялі рабром.

РАК

Год гарантуе Ракам, якія працуюць, жаданыя змены ў руху па службовай лесвіцы. У гэты час будзе даволі цяжка зарыентавацца, у які бок вам належыць ісці; у выбары накірунку дапаможа інтуіцыя і вера ў свае сілы. Тым больш, кіраўніцтва гатова будзе прадаставіць вам нядрэнныя авансы на будучыню — але памятайце, што іх рана ці позна давядзецца апраўдваць.

У адрозненне ад Блізнят, вам супрацьпаказана доўга разважаць і тым больш даваць задні ход, калі гаворка датычыцца важных рашэнняў — пераезду, змены сямейнага статусу, дзелавых рызыкаў і г.д. Лёс дасць вам, верагодна, той найлепшы шанц, які выпадае раз у жыцці, так што хапайце яго і не выпускайце, інакш цягнік пройдзе міма!

Напрыканцы вясны — на пачатку лета будзьце пільныя: чакаецца некалькі перыядаў павышанай аварыйнасці, што называецца, на пустым месцы. Магчымы таксама зрыў планаў, таму адпачынак варта перанесці на восень ці нават зіму, калі вам якраз спатрэбіцца перапынак у напружанай будоўлі кар'еры. Напрыканцы года падзеі вакол вас будуць падпарадкаваныя закону выпадковасцяў, але вас гэта палохаць не павінна: усё ўрэшце складзецца спрыяльна, як для казачнага Ката ў ботах.

ЛЕЎ

Вы гатовыя да неверагодных перамен як у асабістым жыцці, так і ў працоўнай сферы? Незалежна ад адказу, гэтыя змены адбудуцца ўжо на пачатку года і, магчыма, здадуцца вам не вельмі прыемнымі. Але праявіце цярпенне, і ўсе страты абернуцца знаходкамі ці прынцыпова новымі магчымасцямі. Не спяшайцеся грашыць і ўвогуле ісці на здзелкі з сумленнем, бо ўсё зробленае неўзабаве стане відавочным. Затое бескарыслівасць і гатоўнасць дапамагчы навакольным па першым клічы не толькі падвысяць ваша рэнамэ, але і прынясуць прыемныя жыццёвыя неспадзеўкі.

Найбольш складаным перыядам для вас будзе зімовы — пачатак і канец года, калі вы зразумееце, што не кантралюеце сітуацыю. Давядзецца больш рацыянальна падысці да пытанняў заробку і выдаткаў, каб забяспечыць сабе пэўную фінансавую незалежнасць. Скарыстайце гэты час для атрымання новых ведаў — у наступныя некалькі гадоў гэта прынясе адчувальны плён. Затое лета пройдзе пад станоўчым зорным уплывам, а народжаных у сярэдзіне жніўня чакае росквіт пачуццяў і важныя змены ў асабістым жыцці.

ДЗЕВА

Для вас гэты год — час пераацэнкі каштоўнасцяў і перабудовы ўсяго таго, што вы прызвычаіліся лічыць фундаментам. Вядучая роля будзе належаць сям'і, і толькі потым — дзелавым стасункам. У першай палове года зоркі раяць проста падладжвацца пад зменлівыя акалічнасці, а ўжо летам пакрысе пачынаць мяняць свет пад сябе. У гэты час вы станеце надзейнай апорай, нават духоўным лідарам для іншых людзей і шмат у чым будзеце задаваць тон. Давядзецца адпавядаць чаканням і пастарацца быць бездакорна бялюткім, суцэльна мяккім і пушыстым, бы ангорскі кот. Зрэшты, высілкі таго вартыя — усе падзеі, якія адбудуцца ў вашым жыцці ў другой палове года, у пэўнай ступені будуць уплываць на ваша жыццё і ў наступныя восем гадоў.

Восень для вас апынецца самым прыемным перыядам: заслугі будуць прызнаныя, бягучыя справы і планы ўдасца рэалізаваць на сто адсоткаў, магчымыя буйныя пакупкі, паспяховыя паездкі і перамовы. Трэба паспрабаваць паспець зрабіць усё задуманае і пры гэтым не забывацца на здароўе, бо стома нападзе раптоўна і нечакана, але надоўга — таму напрыканцы года дазвольце сабе разняволіцца і адпачыць як след. Вясёлыя кампаніі, шматлікія сямейныя святы і забаўляльныя мерапрыемствы падораць вам мора пазітыву, якога хопіць надоўга, як усмешкі Чэшырскага ката.

ШАЛІ

Калі б вы былі Трусам, то ўдава, які пажадаў вас з'есці, чакаў бы непрыемны сюрпрыз: драпежны Трус, які можа даць здачы і нават завязаць крыўдзіцеля марскім вузлом. Разнастайныя экстрэмальныя сітуацыі, якія падсцерагаюць вас у жыцці, вы пераадолееце паспяхова, лёгка і зграбна, на зайздрасць навакольным. Але толькі ў тым выпадку, калі не спадзявацца на дапамогу звонку, а зрабіць усё самому. Узнагародай можа стаць павышэнне пасады і/ці заробку, і няхай зайздроснікі хоць пазелянеюць, але ў іх падкопы вы не патрапіце.

Увогуле, на працягу года вялікае задавальненне прынясуць вам заняткі, наўпрост звязаныя з рызыкай і экстрымам. Даўно марылі скочыць з парашутам, ды ўсё ніяк не вырашаліся? Час наспеў! І толькі ў адным вам неабходна праяўляць звышасцярожнасць — у паездках, асабліва далёкіх і па незнаёмых маршрутах (найбольш небяспечнымі ў гэтым сэнсе будуць лістапад і снежань). Затое напрыканцы года зялёнае святло загарыцца для вас на дарозе кахання і стасункаў з блізкімі людзьмі.

СКАРПІЁН

Наступны год будзе для вас даволі неадназначным. Першая яго палова прынясе шмат гаспадарчых клопатаў, разбіральніцтваў у сямейных справах, затое працаваць вам будзе лёгка. Дывідэнды таксама не прымусяць сябе чакаць. З другога боку, летам і ўвосень праца стане крыніцай раздражнення і стрэсаў, але тут ужо родныя вернуць вам той клопат і дапамогу, якія раней мусілі здзяйсняць вы. А вось з сябрамі гэты год можа абысціся жорстка, вельмі верагодная страта блізкага чалавека, і зусім не з-за памылак сённяшняга дня. Усе прычыны крыюцца ў мінулым, праналізуйце яго як след, калі не хочаце згубіць яшчэ нешта важнае.

Вандраванні, паездкі — ваша ўсё сёлета. Менавіта ў дарозе атрымаецца лепш за ўсё адпачыць ад праблем і прыдумаць выйсце. Аднак, калі фартуна ўпарта перашкаджае нейкаму падарожжу, не спрачайцеся: яна мае рацыю, а вы не. Напрыканцы года вашым сімвалам стане кот вучоны; хадзіць па ланцугу і расказваць казкі не абавязкова, але варта заняцца самаўдасканаленнем, атрыманнем дадатковай адукацыі і ўвогуле новых ведаў і ўменняў, ад слясарнай справы да ірландскіх танцаў. У бліжэйшыя два-тры гады набыты досвед вам абавязкова спатрэбіцца і прынясе карысць.

СТРАЛЕЦ

Гараскоп на 2011 год абвяшчае: «Лёс сёлета будзе стала сачыць за вамі, як паляўнічы, які выглядвае здабычу». Выйсце напрамую падказвае сімвал года Трус: калі не хочаце, каб вас з'елі — бяжыце хутка, а галоўнае, будзьце гатовыя пятляць і манеўраваць. Хуткасць рэакцыі не раз выручыць вас на працягу года, большасць падзей якога маюць кармічнае значэнне і адаб'юцца на вашай будучыні. Памятайце: вы, і ніхто іншы — каваль свайго шчасця. Год пацешыць вас выдатнымі адносінамі з дзецьмі, але не забывайцеся, што за імі патрэбна вока ды вока. Калі прымерыць гэтую пазіцыю з адваротнага боку, то і стасункі з бацькамі, і ўвогуле са старэйшым пакаленнем, палепшацца. Пачынаючы з летняга перыяду, у працы і ў калектыве магчымыя розныя перастановы і змены. Лавіце момант — для вас гэта амаль дакладна рух наверх! На працягу года многія тыповыя прадстаўнікі знака могуць усур'ёз зацікавіцца містыкай, эзатэрыкай, пытаннямі рэлігіі і філасофіі. Галоўнае — не занырнуць у гэтыя плыні празмерна глыбока, каб не нашкодзіць уласнаму здароўю і стасункам з блізкімі. Снежань і студзень — гэта месяцы, калі вы знаходзіцеся ў цэнтры ўвагі, да вашых слоў прыслухоўваюцца, а дзеянні ўхваляюць. Калі і вы, у сваю чаргу, пачняце прыслухоўвацца не толькі да хору ліслівцаў, то атрымаецца эканоміць немалыя грошы і пазбегнуць непатрэбных марнаванняў.

КАЗЯРОГ

У наступным годзе вам, як ніколі, спатрэбіцца ўменне настаяць на сваім, каб дасягнуць даўно жаданай мэты. Толькі памятайце, што Кот па прыродзе — дыпламат, адкрытых супрацьстаянняў ён не любіць, таму пастарайцеся абысціся без «упірання рогам» і аголеных штыкоў. На вашых сцягах вялізнымі літарамі мусіць быць напісана слова «кампраміс».

Зімой і ўвесну першаснымі для вас стануць жыллёвыя пытанні — магчыма, набыццё нерухомасці, рамонт, раз'езд ці, наадварот, злёт некалькіх пакаленняў у агульнае сямейнае гняздо. Дарэчы, у гэтым гняздзе вельмі верагодная прыбаўка, а то і не адна. Не хвалюйцеся ў сувязі з гэтым: асабістай прасторы і ўтульных куткоў у вашым доме хопіць кожнаму, у тым ліку і сябрам, якія будуць актыўна наведваць гэты гасцінны дом. Між іншым, з гэтых візітаў можа распачацца новая справа — бізнэс, вялікае падарожжа ці сумеснае навучанне. Ад умення працаваць у камандзе наўпрост будзе залежаць не толькі вынік, але і ваш псіхалагічны камфорт, адпаведна — і здароўе ў цэлым. Калі блізкія прапануюць зняць з вас частку абавязкаў — прыміце гэту дапамогу з удзячнасцю: напрацавацца на агульную карысць вы паспееце восенню і на пачатку зімы. Толькі не адкладвайце важныя справы на самы канец года. Снежань больш прыдатны для падвядзення вынікаў і будоўлі ідэальных планаў на наступны год. Калі ж нейкіх мэт дасягнуць так і не атрымаецца, падумайце: можа, вы проста не туды прыклалі сілы і варта змяніць арыенціры?

ВАДАЛЕЙ

Год будзе насычаны пераменамі, кантактамі з новымі людзьмі і вашай унутранай мітуснёй паміж фінансамі і рамансамі. Калі сімвалам на гэты перыяд вы абераце для сябе сакавіцкага ката — што ж, шэраг вельмі рамантычных падзей вам забяспечаны. Толькі выбачайце: пад'есці не будзе чаго. Калі ж вам удасца крыху прыглушыць сваю прыродную летуценнасць і ўключыць прагматыка — дык вы горы звернеце, у тым ліку і залатыя! Вашы свежыя, нестандартныя рашэнні і творчы падыход да працы ўразяць навакольных і прывядуць да росту як аўтарытэту, так і банкаўскага рахунку.

У лютым вы будзеце здатныя зрабіць або грандыёзны рывок наперад, або сур'ёзную памылку. Лепшым дарадцам у гэтай сітуацыі будуць не свякі і калегі, а толькі ўласны жыццёвы вопыт і шостае пачуццё. Асаблівую ўвагу праявіце ў сярэдзіне года: у гэты час беражыце свой дом і сям'ю ад нянрошанага госця, які паспрабуе разбурыць ваш утульны мікрасвет, зрэшты магчыма, што не знарок. Затое канец года абяцае заспакаенне і, нарэшце, доўгачаканую стабільнасць у той сферы, якая хвалюе вас больш за ўсё.

Для адпачынку найлепш скарыстаць жнівень—верасень, каб потым з новымі сіламі прыступіць да рэформаў і перастановак у існуючай сістэме. Пры гэтым блізкім часта давядзецца тлумачыць кожны свой крок. Запасіцеся цярпеннем, не крыўдуйце на іх і не сумнявайцеся ў правільнасці ўласных дзеянняў.

РЫБЫ

Зоркі сцвярджаюць, што год наканаваны проста цудоўны: каго-каго, а вас Кот распесціць удачлівасцю ды шанцаваннем. Калі вы і трапіце на чыюсьці вудачку, то, хутчэй за ўсё, гэта будзе лёгкі спалох ці нават ілжывая трывога. Самы час развітацца з непатрэбнымі рэчамі, сувязямі і справамі, якія толькі абцяжарваюць ваша жыццё і не прыносяць ні карысці, ні маральнага задавальнення. Смела вызваляйце месца ў доме і ў сэрцы для новых набыткаў і ўражанняў. Калі вам даўно карцела зрабіць нешта грандыёзнае — пачынайце, далей само пойдзе.

У працы і кар'ерным росце толькі пазітыў, вас невымоўна пацешыць фінансавае становішча, ды і здароўе будзе выдатным, што дапаможа рухацца наперад, не звяртаючы ўвагі на любыя перыпетыі. Вельмі верагодны і шлюб сёлета, не прапусціце свой шанец. Канец года можа прынесці нечаканае, але прыемнае падвышэнне на службе. Колькі б непрыемнасцяў не жадаў падсунуць вам будучы год, вы можаце з лёгкасцю са ўсім сладзіцца, досыць толькі выявіць сябе. Будзьце ўпэўненыя ў сваіх сілах , чакайце падарункаў лёсу, і нікуды яны ад вас не дзенуцца. Перамены да лепшага вам абяцаныя ва ўсім, галоўнае — не страціць за гэтым сябе.

Народжаныя ў 2011-м...

АВЕН: Дзікі Кот. Не любіць і не ўмее падмазвацца, ліслівіць, даваць хабар.

ЦЯЛЕЦ: Далікатны Кот — альбо дэкаратыўны Трус, хто вам больш даспадобы. Не выпускае кіпцюроў, але і свайго з мяккіх лап не выпусціць.

БЛІЗНЯТЫ: Спакойны, дамашні Кот, пазбаўлены агрэсіі. Усеагульны ўлюбёнец.

РАК: Чароўны, але трохі спешчаны Кот, які з найбольшай ахвотай робіць тое, што нічога не робіць і атрымлівае асалоду ад жыцця.

ЛЕЎ: Кот, які любіць то прыкінуцца драпежнікам, то плюшавай цацкай. Непрадказальны, чым і вылучаецца ў шэрагу іншых Катоў.

ДЗЕВА: Мудры Кот, які ўмее цягаць каштаны з агню і не абпаліць вусоў.

ШАЛІ: Кот-меланхолік, схільны да летуценнасці. Умее прывабіць усіх і кожнага.

СКАРПІЁН: Кот, які гуляе сам па сабе.

СТРАЛЕЦ: Зусім не Кот, а тыповы Трус — ураўнаважаны, абаяльны і трохі баязлівы.

КАЗЯРОГ: Тужлівы Кот. Можа быць вельмі строгім. Не надта таварыскі.

ВАДАЛЕЙ: Здольны Кот. Верны ў сяброўстве. Можа валодаць літаратурным талентам.

РЫБЫ: Канцэнтруюць у сабе ўсе выбітныя і адмоўныя рысы Ката. Здольныя дамагчыся поспеху ў грамадстве.

Усё ж Трус ці Кот?

Ці нават Заяц? Каму прысудзіць першынства ў вызначэнні года? Японцы аддаюць перавагу Трусу, у Кітаі, В'етнаме і Камбоджы гаспадаром года лічаць Ката.

А ўвогуле, паводле легенды, якая вядома з трэцяга тысячагоддзя да нашай эры, дакладнасці ў гэтым пытанні няма са старажытных часоў. «Аднойчы Буда запрасіў да сябе ўсіх жывёл, якія толькі захочуць прыйсці. Кожнаму з гасцей у парадку жывой чаргі Буда падарыў па адным годзе кіравання. Першым быў Пацук — яму дастаўся першы год дванаццацігадовага цыкла, як узнагарода за аператыўнасць і ўменне карыстацца акалічнасцямі. Бык апынуўся ў чарзе другім, ледзь-ледзь ад яго адстаў Тыгр, якому дастаўся трэці год. Заўзятары, захопленыя спаборніцтвам паміж Быком і Тыграм, так і не разгледзелі, хто прыйшоў чацвёртым — Кот, Заяц або Трус». З таго часу, кажуць, паміж гэтай тройцай існуе супернiцтва, і ў дзікай прыродзе кот зусім не супраць паганяць трусаў ці зайцоў, каб давесці, хто насамрэч у годзе гаспадар...

Якім быў папярэдні год Труса?

Усходні гараскоп заснаваны на 12-гадовым каляндарным цыкле, дзе міфалагічныя жывёлы змяняюць адна адну. Цалкам жа, г.зн. з супадзеннем не толькі жывёлы, але і базавага элемента і ягонага колеру — Агню (Чырвоны), Металу (Белы), Дрэва (Зялёны), Зямлі (Жоўты) і Вады (Сіні) — цыкл паўтараецца праз 60 гадоў. Дарэчы, вызначыць сваю стыхію, калі вы яе дакладна не ведаеце, можна па апошняй лічбе свайго года нараджэння: 0 ці 1 — Метал, 2 ці 3 — Вада, 4 ці 5 — Дрэва, 6 ці 7 — Агонь, 8 ці 9 — Зямля.

Папярэдні год Труса — 1999-ты — нягледзячы на міралюбны характар свайго гаспадара, быў далёка не спакойным: вайна ў Югаславіі, буйныя тэракты ў Расіі, датэрміновая адстаўка Ельцына; у Беларусі — трагедыя на Нямізе... Зрэшты, год запомніўся і мірнымі падзеямі: дэнамінацыя (памятаеце купюру ў 5 мільёнаў?) і перапіс насельніцтва, першае чэмпіёнства БАТЭ.

Падрыхтавала Вікторыя ЗАХАРАВА.

ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

НЯДЗЕЛЯ, 28 лістапада

Няхай рухаючай сілай лепш будзе ваш уласны альтруізм, чым нечае кумаўство. Нефармальная сустрэча можа змяніць найбліжэйшую будучыню ў лепшы бок.

ПАНЯДЗЕЛАК, 29 лістапада

Вы цалкам заслужылі права атрымаць пэўную ўзнагароду за працу, пра што нялішне будзе тактоўна нагадаць. Інтуіцыя падкажа, як лепш распарадзіцца грашыма.

АЎТОРАК, 30 лістапада

Выберыце прыярытэтныя кірункі. Можна дамаўляцца пра будучае супрацоўніцтва. Гэта адкрые новыя гарызонты. Беражыце свой кашалёк.

СЕРАДА, 1 снежня

Давядзецца пайсці на некаторыя ахвяры, затое ў далейшым цяперашнія дзеянні прынясуць вельмі карысны плён. Пажадана рэальна ацэньваць свае фінансавыя магчымасці. Не час для вялікіх расходаў. Можна рабіць толькі дробныя пакупкі.

ЧАЦВЕР, 2 снежня

Будзьце ўважлівыя да таго, што вам будуць гаварыць сёння, але не абмяжоўвайцеся толькі сэнсам сказаных слоў. Многае давядзецца разумець па інтанацыі і, магчыма, міміцы.

ПЯТНІЦА, 3 снежня

Можаце апынуцца ў цэнтры вельмі пільнай увагі навакольных. Кожны ўчынак павінен быць усвядомленым. Пры гэтым пажадана пазбягаць шматлюдных месцаў і занадта шумных забаў.

СУБОТА, 4 снежня

Паспрабуйце завяршыць усе неадкладныя справы. Будзьце гатовыя сустрэцца з новымі ідэямі. А вось роля першай скрыпкі вам належыць не будзе. Не варта за яе змагацца — вы толькі сапсуяце сабе рэпутацыю.

Дзед Ілы Лагуценкі з Магілёва

Перад канцэртам у Мінску лідар расійскага гурта «Мумій Троль» Ілья Лагуценка распавёў пра свае беларускія карані:

— Мяне часта пытаюць: у вас украінскае прозвішча? Мой дзядуля нарадзіўся ў Магілёве. Потым ён пераехаў у Маскву і паступіў у архітэктурны інстытут. Затым працаваў пад кіраўніцтвам Шчусева — таго самага архітэктара, які маўзалей Леніна будаваў. Дзед зрабіў галавакружную кар'еру, стварыўшы праект дамоў «К-7» — вядомых «хрушчовак».

— А вам самому ў дзедаўскіх «хрушчах» даводзілася жыць?

— Безумоўна! Я лічу, што гэта было дзіўнае рацыянальнае архітэктурнае рашэнне для таго часу, для той краіны, якой быў Савецкі Саюз. Дзеду было дадзена дакладнае тэхнічнае заданне: краіне трэба было рассяліць людзей з «камуналак» з разлікам на 20 гадоў жыцця, зрабіць эканамічнае жыллё. Я лічу, што мой дзед справіўся з пастаўленай задачай на ўсе сто.

— Ваш новы альбом называецца «Рэдкія землі» — так, як і раман Васіля Аксёнава. Гэта выпадковае супадзенне?

— Не. Мой тата добра ведаў Аксёнава. Гэта была адна кампанія творчых людзей. Па супадзенні абставін мая мама хадзіла з Аксёнавым у адну і тую ж школу ў Магадане, праўда, у іншы час. Я пачаў сваю творчасць з сімвалаў і працягваю гэтую лінію. Я лічу, што нічога не адбываецца ў свеце проста так, няма выпадковых супадзенняў. Ёсць сувязі. Мне заўсёды падабаўся гэты раман Аксёнава, адзін з яго апошніх. Калі я яго прачытаў, то зразумеў, што ён апелюе тымі ж фантазіямі і гумарам, што і я. Напрыклад, назва альбома «Дакладна Ртуць Алоэ» — мая зашыфраваная назва аксёнаўскай «Чырвонай ртуці», вельмі рэдкага міфалагічнага металу...

Настасся КАСЦЮКОВІЧ.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Оборудование	**Оборудование**
Начальная цена продажи	113 475 000 белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	7 943 250 белорусских рублей без учета НДС
ЛОТ 2	
Капитальное строение с инвентарным номером 401/С-18567	**Мастерская с бытовыми помещениями** литер В 2/к, 1986 г.п., фундаменты сборные железобетонные, стены кирпичные, перекрытия ж/б, кровля совмещенная рулонная, отопление, водопровод, канализация, горячее водоснабжение, телефон, электроосвещение, строительный объем 6620 м.куб., общая площадь 998,8 м.кв. **Холодная пристройка** литер 1, 1986 г.п., фундаменты бетонные, стены блочные, перекрытия деревянные, кровля – шифер.
Начальная цена продажи	321 595 473 белорусских рубля без учета НДС
Сумма задатка	22 511 683 белорусских рубля без учета НДС
ЛОТ 3	
Капитальное строение с инвентарным номером 401/С-18563	**Контора** литер Е2/к, 1960 г.п., фундамент бутобетонный, стены кирпичные, облиц. плиткой, оштукатурены, перекрытия – ж/б плиты, деревянные, кровля – шифер, полы дощатые, строительный объем 949 м.куб., общая площадь 207,4 м.кв.; **Тамбур** литер 1, 1960 г.п., фундамент бутобетонный, стены кирпичные оштукатуренные, перекрытия деревянные, кровля – шифер, полы бетонные
Начальная цена продажи	144 066 157 белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	10 084 631 белорусский рубль без учета НДС
ЛОТ 4	
Капитальное строение с инвентарным номером 401/С-18566	**Гараж** литер Г1/к, 1955 г.п., фундамент сборный ж/б, стены кирпичные, перекрытия деревянные, кровля – шифер, полы – плитка, бетон. **Склад** литер С2/к, 1955 г.п., фундамент бетонный, стены блочные, перекрытия: 1 этаж – ж/б, 2 этаж – деревянные, кровля – шифер, полы бетонные. **Тамбур** литер 1, 1955 г.п., фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытия деревянные, кровля – шифер, полы бетонные. Строительный объем 6304 м.куб., общая площадь 1343,1 м.кв.
Начальная цена продажи	326 573 557 белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	22 860 149 белорусских рублей без учета НДС
ЛОТ 5	
Капитальное строение с инвентарным номером 401/С-18568	**Проходная-диспетчерская**, основное, литер А1/к, 1958 г.п., фундаменты бутобетонные, стены кирпичные, облицованные плиткой, перекрытия деревянные оштукатуренные, кровля 2-скатная шиферная, полы дощатые, плитка. **Навес (проходная со смотровой ямой)**, литер 1, 1958 г.п., металлические столбы, открыт со всех сторон кровля – шифер, полы бетонные. **Навес (велостоянка)**, литер 2, 1958 г.п., металлические столбы, открыт со всех сторон, кровля – шифер, полы бетонные. Строительный объем 405 м.куб., общая площадь 113,7 м.кв.
Капитальное строение с инвентарным номером 401/С-18565	**Профилакторий**, литер П1/к, 1964 г.п., фундаменты бетонные, стены кирпичные оштукатуренные, перекрытия – ж/б плиты, кровля шиферная, полы бетонные, строительный объем 1817 м.куб., общая площадь 338,2 м.кв.
Капитальное строение с инвентарным номером 401/С-18564	**Мойка для автомашин**, литер Б1/к, 1971 г.п., фундаменты бетонные, стены кирпичные оштукатуренные, 17 % облицованы плиткой, перекрытия ж/б, кровля совмещенная, полы бетонные, строительный объем 1455 м.куб., общая площадь 272,8 м.кв.
Начальная цена продажи	292 867 090 белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	20 500 696 белорусских рублей без учета НДС
ЛОТ 6	
Капитальное строение с инвентарным номером 401/С-18570	**Здание нежилое (душевая)**, литер Д1/к, 1960 г.п., фундамент бутобетонный, стены кирпичные, перекрытия – ж/б плиты, кровля рулонная совмещенная, полы плитка, дощатые, бетонные, строительный объем 1159 м.куб. **Сени**, литер 1, 1960 г.п., фундамент бутобетонный, стены кирпичные, перекрытия деревянные, кровля – асбестоцементные листы, полы бетонные, строительный объем 12 м.куб. **Навес**, литер 2, 1986 г.п., фундамент бетонный, металлические столбы, кровля асбестоцементные листы, площадь пола 45 м.кв.; **Здание теплоузла**, литер А1/к, 1960 г.п., фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытия деревянные, кровля – шифер, полы бетонные, строительный объем 20 м.куб.; **Теневой навес**, литер 1, металлические столбы, открыт со всех сторон, кровля – шифер, полы бетонные, площадь пола 7 м.кв.
Начальная цена продажи	111 563 247 белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	7 809 427 белорусских рублей без учета НДС
ЛОТ 7	
Инженерные сети и элементы благоустройства	Покрытие цементнобетонное, покрытие асфальтобетонное, пешеходный тротуар с ж/д бордюром, газон, очистительные сооружения, установка ОК-308 (мачта освещения), ограждение кирпичное, ограждение железобетонное, ограждение металлическое с металлическими воротами с электроприводом, ворота металлические, линия электропередач 0,4 кВ, тепловая сеть, сеть бытовой канализации, водопроводная сеть стальная, водопроводная сеть чугунная с пожарным гидрантом и колодцем под него
Начальная цена продажи	184 725 844 белорусских рубля без учета НДС
Сумма задатка	12 930 809 белорусских рублей без учета НДС
ЛОТ 8	
Здание пультовой ГСМ	**Здание пультовой ГСМ**, одноэтажное здание, 1963 г.п., стены кирпичные, электроосвещение – открытая проводка, отделка – штукатурка, побелка, полы бетонные, площадь застройки 28 м.кв., строительный объем 99 м.куб., общая площадь 19,4 м.кв.
Насосная	**Насосная**, одноэтажное здание, 1963 г.п., стены кирпичные, электроосвещение – открытая проводка, отделка – побелка, полы бетонные, площадь застройки 31 м.кв., строительный объем 87 м.куб., общая площадь 18,7 м.кв.
Устройство молниезащиты АЗС	Устройство молниезащиты АЗС
Начальная цена продажи	29 630 843 белорусских рубля без учета НДС
Сумма задатка	2 074 159 белорусских рублей без учета НДС
Местонахождение объектов	г. Скидель, ул. Мичурина, 34 В
Земельный участок	Кадастровый номер 422050400002002270, площадь 1,4000 га, назначение – для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений
Продавец	Филиал «Грузовой автомобильный парк № 2 г. Гродно» Открытого акционерного общества «Гроднооблавтотранс», 230001, г. Гродно, ул. Пучкова, 28, тел./факс 52 42 20, тел. 52 32 35
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41 98 32, 41 98 34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012286350011 отделение № 201 г. Гродно ГФ по Гродненской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 152101705, УНП 500833225

Аукцион состоится 30 декабря 2010 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209

К участию в аукционе допускаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.
Последний день приема заявлений – 29 декабря 2010 г. до 15.00.

Телефоны для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион по продаже объекта государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества состоится 28 декабря 2010 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб 227, конт. тел. (8017) 200 20 89.

НА ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ВЫСТАВЛЯЕТСЯ:

Предмет открытого аукциона	Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 500/U-48358 и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания
Место нахождения недвижимого имущества	г. Минск, ул. Павловского, д. 58, военный городок № 220 «Сосны» в г. Минске
Начальная цена предмета открытого аукциона, рублей	2 998 468 632 белорусских рубля (в том числе: недвижимое имущество – 2 920 884 125 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 77 584 507 белорусских рублей)
Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета	299 847 000 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в аукционе, путем внесения на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества
Продавец недвижимого имущества	ГУ «Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», 220031, г. Минск, ул. Основателей, 24, конт. тел. (8 017) 266 84 55
Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества и срок его аренды	Общая площадь – 0,1478 га, кадастровый номер земельного участка – 500000000002005958, срок аренды – 5 лет
Арендодатель земельного участка	Минский городской исполнительный комитет
Характеристика недвижимого имущества	Ориентировочная площадь – 6400,2 кв.м, количество этажей – 6; строительство начато в 1990 году; стены кирпичные, панели – железобетонные, перекрытия – железобетонные плиты, перегородки – железобетонные, частично – кирпичные; готовность строения на 01.01.2010 – 44 %.
Условия использования недвижимого имущества	В соответствии с проектным решением градостроительного проекта детального планирования
Условия использования земельного участка	В соответствии с утвержденной градостроительной документацией – для дальнейшего использования объекта под общественные объекты для обслуживания населения социального, культурно-бытового, торгового назначения и учреждения здравоохранения, а также под административно-деловые объекты и научно-образовательные учреждения

Порядок проведения открытого аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

К участию в открытом аукционе допускаются: граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей, и лица без гражданства), представившие Организатору аукциона в сроки, указанные в извещении на участие в открытом аукционе, следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка в белорусских рублях на расчетный счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителям заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в открытом аукционе заявитель (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения. Объект может быть снят с торгов по решению Продавца, Организатора аукциона, аукционной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

Заявления на участие в открытом аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 27 декабря 2010 года включительно.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Минский горисполком в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона по продаже предмета аукциона принимает решение о предоставлении земельного участка победителю аукциона (претенденту на покупку). Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер, порядок и сроки возмещения затрат доводятся до сведения участников до начала проведения аукциона.

Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение одного рабочего дня со дня оплаты должен представить копии платежных документов, названных выше, Организатору аукциона, после чего, не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Минским горисполкомом – договор аренды земельного участка. Оплата за недвижимое имущество производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.

Осмотр объекта на местности участниками аукциона производится Продавцом.

САРВАЎСЯ З ПОРУЧНЯЎ...

У Мінску ў адным з дамоў загінуў 34-гадовы жыхар Мінскага раёна, які па неасцярожнасці ўпаў уніз з вышыні.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, нясчасны выпадак здарыўся ў адным з дамоў па праспекце Незалежнасці а дванаццатай гадзіне вечара. Мужчына сядзеў на поручнях лесвічнай пляцоўкі на шостым паверсе дома, адкуль і сарваўся ўніз: ад атрыманых пашкоджанняў ён загінуў на месцы. Як выявілася, загінулы быў нецвярозым. Праверку па гэтым факце правядзіць пракуратура Маскоўскага раёна.

Ігар ГРЫШЫН.

ЛЯГЛА НА РЭЙКІ

У Баранавічах на прыпынку «Пост №1» пад электрычкай загінула 51-гадовая жанчына. Следства ўстанавіла, што загінулая сама лягла на рэйкі, выкарыстаўшы момант, калі машыніст сачыў за пасадкай пасажыраў. Жанчына была інвалідам і стаяла на ўліку ў псіханеўралагічным дыспансэры.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Вячаслаў ДОЎНАР:

1990 год, на пустцы каля вёскі Касынь пачынаюць узводзіць будынкі кааператыва «Камфорт», будучага ААТ «Белінтэртранс». Крайні справа — Вячаслаў Доўнар.

БЕЛАРУСЫ пакуль баяцца адкрываць сваю ўласную справу — нават інтэрактыўнае галасаванне ў нядаўна паказанай па тэлебачанні праграме паказала, што толькі 15% з пяці тысяч з тых, хто патэлефанаваў у студыю, гатовыя адкрыць свой бізнэс. Атрымліваецца, з аднаго боку ў нашай краіне ідзе лібералізацыя эканомікі, спрашчаюцца ўмовы вядзення бізнэсу, а з іншай — яшчэ толькі малая колькасць грамадзян гатовыя звольніцца са сваіх пасад і стаць прадпрымальнікам. Што гэта — страх, нявер'е ва ўласныя сілы ці банальная адсутнасць вопыту? Сёння мы друкуем гутарку з адным з першых бізнэсменаў Беларусі, чалавекам, які пачынаў прадпрымальніцкую дзейнасць яшчэ ў савецкі час, у 1986 годзе, з грузавых перавозак на аўтамабілі «Ніва», а сёння ўжо мае вялікае прадпрыемства па міжнародных грузаперавозках, будуе пад Мінскам транспартна-лагістычны цэнтр, з'яўляецца членам Савета па развіцці прадпрымальніцтва Беларусі, дэпутатам Мінскага раённага Савета дэпутатаў — Вячаславам ДОЎНАРАМ, старшынёй праўлення групы кампаній «Белінтэртранс». Не выключаем магчымасці, што гэтае інтэрв'ю пра прадпрымальніцкія досвед і ініцыятыву Вячаслава Іванавіча падштурхне кагосьці з чытачоў «Звязды» да адкрыцця свайго сямейнага бізнэсу.

— Вячаслаў Іванавіч, давайце з самага-самага пачатку — калі ў вас праявіліся прадпрымальніцкія здольнасці?

— Пачну трохі здалёк: калі я яшчэ вучыўся ў школе, то вельмі любіў нешта вынаходзіць, канструяваць. А сам я нарадзіўся ў цэнтры Мінска, дзе зараз знаходзяцца вуліцы Няміга, Караля — вось у тым раёне. І я памятаю, што якраз у час майго дзяцінства сённяшнюю вуліцу Караля заасфальтавалі — і мы, хлопцы, каталіся там на самаробных тачках. І самае складанае было затармазіць нагамі, калі з'язджаеш з горкі, бо там ужо хадзіў транспарт. Дык вось я тады першы прыдумаў і зрабіў тачку на тармазах — лічу, менавіта тады я ўжо меў схільнасць да нейкай творчай дзейнасці. Потым я выменяў падараваны дзядулем гадзіннік «Перамога» на маторчык ад веласіпеда Д-4, паставіў яго сабе на веласіпед і мог такім чынам вандраваць з Мінска аж амаль да Радашковічаў, дзе жылі мае родзічы. Пасля гэтага веласіпед з маторчыкам я памяняў на аднахуткасны мапед, на якім ўжо нават даваў пакатацца за цукеркі і іншыя прысмакі. Быў таксама ў мяне і матацыкл, а з 18 гадоў я атрымаў правы на аўтамабіль і, як зараз памятаю, за 2 тысячы рублёў купіў у вёсцы пад Дзяржынскам у аднаго чалавека «гарбаты» «Запарожац». Дарэчы, калі ён пра гэты факт пачытае ў газеце, то, я ўпэўнены, абавязкова мяне ўзгадае. Дый у мяне зараз працуе бухгалтар Аліна Валяр'янаўна, якая памятае, як мы з яе мужам на гэтым «Запарожцы» калісьці ездзілі, так што гэта я не прыдумляю, ёсць сведкі.

Пазней быў у мяне яшчэ адзін «Запарожац», але ўжо новы, «з нуля» — яго я набыў у крэдыт. А ў 1986 годзе я пазычыў 15 тысяч рублёў і купіў «Ніву», пабудаваў самаробны прычэп да яе і пачаў працаваць як прыватны прадпрымальнік...

— А адкуль ідэя такая: самому зарабляць грошы пры дапамозе аўтамабіля?

— Усё вельмі проста: я працаваў на заводзе ЭВМ імя Арджанікідзэ, а перад ці пасля працы (у залежнасці ад змены) дапамагаў сябру з трансагенцтва разгружаць і развозіць мэблю з магазінаў. Тады зарплата ў людзей была 150-250 рублёў, і вось я пайшоў на такую рызыку — вырашыў стаць прадпрымальнікам. Бо заўсёды хацелася нейкай творчасці, вынаходніцтва, у рэшце рэшт і большых грошай, бо жылі мы небагата: тата быў газаэлектразваршчыкам на заводзе ЭВМ імя Арджанікідзэ, маці — мантажніцай радыёапаратуры на «Гарызонце».

І вось у 1986 годзе я атрымаў патэнт за нумарам 1 на грузапасажырскія перавозкі. Спачатку працаваў на сваёй «Ніве» з прычэпам. Потым былі УАЗікі, першы КАМАЗ, пасля — МАЗы і гэтак далей. У 1988 годзе быў створаны кааператыў «Камфорт» у Маскоўскім раёне Мінска, а ў канцы красавіка 1991 года ён быў рэарганізаваны ў аўтатранспартнае прадпрыемства «Белінтэртранс».

— Як на вас глядзелі, калі вы ў 1986 годзе прыйшлі атрымліваць патэнт на грузаперавозкі?

— Як на дзівака! Тады яшчэ толькі прыйшоў Гарбачоў да ўлады, і яшчэ ніхто не разумеў, што за ініцыятывы такія і што я ад іх хацеў. Як зараз памятаю, мне ў райвыканкаме сказалі: «Мы не ведаем, што ты ад нас хочаш, ці можна гэта і як гэта павінна выглядаць». Тады я абышоў дырэктараў магазінаў, якіх прасіў выказаць меркаванне, ці не будуць яны супраць, калі я буду развозіць дробныя рэчы: паліцы, тумбачкі і гэтак далей. Бо такія малагабарытныя рэчы трансагенцтвам было нявыгадна вазіць: навошта гнаць вялікі ГАЗ-53, каб прывезці бабулі палічку для кніг? І нехта з дырэктараў казаў, што нічога не будзе падпісваць, а нехта ставіў рэзалюцыю «не супраць» ці нават «вітаю». І калі было наступнае пасяджэнне камісіі ў райвыканкаме, я прыйшоў, сказаў, што хачу займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, растлумачыў, што буду рабіць, паказаў паперы. Можа мне пашанцавала, а можа, я пераканаў камісію, але патэнт мне выдалі і я пачаў працаваць. Прычым тады разам са мной адкрываліся прыватныя таксі, — напрыклад, «Гарантыя». Але ім дазвалялася перавозіць толькі пасажыраў, а я пайшоў далей і атрымаў патэнт на перавозку і пасажыраў, і грузаў. І на сваёй «Ніве» з прычэпам падвозіў халадзільнікі, тэлевізары, палічкі, нейкія дробныя будматэрыялы — ездзіў нават у Расію, ва Украіну, на вельмі далёкія адлегласці. Цана была па дамове, а за патэнт я плаціў дзяржаве нейкую пэўную суму кожны год.

...У 1986 годзе я пазычыў 15 тысяч рублёў і купіў «Ніву», пабудаваў самаробны прычэп да яе і пачаў працаваць як прыватны прадпрымальнік...

— 15 тысяч рублёў, пазычаныя на «Ніву», адпрацавалі хутка?

— Хутка. Шчыра скажу, у месяц я мог зарабіць да 3 тысяч рублёў, так што даўгі я вярнуў на працягу года.

— Я так разумею, што вось гэтыя будынкі каля вёскі Касынь пад Мінскам, дзе зараз знаходзіцца «Белінтэртранс», вы будавалі таксама сваімі рукамі?

— У 1990 годзе я шукаў месца, каб пабудаваць гараж, дзе можна было б рамантавацца, бо дзяржаўныя аўтатранспартныя прадпрыемствы нас не пускалі на рамонт. Я аб'ехаў амаль усе калгасы і саўгасы ў Мінскім раёне — шукаў кавалак зямлі пад будаўніцтва. І вось дзякуючы колішняму старшыні мясцовага калгаса Мікалаю Лапацю, мне далі на ўзгорку закінуты кавалак зямлі. І тое не хацелі даваць, але Мікалай Сцяпанавіч пераканаў кіраўніцтва Мінскага райвыканкама, што няма нічога дрэннага ў тым, каб прыватнік узяў зямлю і нешта на ёй пабудаваў. Тут не было ні святла, ні вады, ні сувязі, ні ацяплення — была звычайная пустка. І я сам, па меры магчымасці, пераапранаўся і разам з будаўнікамі мы ўзводзілі сцены. Паралельна мой бацька, які быў ужо пенсіянерам, уладкаваўся на працу ў калгас, нам выдзелілі тут кавалак зямлі, і мы пачалі будаваць дом. Навасселле адбылося якраз на мой дзень нараджэння, і так з 1993 года я стаў жыць тут.

— А ў гэты час вы ўжо самі на машыне не ездзілі? Ці таксама ганялі грузавыя аўтамабілі?

— Я наогул на грузавой машыне ездзіў толькі адзін раз у жыцці сам за рулём. Гэта быў, па-мойму, 1990-ты год, трэба было прывезці ў Мінск з Абхазіі мандарыны. Кіроўца захварэў, таму ў рэйс прыйшлося ехаць мне. І я, не маючы правоў адпаведнай катэгорыі, ніколі не сядзеўшы ў грузавіку за рулём, паехаў за 2200 кіламетраў у Абхазію, у пасёлак Ачамчыра. Мне далі карту, паказалі, як кіраваць машынай, паказалі, дзе інструменты, і я паехаў — праз Сочы, праз серпанціны ў гарах. Больш за тое, там яшчэ самому прыйшлося машыну грузіць, таму як след не адпачыў і паехаў назад: гружаны трохвосевы бартавы эксперыментальны МАЗ, на якіх па серпанцінах ніхто ніколі не ездзіў... Вось так я аднойчы з'ездзіў у рэйс па мандарыны, і вельмі ганаруся гэтым выпадкам. Таму калі нехта сёння стогне, што не можа нешта зрабіць, то я кажу: пажылі б вы ў наш час, а то зараз маеце цяплічныя ўмовы, але стогнеце і ныеце.

Яшчэ ездзіў на грузавіках на выпрабавальных палігонах заводаў «Вольва» і «Сканія», але там усё проста было: садзішся на аўтамабіль з каробкай-аўтаматам і толькі круці руль ды цісні на газ або тормаз.

«ДЛЯ МЯНЕ ЗАЎСЁДЫ БЫЛІ ПРЫКЛАДАМ ЕЎРАПЕЙСКІЯ ФІРМЫ, ЯКІЯ ІСНУЮЦЬ 50-100 ГАДОЎ»

«Я ТАКСАМА ХАЧУ ДОЎГА ПРАЦАВАЦЬ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ, РАБІЦЬ ГІСТОРЫЮ, СТВАРАЦЬ ІМІДЖ СВАЙГО ПРЫВАТНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА»

— Калі вашы кіроўцы здзейснілі першыя рэйсы ў Заходнюю Еўропу? Якія ўражанні былі?

— Дзякуючы ініцыятыве і намаганням кампаніі «Белмагістральаўтатранс», якой тады кіраваў Мікалай Баравы, а таксама яшчэ шэрагу вядомых кампаній-перавозчыкаў, Беларусь у 1992 годзе атрымала доступ да міжнародных перавозак. Скажу шчыра, гэта быў унікальны час! Мы за мяжу паехалі на КАМАЗах, на МАЗах —хто на чым мог. Першы рэйс наша кампанія здзейсніла ў Гановер, адтуль груз павезла ў Маскву. У нас тады былі добрыя стасункі з Мінскім аўтамабільным заводам, таму мы куплялі ў іх запчасткі, адвозілі ў Рыжскае, Смаленскае, Маскоўскае «Саўтрансаўта» і скуплялі ў іх за гэта спісаныя Мерседэсы, як сёння памятаю, — трохвосевыя Мерседэсы мадэлі 2232. Пасля мы гэтыя машыны поўнасцю разбіралі, даводзілі да добрага стану і ўжо ездзілі на іх.

— А выгадна было ездзіць на Еўропу?

— Безумоўна! Ну што такое прыехаць у Заходнюю Еўропу ў тыя часы? Гэта, па-першае, магчымасць атрымаць валюту законна, а па-другое, гэта магчымасць і нешта для сябе набыць. Тады ж там можна было «Жыгулі» купіць за 50 марак, а «Масквіч» — за 2 блокі цыгарэт! Тады ж мы, дарэчы, адкрылі фірму «РамАўтаЕўра», куплялі за мяжой старыя машыны, тут аднаўлялі і прадавалі. Бізнэс ішоў вельмі паспяхова: у рэйс ехалі два кіроўцы, заязджалі ў Германіі на стаянку, адзін з іх забіраў машыну і ехаў назад. Таму час быў вельмі цікавы... Памятаю, праз Польшчу было небяспечна ездзіць, бо там быў рэкет — дзякуй Богу, што мінулі тыя дні!

— А дарэчы, пра так званыя «бандыцкія» 90-я — не страшна было ездзіць па краінах былога СССР?

— Я яшчэ дадаў бы сюды і канец «ліхіх» 80-х — сапраўды, працаваць было складана, і бандыты перахоплівалі нашы грузавікі, усялякае бывала. Недзе дамаўляліся, недзе даводзілася пераконваць, а часам даводзілася і плаціць. Але, дзякуй Богу, гэта ўжо ў мінулым.

...Калі нехта сёння стогне, што не можа нешта зрабіць, то я кажу: пажылі б вы ў наш час, а то цяпер маеце цяплічныя ўмовы, але стогнеце і ныеце...

— Вы на апошнім Савеце па развіцці прадпрымальніцтва мімаходзь сказалі, што ў свой час мелі бізнэс у Польшчы, Германіі, Украіне...

— Скажам так: я проста разумеў, што заўсёды больш выгадна працаваць напрамую з фірмамі, а не праз пасрэднікаў. А загрузкі з Еўропы мы атрымлівалі не напрамую, бо з-за еўрапейскага заканадаўства не было такой практыкі, а якраз праз пасрэднікаў. У выніку страты складалі каля 10-15% ад сумы фрахту, таму мы вырашылі адкрыць свае філіялы. Доўга і складана адкрывалі сваё прадстаўніцтва ў Патсдаме — яно потым існавала з пераменным поспехам, бо то дэфолт адбудзецца, то заканадаўства якое зменіцца. З-за праблем з мытнымі органамі Расіі, якія ў свой час займаліся фактычна вымагальніцтвам, вымушаныя былі адкрыць прадпрыемствы ў Бранску і Калінінградзе. Асобная эпапея была з вытворчасцю глазураваных сыркоў, якую я спрабаваў тут наладзіць у 1998 годзе: планаваў паставіць 5 ліній, выкупіць ферму і завезці кароў з Даніі і Галандыі. Але выйшлі пастановы, якія фактычна зрабілі перапрацоўку малака нявыгаднай. Прыйшлося гэтыя лініі перастаўляць па дзяржаўных малочных заводах — у Навагрудку, Лагойску і Уздзе. Але потым і гэтую вытворчасць давялося закрыць, бо прыярытэт заўсёды ўсё роўна аддаваўся дзяржаўнай вытворчасці. Напэўна, палітыка тады такая была ў дзяржавы, каб усё было пад яе кантролем. А лініі па вытворчасці глазураваных сыркоў прыйшлося перакінуць у Польшчу і Украіну. І ведаеце што самае крыўднае? Мяне тады прымусілі з беларускіх заводаў гэтыя лініі прыбраць, а самі зараз выпускаюць такія ж самыя сыркі, як і я тады...

Прадпрыемствы за мяжой вельмі цяжка канкураваць, бо там павінны быць людзі, якім ты давяраеш і якія сумленна працуюць. Таму, на жаль, усе філіялы і ўсе фірмы за мяжой цяпер закрытыя, а ўсе намаганні накіроўваюцца на «Белінтэртранс» і інвестыцыйны праект па будаўніцтве пад Ракавам транспартна-лагістычнага цэнтра.

— У вас сямейны бізнэс? Дзеці дапамагаюць весці справы?

— У мяне чацвёра дзяцей — тры дачкі і сын. І ў нас была такая традыцыя ў сям'і: абавязкова ўсе дзеці на вакацыях павінны адзін месяц адпрацаваць на фірме. Так што папрацавалі ўсе, але старэйшая дачка пасля дэкрэту вырашыла ісці сваім шляхам, сярэдняя вучыцца і працуе, сын працаваў у Літве, але, на жаль, патрапіў на крызіс і сёння вырашыў паспрабаваць самастойна папрацаваць. Таму сёння надзеі маю на малодшую дачку, якая пакуль вучыцца на 3-м курсе БДЭУ на факультэце міжнародных адносін. Яна з 6 гадоў працавала ў вольны час на фірме — налеплівала фотакарткі, перакладвала паперкі. І я нават памятаю, як калісьці за два тыдні на вакацыях я ёй плаціў 5 тысяч за тыдзень. Сёння яна ўжо шмат у чым разбіраецца, прыязджае сюды дапамагаць, і я мяркую, будзе ўдзельнічаць у працэсе вядзення бізнэсу.

...Рыхтуюся працаваць да 85 гадоў, а потым справу буду перадаваць унукам...

Хоць у мяне ёсць добры прыклад майго настаўніка Міхаіла Высоцкага, Героя Беларусі, акадэміка, былога галоўнага канструктара МАЗа, якому сёння будзе 83 гады, а ён па-ранейшаму працуе. Таму мы так у сям'і жартуем: буду браць прыклад з Міхаіла Сцяпанавіча і рыхтуюся працаваць да 85 гадоў, а потым справу буду перадаваць унукам.

— Здаецца, вы дысертацыю пішаце, праўда?

— Так, сапраўды. Усё пачалося з таго, што ў 2004 годзе мы ўзялі 30 адзінак тэхнікі — гэта былі МАЗы, МАЗ-МАНы, Івекі. І я на кожны цягач і паўпрычэп завёў статыстыку — эканамічную і тэхнічную: якія выдаткі, якія паломкі. І вось праз 4 гады я выпадкова патрапіў у Нацыянальную акадэмію навук, дзе рабіў даклад па выніках маіх назіранняў за эксплуатацыяй тэхнікі. І ў мяне тады спыталі: якую вучоную ступень маеце? Гэта ж амаль гатовая дысертацыя! Паколькі тэма мне гэтая цікавая, то здаў кандыдацкі мінімум і пачаў працаваць над дысертацыяй. Да канца наступнага года паспрабую яе закончыць — там вельмі цікавыя напрацоўкі, матэрыялы, даследаванні. Гэта будзе нешта накшталт вучэбнага дапаможніка для перавозчыкаў-пачаткоўцаў: як правільна выбудаваць эканоміку, лагістыку, якую тэхніку выкарыстоўваць і ў якіх выпадках.

— Вы яшчэ неяк казалі пра сваю канцэпцыю эфектыўнага выкарыстання МАЗаў: грузы з Еўропы трэба везці на замежных цягачах, потым тут мяняць іх на МАЗы і ехаць далей у краіны СНД...

— Мяне часта пытаюць, ці купляю я МАЗы і куды я на іх езджу. Дык вось калісьці ў 2001 годзе мы разам з МАЗам, з асацыяцыяй БАМАП пачалі сумесны праект — і шмат якія беларускія прадпрымальнікі сталі браць не толькі імпартную тэхніку, але і айчынную. На жаль, потым з-за якасці беларускіх цягачоў і цаны, якая расла, гэтая ініцыятыва стала згасаць, прычым я лічу, што ахаладжэнне было не збоку міжнародных перавозчыкаў, а з боку МАЗа — відаць, з-за тых праблем, што ўзніклі ў завода...

Але мы сутыкнуліся з яшчэ адной праблемай: складанасцямі з сэрвісам МАЗаў за мяжой. Не ведаюць на Захадзе гэтых машын, няма ў іх запчастак, баяцца яны браць адказнасць за рамонт, бо сэрвіс павінен даваць гарантыю і пры нейкай аварыі кампенсуе ўсе страты. Таму на прыкладзе сваёй фірмы абкаталі такую лагістычную схему: на добрых замежных грузавіках прывозілі на вільнюскі тэрмінал грузы, пакідалі там прычэп, яго чапляў МАЗ і ехаў далей на Расію і Казахстан. Так што не трэба сёння прымушаць прадпрымальнікаў браць МАЗы для міжнародных перавозак: шмат якія перавозчыкі пры адпаведнай цане гатовыя браць МАЗы для эксплуатацыі ў Расіі, Казахстане і іншых краінах СНД, дзе ёсць сэрвіс, дзе гэтыя машыны ведаюць. Скажу на сваім прыкладзе: калі браць паломкі тэхнікі на дальніх рэйсах, то хутчэй вырашаліся пытанні з айчыннай тэхнікай, чым з замежнай. А тым больш калі ўлічваць перспектыву адзінай эканамічнай прасторы паміж нашымі краінамі, то я больш чым пераканаваны, што беларускія перавозчыкі павязуць тавар з таго ж ракаўскага тэрміналу ў бок Расіі і Казахстана на МАЗах. Нашы МАЗы больш прыстасаваныя да тых дарог, яны больш надзейныя там: напрыклад, у нас машына новая замежная на Іркуцк пайшла, а вярнулася з расколінай лабавога шкла па дыяганалі — гэта ж уявіце, як яе так круціла на дарогах!

...Не трэба сёння прымушаць прадпрымальнікаў браць МАЗы для міжнародных перавозак: шмат якія перавозчыкі пры адпаведнай цане гатовыя браць МАЗы для эксплуатацыі ў Расіі, Казахстане і іншых краінах СНД, дзе ёсць сэрвіс, дзе гэтыя машыны ведаюць...

— Раскажыце пра вашае дэпутацтва: вас жа ўжо не першы раз выбіраюць людзі?

— Я ў трэці раз з'яўляюся дэпутатам Папярнянскага сельскага Савета, і першы раз — Мінскага раённага. Я вам прызнаюся, што гэтым я займаюся шчыра, ад душы. Усё роўна ж я тут жыву і дапамагаю людзям. Дык а чаго не дапамагаць у статусе дэпутата? Вось у мяне ёсць пасведчанне дэпутацкае, я заўсёды яго з сабой нашу і ганаруся гэтым: калі трэба прайсці ў нейкія інстанцыі, паказваю яго на ўваходзе, хоць і іншых пасведчанняў у мяне хапае. Я тут жыву, тут жывуць мае дзеці, таму трэба падтрымліваць сельсавет, школу, садзік, царкву, пенсіянераў, ветэранаў, старажылаў. Мы перыядычна сустракаемся з маімі выбаршчыкамі, гутарым пра праблемы — я наогул лічу, што кожны беларускі прадпрымальнік павінен нейкую частку, акрамя падаткаў, аддаваць на дабрачыннасць ці падтрымку сацыяльнай сферы.

— І нарэшце раскажыце пра свой праект па будаўніцтве катэджнага пасёлка побач з фірмай для сваіх супрацоўнікаў — сапраўды такое ёсць у планах?

— Так, сапраўды, такая ідэя ёсць. Скажу шчыра: гэта для мяне дадатковы галаўны боль, бо зараз паміж вёскамі Касынь і Вішнёўка выдзелена 70 гектараў пад індывідуальную забудову. І я па ідэі не павінен хвалявацца: працоўныя рукі і так знойдуцца, чарга будзе на ўладкаванне на фірму. Аднак я часта бачыў, як мае сённяшнія супрацоўнікі бралі даведкі для атрымання крэдыту на будаўніцтва кватэр у Мінску. І пры гэтым казалі, што з задавальненнем і тут бы домік купілі, каб праца блізка была. І сапраўды, у нас працоўны дзень пачынаецца з 8:30 — пакуль з таго Мінска даедзеш! Параіўшыся з калектывам, прыйшлі да ідэі: будаваць свой катэджны пасёлак, ну і плюс ільготы па крэдытах ёсць на будаўніцтва ў сельскай мясцовасці, ды і губернатар абяцаў такім праектам падтрымку. Таму мы стварылі кааператыў тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пад гэтую праграму ствараем фірму «Белінтэрпраект», плануем узяць будаўнічую тэхніку ў лізінг і цэнтралізавана пабудаваць комплекс з прыкладна 40 дамкоў. Гэта будуць двухпавярховыя дамы, з хлеўчуком, вядома ж, без шыку, але вельмі зручныя. Мы не ставім тут мэты зарабіць, таму за кошт цэнтралізаванасці будаўніцтва квадратны метр для працаўнікоў абыдзецца ніжэй, чым у сярэднім. Калі ўсё будзе добра, то ўжо ў красавіку 2011 года пачнём будаўнічыя працы. Скажу больш: зараз плануем пабудаваць пад Ракавам, каля нашага будучага транспартна-лагістычнага цэнтра, аналагічны пасёлак, — праўда, ужо на 50 дамоў.

Дарэчы, улічваючы, што калектыў у нас вялікі, што на сёння шмат увагі ўдзяляем карпаратыўнай адказнасці, шмат прымаем дэлегацый, праводзім семінары, то мы пачалі будаваць свой культурна-аздараўляльны комплекс. Не вялікі, але для карпаратыўных мерапрыемстваў хопіць: боўлінг, басейн, тэнісныя корты, баскетбольна-валейбольная пляцоўка. Ёсць і іншыя планы для развіцця: напрыклад, згодна з нядаўна апублікаваным праектам будаўніцтва 2-й кальцавой дарогі вакол Мінска, яна будзе праходзіць амаль праз нас, таму мы плануем паўдзельнічаць у інвестыцыйным праекце па прыдарожным сэрвісе...

— За гэтыя больш чым два дзясяткі гадоў вядзення бізнэсу ніколі не хацелася ўсё кінуць, закрыць, прадаць і не займацца болей прадпрымальніцтвам?

— Былі вельмі складаныя часы. Як правіла, падчас крызісу асноўная праблема заключалася ў тым, што банкі замест таго, каб нас падтрымаць у складаны перыяд, наадварот, рабілі патрабаванні больш жорсткімі. І мы не маглі атрымаць доступ да дадатковых фінансаў, а табе трэба было плаціць за лізінг, за паліва, за запчасткі — вось гэта было самае страшнае. Але цяпер, ужо з вопытам, я ведаю: любы крызіс прахадзіць, які б ён ні быў цяжкі. Так і сёння — мы дастойна ўваходзім у 2011 год, аднавілі свае пазіцыі, нават набылі сёлета 100 аўтацягнікоў «Вольва». Галоўнае, калі дома ўтульнасць, калі на працы добры калектыў — а сёння ў нас працуе каля 450 чалавек. Ужо нават адчуваю нейкую адказнасць за бізнэс, за сваіх людзей, за сваё прадпрымальніцкае імя. Можна было б усё распрадаць, але я ніколі такой мэты не ставіў: для мяне заўсёды былі прыкладам еўрапейскія фірмы. Прыязджаеш да іх і бачыш, што фірма існуе 50-100 гадоў. Я таксама хачу доўга працаваць на сваёй зямлі, рабіць гісторыю, ствараць імідж свайго прыватнага прадпрыемства. Я нават ніколі не разглядаў пытанне ў цяжкія часы ўзяць сузаснавальнікаў, бо разумеў: спачатку будзе палёгка, а потым усё роўна ўзнікнуць складанасці.

...З 2011 года пачнецца новае станаўленне бізнэсу: у нас ёсць аўтарытэт, у нас ёсць імя, дзяржава ўбачыла, што калі не замінаць прадпрымальнікам, то мы можам даваць вельмі добрыя вынікі...

— Які перыяд быў самым цяжкім?

— Напэўна, усе гады былі па-свойму і цяжкімі, і паспяховымі. Розныя былі праблемы: баяліся, што калі ты паспяхова развіваешся, то прыйдуць кантралюючыя органы, знойдуць недапрацоўкі і аштрафуюць. А штрафы і пені былі такія, што можна было паставіць прадпрыемства на калені, і яно ніколі б не ўстала на ногі. Гэтага я заўсёды баяўся, таму стараўся працаваць з выкананнем усіх законаў і правілаў, шмат удзяляў увагі вывучэнню заканадаўства, дбаў, каб была свая юрыдычная служба, каб мае спецыялісты пастаянна ўдзельнічалі ў семінарах і канферэнцыях, а значыць, ішлі ў нагу з часам. Рознае было, але, дзякуй Богу, напэўна, самы цяжкі перыяд у беларускага бізнэсу ўжо ў мінулым. Я лічу, што з 2011 года пачнецца новае станаўленне бізнэсу: у нас ёсць аўтарытэт, у нас ёсць імя, дзяржава ўбачыла, што калі не замінаць прадпрымальнікам, то мы можам даваць вельмі добрыя вынікі. Мне, напрыклад, было вельмі прыемна, калі старшыня Мінскага райвыканкама Пётр Яраш сказаў прылюдна, што ў фарміраванні бюджэту Мінскага раёна доля нашай фірмы ў транспартных паслугах набліжаецца да 55-60%. Гэта вельмі прыемна, такія прыклады павінны чыноўнікаў падштурхоўваць да таго, каб падтрымліваць прадпрымальніцкую ініцыятыву. А за намі затрымкі не будзе — у большасці сваёй у Беларусі сумленныя прадпрымальнікі: мы хочам жыць годна, ездзіць на добрых машынах, але лепш будзем працаваць стабільна і надзейна, чым будзем імкнуцца недзе хапнуць ці ўрваць добры кавалак. Лепей сумленна жыць і працаваць, чым потым сядзець і чакаць, калі пастукаюць у дзверы.

Гутарыў
Павел БЕРАСНЕЎ.

Паслугі з умовамі рэнты

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны будзе аказваць разнастайную дапамогу айчынным і замежным інвестарам, якія пажадаюць укласці грошы ў стварэнне дамоў-інтэрнатаў павышанай камфортнасці — з пражываннем у іх пенсіянераў і інвалідаў на платнай аснове. Пра гэта заявіла міністр Марыяна ШЧОТКІНА падчас «круглага стала» на тэму «Інавацыйныя тэхналогіі ў сацыяльным абслугоўванні. Сацыяльная адказнасць сучаснага бізнэсу».

Сядзелка стане больш даступнай?

Паводле звестак міністэрства, сёння сацыяльныя паслугі на даму атрымлівае 83,6 тыс. пенсіянераў і інвалідаў, і гэтая лічба працягвае павялічвацца з кожным годам. Як расце і папулярнасць іншых відаў падтрымкі — тых жа аднаразовых платных бытавых паслуг ці аддзяленняў дзённага знаходжання для інвалідаў, дзякуючы якім людзі з абмежаванымі магчымасцямі могуць не заставацца адны і паступова павялічваць свае здольнасці.

Дарэчы, паводле слоў **начальніка аддзела развіцця і каардынацыі сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання міністэрства Таццяны ФЁДАРАВАЙ**, ужо да канца гэтага года аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў будуць працаваць ва ўсіх раёнах Беларусі. Адначасова ёсць намер набываць легкавыя аўтамабілі з пад'ёмнікамі — для арганізацыі падвозу інвалідаў у тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

У наступныя пяць гадоў плануецца прапаноўваць яшчэ некалькі цікавых напрамкаў. У прыватнасці — аказанне паслуг за кошт рэнты. Сутнасць тут простая: на падставе дагавору пенсіянер ці інвалід зможа атрымліваць бясплатна разнастайную сацыяльную падтрымку на ўмовах далейшага адчужэння прыватызаванай кватэры ў камунальную ўласнасць. Ці прыжывецца гэта схема ў нашай краіне, павінна паказаць «выпрабаванне» падчас спецыяльнага пілотнага праекта — ён пройдзе ў Мінску.

— Неабходна вырашыць і пытанне з сядзелкамі, — адзначае Таццяна Фёдарава. — Попыт на іх паслугі вялікі. Аднак сёлета такімі паслугамі скарыстаўся толькі 131 чалавек. Сапраўды, у параўнанні з прыватнымі структурамі кошт аплаты тут невысокі. І ўсё ж для значнай часткі нашых грамадзян ён не па кішэні. Таму трэба разглядаць пытанне аб магчымасці прапановы паслуг сядзелак для тых жа адзінокіх грамадзян, якія цалкам страцілі магчымасць самаабслугоўвання і перамяшчэння, па больш нізкіх цэнах.

«Інтэрнат» у межах адной вёскі

У планах на наступныя пяць гадоў — і павелічэнне колькасці аддзяленняў кругласутачнага знаходжання ў тэрытарыяльных цэнтрах. Такія «міні-інтэрнаты» прызначаны для часовага пражывання пенсіянераў і інвалідаў — напрыклад, у традыцыйна складаны асенне-зімовы перыяд.

Ужо сёння аддзяленні кругласутачнага знаходжання працуюць у 50-ці раёнах. І карыстаюцца значным попытам перш-наперш сярод жыхароў вёскі. Пры гэтым тым жа вяскоўцам будуць прапанаваныя і іншыя варыянты.

— У Вілейскім раёне распачаўся даволі цікавы эксперымент — у адной з вёсак за кошт выканкама зроблены бягучы рамонт аднаго з пустых дамоў, а пасля ў гэты дом на зіму засялілася некалькі састарэлых чалавек, да якіх прыходзіць сацыяльны работнік, — кажа старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Алег Семянчук. — Яны засталіся жыць у сваёй роднай вёсцы, са сваімі суседзямі. І мы лічым, што гэты варыянт павінен атрымаць працяг. Бо з аднаго боку, так зручна для людзей. А з другога — дзяржава не нясе вялікіх выдаткаў — за харчаванне і камунальныя паслугі плацяць самі ж жыхары дома.

Падказкі для прыватніка

Сацыяльнае абслугоўванне дома і аддзяленні кругласутачнага знаходжання тэрытарыяльных цэнтраў дазволілі вырашыць адну з праблем — з чэргамі ў звычайныя інтэрнаты для пенсіянераў і інвалідаў. Фактычна за непатрэбнасцю зачыніліся чатыры падобныя ўстановы. Разам з тым становіцца ўсё больш актуальным пытанне з месцамі ў інтэрнатах для псіханеўралагічных хворых.

— Дзякуючы рэканструкцыі і перапрафіляванню плошчаў, якія не выкарыстоўваліся, агульная чарга ў дамы-інтэрнаты скарацілася з 1370 да 764 чалавек, да таго ж апошняя лічба стане меншай ужо сёлета — да канца года на 50 месцаў павялічыцца ўмяшчальнасць Дамачаўскага інтэрната, — адзначае **начальнік упраўлення стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання і капітальнага будаўніцтва міністэрства Марыя ГАРБАЦЭВІЧ**. — Аднак цалкам праблема будзе вырашана да 2013 года, прычым на гэтыя мэты ўжо вылучана фінансаванне.

Адначасова ёсць намер зніжаць чаргу не зусім «стандартным» шляхам — дзякуючы адаптацыі дзяцей з абмежаваннямі псіхафізічнага развіцця да звычайнага жыцця. У 2008 годзе ў Веснаўскім дзіцячым інтэрнаце на Магілёўшчыне створаны дом кватэрнага тыпу, дзе падлеткі ва ўзросце ад 18 гадоў з дапамогай выхавацеляў вучацца жыць самастойна. Такім чынам, з'яўляецца альтэрнатыва пераезду ў «дарослы» інтэрнат. Неўзабаве падобны праект распачынаецца і ў іншым месцы — у Багушэўску.

Не менш цікавы намер на бліжэйшы час — стварэнне дамоў-інтэрнатаў павышанай камфортнасці. Пражыванне тут будзе платным. Аднак умовы — лепшымі.

— Тое, што існуюць двухзоркавыя ці пяцізоркавыя гасцініцы, ведае ці не кожны, — заўважае міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна. — Штосьці падобнае трэба мець і ў сацыяльным абслугоўванні, тым больш што звароты паказваюць — попыт на новыя ўстановы будзе. І неабходна, каб былі адпаведныя прапановы, прычым тут быў бы дарэчы прыватны, у тым ліку замежны, інвестар. Аднак, на жаль, пакуль цікавасці да падобнай прапановы няма. Таму мы заклікаем дзелавыя колы звярнуць увагу на гэты і іншыя сацыяльныя праекты.

Між тым адметныя прыклады тут ёсць. Незвычайную акцыю «Свет праз інтэрнэт» распачынае аператар мабільнай сувязі life:). Ён і вырашыў наладзіць выдачу sim-картак з трафікам на паўгода людзям, якія не могуць устаць з ложка.

— Мы віталі і будзем вітаць усе падобныя ініцыятывы, — падкрэслівае міністр. — Бо кожнаму зразумела: чалавек, які прыкаваны да ложка, дзякуючы інтэрнэту ўжо не будзе адчуваць сябе адзінокім.

Сяргей ГРЫБ.

Мінск—Чэрвень.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ

Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, пр. Черняховского, 9

Аукционы по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка	Функциональное назначение земельного участка	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения
1	Земельный участок с кадастровым номером 240100000003006446, площадью 0,1259 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Рассветная, д. 31 (повторный аукцион)	Для строительства и обслуживания жилого дома	Возможность подключения централизованного газоснабжения, водоснабжения. Ограничения: охранная зона линии электропередач напряжением до 1000В.	15 907 591	1 590 700 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет
Дата, время и место проведения аукциона: 24.12.2010 в 15.00. Место проведения аукциона: г. Витебск, пр-т Черняховского, дом 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов: 20.12.2010 до 17.30. по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, дом 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».					
1	Земельный участок с кадастровым номером 221880409201000058, площадью 0,2500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский район, Стодолиценский с/с, д. Канаши, ул. Озерная, 22А	Для строительства и обслуживания жилого дома	Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта, примыкает к асфальтированным дорогам и улицам. Ограничения: водоохранная зона вне прибрежной полосы озера Плав	1 671 000	167 100 бел. руб. на р/с 3600316117026 в ф-ле № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300066979, код платежа 04901, получатель платежа: Стодолиценский сельский исполнительный комитет
2	Земельный участок с кадастровым номером 221880409201000059, площадью 0,2497 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский район, Стодолиценский с/с, д. Канаши, ул. Озерная, 22Б	Для строительства и обслуживания жилого дома	Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта, примыкает к асфальтированным дорогам и улицам. Ограничения: водоохранная зона вне прибрежной полосы озера Плав	1 669 000	166 900 бел. руб. на р/с 3600316117026 в ф-ле № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300066979, код платежа 04901, получатель платежа: Стодолиценский сельский исполнительный комитет
Дата, время и место проведения аукциона: 28.12.2010 в 15.00. Место проведения аукциона: г. Городок, ул. Пролетарская, 2, Городокский районный исполнительный комитет. Окончательный срок подачи документов: 22.12.2010 г. до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, дом 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».					

Аукционы по продаже права заключения договора аренды земельного участка

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка, предлагаемого в аренду	Функциональное назначение земельного участка, срок аренды	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена права заключения договора аренды (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения
1	Земельный участок с кадастровым номером 240100000001009664, площадью 0,0025, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, Московский проспект, у дома № 10	Под строительство объекта «Обменный пункт валют по проспекту Московскому у дома № 10 в г. Витебске». Срок аренды – 5 лет.	Возможность подключения централизованного водоснабжения и водоотведения. Ограничения: охранная зона канализационного коллектора	862 877	86 200 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет
2	Земельный участок с кадастровым номером 240100000001009661, площадью 0,0027 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 6-я Клиническая в районе жилого дома № 44	Под строительство объекта «Торговый павильон по улице 6-й Клинической в районе жилого дома № 44 в г. Витебске». Срок аренды – 5 лет.	Возможность подключения централизованного водоснабжения и водоотведения, теплоснабжения. Ограничения: охранные зоны тепловых сетей, канализационных коллекторов, линий сооружений связи и радиофикации, линий электропередач напряжением до 1000В	480 368	48 000 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет
Дата, время и место проведения аукциона: 28.12.2010 в 9.00. Место проведения аукциона: г. Витебск, пр-т Черняховского, дом 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов: 22.12.2010 г. до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, дом 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».					
1	Земельный участок с кадастровым номером 240100000002006397, площадью 0,0061 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Школьная (повторный аукцион)	Под строительство объекта «Торговый объект по реализации товаров первой необходимости у дома №1/23 по улице Школьной, в поселке Васьковичи». Срок аренды 5 лет.	Возможность подключения централизованного газоснабжения, водоснабжения, ливневой канализации, наличие телефонного кабеля. Ограничения: земли, находящиеся в охранных зонах линий, сооружений связи и радиофикации.	357 991	35 700 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет
Дата, время и место проведения аукциона: 21.12.2010 в 15.00. Место проведения аукциона: г. Витебск, пр-т Черняховского, дом 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов: 15.12.2010 г. до 17.30 г. Витебск, пр-т Черняховского, дом 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».					

Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:

- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения по каждому объекту (лоту), выставляемому на аукцион, доводится до сведения участников до начала аукциона. Размер всех затрат указывается в соглашении о правах и обязанностях сторон.

- подписать протокол аукциона в день проведения аукциона, оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, указанные в протоколе аукциона;

- в случае приобретения зем. участка в частную собственность – осуществить в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права собственности на земельный участок. В случае приобретения права аренды не позднее 2-х рабочих дней после внесения денежных выплат и выполнений условий, указанных в протоколе аукциона, заключить с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка; осуществить государственную регистрацию в двухмесячный срок со дня заключения договора аренды;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

1. **Для участия в аукционе** приглашаются: при продаже земельного участка в частную собственность - граждане Республики Беларусь, при продаже права на заключение договора аренды земельного участка - граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Гражданин, индивидуальный предприниматель, юридическое лицо должны подать заявление об участии в аукционе и подписать соглашение с организатором аукциона. К заявлению прилагается: - для граждан – копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина;

- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

- для представителей гражданина и индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона.

2. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка.

3. В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за предмет аукциона, выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты на организацию и проведение аукциона возврату не подлежат.

4. Контактный тел.: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by, www.gki.gov.by.

Факт

30 КМ ТКАНІНЫ. А ДЗЕ ДАКУМЕНТЫ?

Калі супрацоўнікі АБЭЗ Ганцавіцкага РАУС зазірнулі на тэрыторыю прыватнага прадпрыемства па вул. Заводскай, то знайшлі там 30 284 м п. тканіны, на якую не было дакументаў. Тканіна пацягнула на суму звыш 422 млн рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

КАРАБІН НА ЎСЯЛЯКІ ВЫПАДАК?

Даўгаствольны наразны карабін «Marlin» вытворчасці ЗША, не зарэгістраваны ва ўстаноўленым законам парадку, канфіскаваны ў жыхара Мазыра. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, грамадзянін захоўваў яго ў прыватным гаражы. Са слоў уладальніка-пенсіянера, зброю ён набыў у Свярдлоўску 16 гадоў таму ў невядомай асобы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

«ЗАПАСЛІВЫ» МАЙСТАР

Работнік будаўнічай арганізацыі падазраецца ў буйным крадзяжы

Крымінальная справа заведзеная ў дачыненні да 26-гадовага майстра адной з будаўнічых арганізацый. Як мяркуецца, мужчына 23 лістапада каля адзінаццаці гадзін вечара напракудзіў на аб'екце, які будуецца па праспекце імя газеты «Праўда» ў Мінску: падазроны ўчыніў тут крадзеж будаўнічых матэрыялаў больш як на 51 мільён рублёў. «Запаслівага» майстра затрымалі, ён змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

КАНФІСКАВАНА АМАЛЬ З КІЛО ПСІХАТРОПУ

У Мінску затрымана тройца зламыснікаў, якія прывезлі з Расіі буйную партыю «дурману»

Трох непрацуючых маладых людзей затрымалі, паводле звестак прэс-афіцэра Маскоўскага РУУС Таццяны Грыб, на вуліцы Якубава аператыўныя супрацоўнікі сталічных падраздзяленняў наркакантролю сумесна з калегамі з МУС. У іх аўтамабілі было знойдзена і канфіскавана каля двух кілаграмаў псіхатропнага рэчыва «3,4-метылендыаксіпіравалерон», яшчэ частка выяўлена ў гаражы аднаго з затрыманых. Як высветлілася, 2 кілаграмы 950 грамаў «дурману», што быў канфіскаваны праваахоўнікамі, зламыснікі мелі намер рэалізаваць сталічным наркаманам.

Ігар ГРЫШЫН.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Шалі, займіцеся самадысцыплінай! Дзевы, беражыце ўласную рэпутацыю!

ВАЕН. У вас ёсць усе шанцы ажыццявіць жаданае, але наўрад ці знойдзецца на гэта рашучасць. Вазьміце каго-небудзь у кампанію — так будзе прасцей. На пытанні навакольных, якія імкнуцца быць у курсе ўсіх падзей вашага асабістага жыцця, лепш не адказваць, бо гэты дзень спрыяе распаўсюджванню плётак. Затое можна смела дэманстраваць навакольным свае творчыя дасягненні — ёсць шанц праславіцца.

ЦЯЛЕЦ. Цярпенне і спакой дапамогуць пазбегнуць непатрэбных стрэсаў і захаваць неабходныя сілы для актыўнасці на асабістым фронце — а ён цяпер якраз выходзіць на першы план. У сярэдзіне тыдня перад вамі раптам раскрыюцца сакрэты, якія старанна хавала ваша асяроддзе. Уласцівы вам скепсіс адыграе ў пятніцу пазітыўную ролю, вы цалкам правільна не паверыце нічыім абяцанням.

БЛІЗНЯТЫ. Давядзецца праявіць гнуткасць розуму і максімум кемлівасці. Паглядзіце па-філасофску на сітуацыю, якая склалася, не перастарайцеся з ціскам на навакольных, а па некаторых дробязях можна і ўступіць. Старанна правярайце важную інфармацыю, якая паступіць да вас на гэтым тыдні. Магчымыя падвохі і недакладнасці. Будзьце больш уважлівымі да свайго асяроддзя, ёсць верагоднасць здабыць новага сябра. Або ворага — усё залежыць толькі ад вас.

РАК. Калі вы ўсё яшчэ не ўпэўненыя ва ўласных сілах, ганіце прэч ад сябе такога роду сумневы. У вас досыць энергіі і здольнасцяў, каб дамагчыся пастаўленых мэт. Вярніцеся да незавершаных спраў і паспрабуйце своечасова прадухіліць недакладнасці. Можаце атрымаць доўгачаканую вестку: гэта, вядома, пацешыць вас, але не будзе падставай для таго, каб расслабіцца. Вы не згубіце свайго гонару, калі прымеце дапамогу і падтрымку ад блізкіх людзей, бо з некаторымі праблемамі ў адзіночку не справіцца.

ЛЕЎ. Будзе цяжка ўсвядоміць, што, уласна, вы робіце. Таму любое самае добрае і дбайна спланаванае пачынанне здольнае пераўтварыцца ў фікцыю, калі не ў сваю супрацьлегласць. Займацца лепш дробязямі, а таксама справамі, у якіх памыліцца немагчыма. Спрыяльныя кантакты з калегамі здалёку. Могуць паўстаць складанасці ў адносінах з сябрамі, некаторыя з блізкіх людзей могуць павесці сябе зусім не так, як вы чакаеце. У асабістым жыцці верагодныя праблемы, звязаныя з моцнай занятасцю на працы.

ДЗЕВА. Неабходна ўмацоўваць свой аўтарытэт і берагчы ўласную рэпутацыю. Безумоўнае яднанне нават з разумнымі людзьмі можа завесці вас у неймаверныя нетры. Не спрабуйце нікому навязваць сваё меркаванне: гэтым вы толькі адштурхняце ад сябе адданых вам людзей. У пачатку тыдня вашы смелыя распрацоўкі і новыя ідэі будуць адзначаныя начальствам, і за гэтым можа паследаваць павышэнне па службе.

ШАЛІ. Добра было б павучыцца самадысцыпліне. Вы паспяхова можаце аказваць асабісты ўплыў, але не заўсёды той, які трэба было б. У панядзелак мэтай вашых намаганняў павінны стаць дзелавыя праекты, даручэнні і кароткія паездкі. У чацвер спрыяльна пачаць працу над сабой: падумайце, ці ўсё вы правільна робіце, ці да тых мэт імкняцеся. У пятніцу ні ў якім разе не згаджайцеся на авантурныя прапановы.

СКАРПІЁН. Паспяховасць дзеянняў наўпрост залежыць ад таго, наколькі дбайна прадуманая іх паслядоўнасць. Жыццярадаснасць і аптымізм будуць прыцягваць людзей і спрыяць росту вашай папулярнасці. У пятніцу або суботу лёс можа падарыць шанц, які варта выкарыстаць, каб умацаваць свае пазіцыі не толькі ў матэрыяльным, але і ў духоўным плане. Прыслухайцеся да голасу сваёй інтуіцыі — ён падкажа дакладнае рашэнне.

СТРАЛЕЦ. У панядзелак пажадана не пачынаць новыя справы, лепш завяршыць тое, што вы адклалі ў доўгую скрыню. Тыдзень насычаны падзеямі, актыўнасцю ў сферы, звязанай з прафесійнай дзейнасцю. Пажадана са сваімі праблемамі спраўляцца ўласнымі сіламі, бо сябры і блізкія наўрад ці змогуць чым-небудзь дапамагчы. Вы адчуеце, што неабходныя начальству і калегам па працы, але ёсць небяспека ўзнікнення ілюзій і зорнай хваробы. Так што не паддавайцеся на ліслівасць, не ўсыпляйце сябе дыфірамбамі навакольных. Вашы дасягненні патрабуюць пацвярджэння практыкай, і гэтая магчымасць прадставіцца.

КАЗЯРОГ. Нешта вы занадта спяшаецеся! Жыць трэба крыху павольней, інакш у спешцы можна наламаць шмат дроў. Эмоцыі ў асобныя хвіліны могуць біць цераз край. Настойлівасць і ўпэўненасць у сабе дазволяць зразумець і адчуць нават самыя нязначныя змены вакол вас. У чацвер будзьце больш асцярожнымі, бо вам можа перашкодзіць павышаная канфліктнасць і раздражняльнасць з-за дробязяў. Гэта можа выклікаць праблемы на працы і жаданне рэзка бразнуць дзвярамі, нягледзячы ні на якія страты. Паспрабуйце спыніць гэтыя разбуральныя эмоцыі.

ВАДАЛЕЙ. Пачатак тыдня можа быць вельмі напружаным, таму запасьцеся цярпеннем і не рабіце ніякіх рашучых крокаў. Серада — спрыяльны час для рашэння як асабістых, так і службовых спраў. Вялікі шанц знайсці сродкі для рэалізацыі сваіх ідэй. Вы будзеце адчуваць падтрымку навакольных у сваіх распачынаннях. Верагодныя пазітыўныя змены на працы. Паспрабуйце стаць цікавым і абаяльным суразмоўцам для кожнага, з кім вам давядзецца размаўляць.

РЫБЫ. Адчуеце прыліў сіл, аднак спакушацца сваімі магчымасцямі не варта. Даверце частку спраў надзейным партнёрам, за сабой жа пакіньце самае галоўнае. Паспрабуйце абяцаць толькі тое, што сапраўды зможаце выканаць. Калі спатрэбіцца, можаце звярнуцца па дапамогу да сяброў.

ПАРУЛІЎ ПАД ГРАДУСАМ...

П'яны кіроўца, у крыві якога было выяўлена 2,95 праміле алкаголю, збіў у Мінску пешахода, які ў выніку наезду загінуў.

Паводле звестак аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, здарылася гэта днём на вуліцы Казінца, насупраць прыпынку грамадскага транспарту «Ручай». 57-гадовы мужчына пераходзіў праезную частку па нерэгулюемым пешаходным пераходзе і трапіў пад колы аўтамабіля «Пежо 405», кіраваў якім у стане моцнага алкагольнага ап'янення 28-гадовы мужчына.

Ігар ГРЫШЫН.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

МЕНЮ ЗДАРОЎЯ

Лавіся, рыбка!

Валасы сталі цьмянымі, пазногці ломкімі, скура лушчыцца? Усіх гэтых праблем можна пазбегнуць, калі есці як мага больш рыбы і морапрадуктаў.

Пры гэтым вы яшчэ пазбавіцеся ад стрэсу, цалкам зможаце кампенсаваць недахоп у арганізме заспакаяльнага магнію і палепшыць настрой без усякіх таблетак-антыдэпрэсантаў. Дары мора дазволяць да таго ж добра выглядаць, цудоўна сябе адчуваць, а вось лішніх калорый зусім не прыбавяць.

Царская рыба — селядзец. Адна з самых тлустых рыб, аднак баяцца гэтага не трэба па дзвюх прычынах. Па-першае, нават у самым тлустым селядцы змяшчаецца намнога менш калорый, чым у поснай карэйцы. Па-другое, у селядцы хаваецца вялікая колькасць тлустых кіслот амега-3, якія абараняюць нас ад старэння і сур'ёзных захворванняў сэрца і сасудаў. Гэтыя кіслоты павінны абавязкова прысутнічаць у ежы чалавека, які сочыць за сваім здароўем. Есці селядзец пажадана хоць бы раз на тыдзень. Чым ён таўсцейшы, тым больш у ім карысных кіслот. Вось толькі набываць селядзец у запас у вакуумнай упакоўцы не варта, у ёй рыба хутка губляе ўсю сваю карысць.

Вытанчаныя крэветкі. З іх можна гатаваць смачныя салаты з зяленівам, прыпраўленыя рознымі соусамі ці лімонным сокам, працёртыя супы. Гэтыя ракападобныя — каштоўная крыніца бялкоў і мінералаў. Ёду ў крэветачным мясе амаль у сто разоў больш, чым у ялавічыне. Крэветкі ўмацоўваюць сардэчна-сасудзістую сістэму, паніжаюць рызыку развіцця інфаркту і змяшчаюць максімум антыаксідантаў — рэчываў, якія дапамагаюць захаваць маладосць.

Рыба чырвоная. Сёмгу і фарэль трэба як мага менш тэрмічна апрацоўваць. Менавіта таму ў Скандынавіі, дзе добра разбіраюцца ў рыбе, часцей за ўсё яе гатуюць на пары або запякаюць, прычым не больш чым 10 хвілін.Так лепш захоўваецца першапачатковы смак рыбы, а таксама вітаміны (напрыклад А, адказны за стан скуры) рэчывы, якія здымаюць запаленчыя працэсы ў арганізме.

РАІМ ПРЫГАТАВАЦЬ

Ролы па-нашаму

З бульбы прыгатуйце пюрэ, дадайце гарачае малако, астудзіце. Адвараную агародніну нарэжце тонкімі брусочкамі. На падрыхтаваны бамбукавы дыванок разлажыце раўнамерным слоем пюрэ, зверху агародніну і парэзанае варанае яйка, усё паліце тонай палоскай маянэзу ці гарчычнага соусу, дадайце палоску селядца. Пры дапамозе дыванка скруціце, як сушы, нарэжце. Зверху пакладзіце кавалкі селядца і цыбулю, абпырскайце вінным воцатам. Упрыгожце галінкамі пятрушкі ці кропу. Не стаўце страву ў халадзільнік, бо цёплае пюрэ смачнейшае, і смак ролаў раскрыецца лепш.

-2708-

ПАДКАЗКІ ДАСВЕДЧАНЫХ

Лакавыя сакрэты

Сёння, для таго каб захаваць прычоску, не абавязкова накручваць валасы на бігудзі і змочваць іх півам ці цукровым сіропам, як гэта рабілі нашы мамы і бабулі.

Можна проста купіць пенку, мус ці гель для ўкладкі валасоў, аднак лідарам сярод падобных сродкаў застаецца лак. Тым не менш, некаторыя жанчыны адносяцца да яго з недаверам. Лічаць, што ён склейвае валасы, і яны хутка забруджваюцца. Насамрэч, гэта памылковая думка.

ШТО МОГУЦЬ ЛАКІ?

Сучасныя лакі не толькі надоўга захоўваюць прычоску, але і ўмацоўваюць структуру валасоў, дзякуючы вітамінам і амінакіслотам засцерагаюць ад УФ-промняў і іншых шкодных фактараў наваколля, надаюць валасам рознае адценне... Ёсць лакі, якія змяшчаюць гліцэрыну, бетаін, пантэнол, бензафенон. Гліцэрына захоўвае вільгаць, такую неабходную для валасоў, бетаін надае ім здаровы прыгожы бляск, пантэнол сілкуе валасы, а бензафенон абараняе ад шкоднага ўздзеяння. З'явіліся лакі, у склад якіх уваходзяць лекавыя расліны. Яны робяць нават самыя непаслухмяныя кучары і локаны гібкімі і мяккімі, як шоўк. У склад лакаў могуць уваходзіць спецыяльныя фарбы для надання валасам асаблівага адцення. Некаторыя лакі ўтвараюць на валасах тонкую плёнку, і яна выдатна захоўвае прычоску нават у дажджлівае надвор'е.

Які ж лак выбраць? Адказ на гэтае пытанне просты: уважліва чытайце этыкетку. Першая і галоўная ўмова: у склад лакаў не павінен уваходзіць спірт. Ён мяняе структуру валасоў, можа выклікаць раздражненне скуры галавы, алергічныя рэакцыі.

Лакі бываюць рознай фіксацыі: слабай, сярэдняй, моцнай і звышмоцнай. Сіла фіксацыі залежыць ад канцэнтрацыі палімераў: чым яна вышэйшая, тым даўжэй захоўваецца прычоска. Розная фіксацыя выкарыстоўваецца для розных тыпаў валасоў. Напрыклад, мяккім тонкім валасам дастаткова лаку слабай фіксацыі, а вось для жорсткіх непаслухмяных валасоў прыдатны толькі звышмоцны лак. Каб лак роўна клаўся на валасы, распыляць яго трэба на адлегласці прыкладна 15—20 см.

ДОБРЫ ЛАК...

Касметолагі пратэставалі лакі для валасоў і вызначылі пяць прыкмет добрага лаку:

- ён не склейвае валасы;
- лёгка распыляецца;
- не мае паху;
- не пакідае белых «слядоў» пасля расчэсвання;
- на балоне ёсць этыкетка, якая змяшчае максімум інфармацыі пра гэты прадукт (састаў, тэрмін захоўвання, рэкамендацыі па выкарыстанні).

...І ДРЭННЫ ЛАК

У яго рэзкі пах, прычоска трымаецца нядоўга, валасы выглядаюць брудныміі, іх цяжка расчасаць, лак дрэнна змываецца.

УСЁ НАТУРАЛЬНАЕ!

